Валерый Тухта

# Нататкі з краязнаўчага вопыту



*Валерый Тухта*

# *Нататкі з краязнаўчага сшытка*

Мінск
«Медысонт»
2013

УДК 908(476.5)
ББК 26.89(4Беи)
Т91

**Тухта В. Ул.**

Т91 Нататкі з краязнаўчага сшытка / Валерый Тухта. — Мінск : Медысонт, 2013. — 120 с.

ISBN 978-985-6982-73-9.

У кнігу ўвайшлі розныя па тэматыцы краязнаўчыя матэрыялы, напісаныя на аснове ўласных палявых даследаванняў, літаратурных і архіўных крыніц, а таксама ўспамінаў людзей, з якімі даводзілася сустракацца аўтару падчас вандровак.

Адрасуецца ўсім, каму неабыякава гісторыя свайго краю.

**УДК 908(476.5)**
**ББК 26.89(4Беи)**

**ISBN 978-985-6982-73-9**

© Тухта В. Ул., 2013
© Афармленне. ТАА «Медысонт», 2013

# Ад аўтара

Шмат кіламетраў прайшоў па сцежках і дарогах роднага краю. Вывучаў, даследаваў навакольныя мясціны. Адкрываў для сябе, сяброў і вучняў, новыя, нязведаныя, а збольшага забытыя за даўнасцю часу, старонкі мінулага. А колькі было пазнавальных сустрэч з цікавымі людзьмі, носьбітамі народных традыцый і звычаяў, знаўцамі гісторыі сваёй мясцовасці. Многія з іх, на жаль, адышлі ў лепшы свет, пакінуўшы аб сабе напамін радкамі занатаванымі ў маім краязнаўчым сшытку.

Сабраныя пад адной вокладкай розныя па тэматыцы краязнаўчыя матэрыялы былі напісаны на аснове ўспамінаў людзей з якімі даводзілася весці гутаркі, літаратурных і архіўных крыніц, уласных палявых даследаванняў. Зробленыя, дзе на скорую руку, дзе больш грунтоўна, тыя запісы ляглі ў аснову невялікіх нататкаў.

Разам са мной у дарогу па даследаванню мінуўшчыны неаднаразова выпраўляліся мае маленькія памочнікі, сябры краязнаўчага гуртка «Нашчадкі» Велеўшчынскай базавай і Слабадской сярэдняй школы. Менавіта дзякуючы ім, хлопчыкам і дзяўчынкам, якім падабаецца займацца вывучэннем гісторыі свайго краю, знаходжу сілы і натхненне на працягу больш дзесяці гадоў адкрываць для будучых пакаленняў невядомыя старонкі з гісторыі Лепельшчыны. Спадзяюся, што багатая гісторыя краю не будзе забыта нашчадкамі.

# *Вандроўкі па родным краі*

*Толькі раніцай сонейка ўстане,*
*Зазбіраем мы рэчы свае.*
*Бо дарога ўжо нас чакае,*
*Родны край у падарожжа заве.*

## *Сцежкамі прашчураў*

Нарэшце мы дачакаліся цёплых дзянькоў, калі можна без усялякіх перашкод павандраваць па знакамітых мясцінах нашага раёна. На гэты раз я і мае маленькія вандроўнікі вырашылі наведаць Лепельскае гарадзішча, дзе ў далёкія часы размяшчаўся старажытны Лепель, тагачасны цэнтр эканамічнага і палітычнага жыцця (XIV–XVI стагоддзі). У адзін з выхадных дзён з гарадскога аўтавакзала мы пешшу накіраваліся ў бок вёскі Стары Лепель, дзе па нашых дадзеных размяшчалася гарадзішча. Не было вялікіх праблем пераадолець каля чатырох кіламетраў. Але, каб дабрацца да вострава, дзе размяшчаўся старажытны Лепель, давялося з добры кіламетр ісці па Старому Лепелю. І вось мы стаім перад вострававам. Праўда, гэта ўжо паўвостраў. Бачна, нашыя пазнейшыя прадпрымальныя продкі засыпалі праліў, які аддзяляў востраў ад мацерыка, каб было зручней дабірацца туды і займацца гаспадарчымі справамі. Што мы бачым на месцы самага галоўнага помніка археалогіі нашага раёна? Большая палова яго чарнее свежай раллёй.

Падсілкаваўшыся, мы не сталі марна грэць бакі на сонцы, адразу ўзяліся даследаваць берагі вострава. Вельмі вялікім было здзіўленне, калі ў некалькіх кроках ад месца адпачынку ўбачылі крыж, абнесены драўлянай агароджай. Бачна, даўно ўжо ніхто не наведвае гэтую магілку, бо яна зарасла кустоўем. Побач яшчэ некалькі магільных насыпаў без крыжоў і агароджы. Сышоўшы са стромкага абрыва да возера, знайшлі шмат рэштак чалавечых костак, якія прысыпалі жвірам. Па ўсёй імавернасці, у час дажджу берагі вострава падмываюцца і разбураюцца, а разам з тым агаляюцца магілы нашых продкаў. Расцягнуўшыся ланцужком, рушылі ўглыб вострава па ўзаранаму полю, падбіраючы больш-менш цікавыя рэшткі керамікі. На паверхні іх тут шмат. Узялі з сабой невялікія фрагменты кафлі з карункамі. Знайшлі дзве прасліцы рознай формы. У цэнтры вострава знаходзяцца яшчэ адны могілкі. Па ўсім бачна — сучасныя. Апошняе пахаванне датуецца 1998 годам. Але ёсць там і каменны крыж XIV–XVI стагоддзяў, што дазваляе меркаваць аб старажытным паходжанні могілак. У самым канцы вострава, на ўзгорку правільнай акруглай формы — зноў могілкі, таксама сучасныя. Аблазіўшы ўсе кусты ўздоўж берага вострава і не знайшоўшы больш нічога цікавага, вырашаем пакінуць гістарычнае месца. Вяртаючыся дахаты, юныя краязнаўцы хваліліся адзін аднаму сваімі знаходкамі і марылі аб наступных даследчых падарожжах.

***ліпень 2000 г.***

# Вандроўка ўздоўж возера Окана

Празвінеў першы званок, і школы зноў запоўніліся гомам бесклапотнай малечы. Кожны імкнецца падзяліцца ўражаннямі, набытымі за час летніх канікулаў. Ёсць што расказаць і сябрам нашага краязнаўчага гуртка Дзіму і Вадзіму Гацурам, Сашу і Валодзю Котавым: незабыўныя ўспаміны засталіся ў хлопцаў пасля экспедыцыі, мэтай якой былі запіс і вывучэнне

легенд, паданняў аб паходжанні назваў вёсак, пошук помнікаў археалогіі. На гэты раз аб'ектам сваіх даследаванняў мы абралі вёскі Селішча і Окана. Маршрут наш ляжаў праз Гарадзец. Яшчэ на падыходзе да вёскі мы ўбачылі гарэльнік, на якім паміж абпаленых дрэў сіратліва чарнелі прыкапаныя камяні. Пры больш дасканалым аглядзе мясцовасці высветлілася, што гэта надмагільныя пліты з выбітымі на іх крыжыкамі. Дзе-нідзе былі і асобныя каменныя крыжы. Такія вось помнікі ставілі нашыя продкі на магілах нябожчыкаў у XI–XIII стагоддзях. Падчас абеду дабраліся да Селішча. Першы, каго мы там сустрэлі, быў Павел Яфімавіч Жарнасек. Цікавімся, ці ёсць тут якія-небудзь пахаванні, пагоркі з цікавымі назвамі. Вось вам і пахаванне — валатоўка, — паказвае дзядзька на пагорак, дзе ляжалі нашы заплечнікі.

— Адкуль вы ведаеце, што гэта валатоўка? — пытаемся, — Яна ж зусім не падобная на курган. — Гэтую валатоўку я ведаў, калі быў яшчэ малы, — узгадвае селішчанін, — Тады, у вайну, немцы капалі траншэю на гэтым пагорку і дасталі два чарапы.

За метраў пяцьсот ад першага насыпу Павел Яфімавіч паказвае яшчэ адну валатоўку, пашкоджаную пракладзенай побач палявой дарогай.

Пра паходжанне назвы вёскі мясцовыя жыхары нічога не ведаюць. Але селішчамі раней называлі неўмацаваныя пасяленні сярэдзіны першага тысячагоддзя. Несумненна, што менавіта ад гэтага і пайшла назва вёскі.

На начлег спыніліся ля Окана, на беразе возера з аднайменнай назвай. Набіраючы са студні ваду, пачулі ад вяскоўцаў паданне пра назву возера. Даўным-даўно было гэта, калі першыя людзі пачалі засяляць прасторы Беларусі. У тыя старажытныя часы яна была ўся пакрыта непраходнымі лясамі і балотамі, дзе вадзілася шмат драпежных жывёл, што было вельмі небяспечна для першапраходцаў. Бачна, не ад добрага жыцця яны шукалі сабе новую радзіму, рызыкуючы сабой і сваімі сем'ямі. Адно такое племя, пераадольваючы ўсялякія перашкоды, з'явілася

ў нашых лясістых мясцінах. Частка людзей рассялілася ўздоўж рэк і вакол азёр. Астатнія вандроўнікі рушылі далей у пошуках лепшых зямель. Дзень і ноч прабіраліся яны скрозь непраходныя пушчы. І чым далей, тым непраходней рабіліся лясы, а пад нагамі мацней гайдалася багна, гатовая раскрыць сваю пашчу прама пад нагамі перасяленцаў. Далей ісці было небяспечна, а вяртацца назад не хапала моцы. Так і засталіся людзі жыць у непраходным гушчары лясоў і сярод тванных балот. Неяк прывыклі да гнілых мясцін, але чарговае пахаладанне на Зямлі вымусіла навасёлаў пакінуць свае паселішчы.

Прайшло шмат часу. І ўжо тым шляхам ішлі нашчадкі тых далёкіх прашчураў. Цяпер не галеча штурхала людзей у балоты, а кліч продкаў. Як птушка вяртаецца ў сваё гняздо, так і чалавек не забываецца пра радзіму.

Стомленыя шматдзённай хадой, абарваныя і галодныя, стаялі людзі на ўскрайку непраходнага балота, пасярэдзіне якога сінела акно. Далей ісці не было куды — гэта была іх радзіма. Уладкаваліся тут хадакі на начлег. Калі абудзіліся пасля працяглага сну, мясцовасць не пазналі. Там, дзе было балотнае акно, разлілося прыгожае возера, вакол якога раскінуліся ўрадлівыя землі.

Такім чынам Бог аддзячыў людзям за павагу да памяці продкаў! З тае пары возера носіць назву Окана! Назвалі людзі так і сваё паселішча. Вёска Окана — даволі стары населены пункт. Вядома, што першыя людзі тут сяліліся ўжо ў III–II стагоддзях да новай эры.

З першымі промнямі сонца пачынаем збірацца ў дарогу: наступіў другі дзень нашай экспедыцыі. Пераходзім праз Верабскі канал, які з'яўляецца часткай Бярэзінскай воднай сістэмы. Месцамі з вады выступаюць рэшткі зрубаў XVIII стагоддзя, якімі былі абкладзены берагі. Бадзёра пераадольваем апошнія кіламетры маршруту, быццам і не было за плячамі двух дзён, праведзеных у дарозе.

***кастрычнік 2000 г.***

# Складаем тапанімічны слоўнік краю

Восень сёлета выдалася даволі цёплай. Але цяплынь гэтая падманлівая. У хуткім часе з неба замест цёплага дожджыка, магчыма, пойдзе снег. І дабрацца да аддаленых маленькіх вёсачак будзе даволі складана. Таму вырашыў цяпер, пакуль дарогі не заснежаны, наведаць некалькі такіх населеных пунктаў. Каб не было сумна, узяў у спадарожнікі Дзімку і Вадзімку — двух малых, якія вельмі любяць вандраваць. Давялося крыху паблукаць па лесе, пакуль выйшлі да нейкай вёскі. На карце гэта Калінаўка, але людзі карыстаюцца іншай назвай.

Жыў тут некалі пан па прозвішчу Рэўт, трымаў гаспадарку. Наўкола цягнуліся непраходныя лясы, сяліба ж размяшчалася на полі. Вось і называлі людзі гэтае месца Рэўтполлем, гэта значыць, поле Рэўта. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года Рэўтполле перайменавалі ў Калінаўку. Але новая назва не прыжылася.

Бачна, у той час было занадта модна надаваць новыя найменні вёскам. Красаўшчына (у пасведчаннях аб нараджэнні жыхароў гэтай вёскі значылася Красашчына і Карсашчына) стала Шчаслівым Жыццём. Цяпер тут няма ніводнага жыхара: старыя памерлі, забраўшы з сабой у магілу гісторыю вёскі, маладыя раз'ехаліся па свеце шукаць сапраўднае шчаслівае жыццё. Не падабалася ім перспектыва цяжкой працы на родных палетках, у глушмені. Але гэта цяпер вакол глухія мясціны. Раней жа вёскі туліліся адна да другой. Побач з Рэўтполлем было Вобалачча, паміж Красашчынай і Красналучкай—Доўгая Лужа. Ідзём баравым лесам. Справа застаюцца Валатоўкі. Іх шмат. Гэта яшчэ адзін доказ таго, што ў старыя часіны тут кіпела жыццё. Неўзабаве дарога выбягае з лесу, і перад вачыма паўстаюць гаспадарчыя пабудовы Весялова. Вёска нібыта спіць: ніводнай душы на вуліцы. Толькі

ў самым канцы паселішча сустракаем дзядзьку, які паказвае нам далейшы шлях.

Адразу за Весяловым пачынаецца вёска Стайск. Туды і кіруемся. Жывуць у Стайску 22 чалавекі, усе пенсіянеры. Пра гэта распавядае Іван Фаміч Славінскі. Ён жа расказвае гісторыю Стайска і Весялова, якая пачынаецца з 1913 года, калі валосавіцкі пан запрасіў жыць на свае землі палякаў. Бацькі Івана Фаміча нарадзіліся аж пад самай Варшавай. Чаму пан паклікаў менавіта палякаў, аднаму Богу цяпер вядома. Як бы там ні было, а першым тутэйшым пасяленцам давялося пачынаць з нуля. Адно добра, што пан зямлі выдзеліў уволю. Але зямля тая спрэс складалася з лясоў і няўдобіц.

Можа б і не здолелі палякі вытрымаць тутэйшага ладу жыцця, каб не жылі разам, адной грамадой. Не забываліся яны і адкуль прыйшлі. У Весялове была адкрыта польская школа, у якой дзеткам прывівалі любоў да роднай мовы і культуры. Усе гаспадарчыя клопаты вырашаліся ў сваім—польскім сельсавеце. Праўда, тая самастойнасць не падабалася тагачасным уладам. Спачатку быў скасаваны польскі сельсавет. У 1936 годзе зачынілі і польскую школу. Падзякаваўшы дзядзьку Івану за цікавы аповяд, працягваем сваё падарожжа. Вёска Іван-Бор прытулілася нешматлікімі пабудовамі да лесу. Жывуць цяпер у ёй два чалавекі. У астатніх некалькіх хацінах гуляе вецер. Іван-Бор, як і Рэўтполле з Красашчынай, атрымаў было іншую назву — Чырвоны Кастрычнік. Але не прыжылася і яна.

Пройдзе некалькі гадоў, і пакінуць гэты свет жыхары ўзгаданых вёсачак. Толькі парослыя быльнікам і кустоўем курганы ад хат будуць нагадваць, што калісьці ў гэтых мясцінах жылі людзі. Добра, што хоць застануцца ў памяці людзей старыя назвы невялічкіх паселішчаў. А гэта значыць, што ўспаміны аб іх будуць жыць доўга. Не пра Калінаўку, Шчаслівае Жыццё, Чырвоны Кастрычнік, а пра Рэўтполле, Красашчыну (Карсашчыну), Іван-Бор...

***30 студзеня 2001 г.***

# Пра танк і іншыя знаходкі

Лета — пара масавых адпачынкаў і сезон падарожжаў. Вось і мы адправілся ў чарговую вандроўку-экспедыцыю, прымеркаваную да дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Даволі часта даводзілася чуць ад жыхароў вёскі розныя гісторыі, звязаныя з мінулай вайной. У старажылаў яшчэ ў памяці месцы партызанскіх пахаванняў, якіх даволі шмат было раскідана па лесе. Дзесьці ў 1960-70-х гадах магілы былі знесены і ніякіх слядоў не засталося, толькі ўзялі крыху зямлі, каб насыпаць ля помніка ў Слабадзе. Грыбнікі- ягаднікі расказвалі пра партызанскія зямлянкі. А яшчэ, каб прыдаць сваім словам больш увагі, мясцовыя фантазёры паведамлялі пра танк. Нібыта гэтая шматтонная махіна і цяпер знаходзіцца ў адным з балот. Загадзя мушу расчараваць: гісторыя з танкам усяго толькі прыгожы міф, у які так хочацца верыць. Таму вырашылі самі пабачыць, дзе жылі і адкуль адпраўляліся на баявыя заданні народныя мсціўцы.



*Партызанская лазня. Урочышча Сываратка*

На веласіпедах едзем па добра накатанай лясной дарозе, якая праз два дзясяткі кіламетраў спатыкаецца аб змрочны непраходны гушчар ельніку. Менавіта ў гэтым месцы ў час Вялікай Айчыннай вайны размяшчаўся адзін з партызанскіх атрадаў. На месцы колішніх зямлянак засталіся толькі яміны, парослыя дрэвамі, у некаторых яшчэ захаваліся рэшткі печак-буржуек. У адной такой яміне знаходзім цікавае збудаванне — да металічных труб прымацаваны шырокі абруч, у якім высіцца груда камення. Верагодна, у гэтай зямлянцы была партызанская лазня, а збудаванне — не што іншае, як печ.

Праз некалькі дзён працягваем даследаванні. Пешшу накіроўваемся ў Верабкі.

Над гэтай вёскай напрыканцы вайны адбылася паветраная дуэль паміж савецкім і нямецкім лётчыкамі. Той паветраны бой быў апошнім для нямецкага экіпажа. Вялізная варонка і аплаўленыя рэшткі металу ў балоце — гэта ўсё, што, засталося ад фашысцкага самалёта. Непадалёк рэшткі савецкай вінтакрылай машыны, якая па тэхнічных прычынах была вымушана сесці на дрыгву. Ваенныя так і не здолелі вызваліць машыну з багны, толькі абясшкодзілі боепрыпасы. Затое мясцовы люд даволі доўга карыстаўся гаспадарчымі вырабамі з таго самалёта, ад якога цяпер засталося некалькі абломкаў іржавага металу. Крыху паблукаўшы па балоце, знаходзім рэшткі лятальных апаратаў. Хлопцы, канечне, хацелі пабачыць сапраўдныя самалёты. Але што зробіш — час зрабіў сваю справу.

Колькі яшчэ гісторый з далёкага і блізкага мінулага нашага краю перадаецца з вуснаў у вусны. І адна з іх — пра сапраўдны танк.

***жнівень 2001 г.***

## І Рабінавы камень за вёскай...

Кожны раз, адпраўляючыся ў вандроўку, імкнешся як мага болей даведацца цікавага аб мінулым свайго краю. У чар-

говае падарожжа мы з дзецьмі Сяргеем і Дзімам Падабедамі, Дзімам Гацурам, адправіліся на веласіпедах.

Раніцай, калі барвовы сонечны дыск толькі-толькі паказаўся на гарызонце, рушылі ў дарогу. Бойкая жвіроўка яшчэ была скавана невялікім начным марозікам. У хуткім часе стаялі з веласіпедамі ля мастка праз Эсу. Дзе-нідзе ў пойме ракі ззялі лужыны, асветленыя першымі промнямі сонца — сведкі нядаўняй паводкі.

Паспяхова пераадолелі прыродныя перашкоды і выбраліся на лясную дарогу, якая прывяла ў Валатоўкі. Зусім нядаўна гэтую вёску пакінулі апошнія жыхаркі — дзве бабулі. Вырашылі прайсціся, паглядзець, як жылі і чым займаліся людзі ў гэтай лясной глушмені. Распятымі дзвярыма сустрэла нас самая старая, але яшчэ даволі моцная будыніна. Такія хаты будавалі яшчэ ў канцы XIX стагоддзя. Гэта так званае трохкамернае жытло: пасярэдзіне сенцы, па адзін бок — жылая палова, па другі — памяшканне для гаспадарчых патрэбаў ці варыўня.



*Будынак спіртзавода пач. XX ст. у в. Двор-Таронкавічы*

Усяго ў Валатоўках захавалася сем хацін і толькі адна была зачынена на замок. На астатніх запоры ўвогуле адсутнічалі ці былі па-варварску вырваны. У хатах усё перавернута, нібыта штосьці шукалі.

Праз некалькі кіламетраў за Валатоўкамі перасякаем Байну, якая сваімі водамі сілкуе Эсу. Пакідаем убаку Рэўтполле і зноў хаваемся ў лясным гушчары.

Спыняемся ў вёсцы Красналучка, хочам даведацца пра гісторыю паселішча. На жаль, памерлі старажылы Красналучкі, забраўшы з сабой звесткі аб мінулым паселішча.

Далей праз Новыя Валосавічы накіроўваемся да Таронкавіч. З невялікімі дапаўненнямі гэтую назву носяць тры паселішчы — Малыя Таронкавічы, Двор-Таронка-вічы і Вялікія Таронкавічы. Скаціў-шыся на веласіпедах са стромкага схілу, аказваемся ў вёсцы Двор-Таронкавічы. Тут месціцца будынак канца XIX — пачатку XX стогоддзя — спіртзавод. Да нядаўняга часу ў гэтым помніку гісторыі знаходзіліся складскія памяшканні, таму добра захаваліся не толькі сцены, але і драўляныя перакрыцці даху. Падумалася, што пры пэўным укладанні грашовых сродкаў можна аднавіць будынак.

Ля мясцовага магазіна пазнаёміліся з Яўгеніяй Рыгораўнай Сініца, жанчынай сталага веку, якая не застаецца абыякавай да мінулага. Родам яна з Каменя, але ведае гісторыю мясцін, куды закінуў лёс, не горш за мясцовых. Па яе словах, спіртзавод належаў Кашко ці Буевічу. Зачынілі прадпрыемства ў 1917 годзе, калі ўсталявалася савецкая ўлада, а гатовую прадукцыю вылілі ў размешчаную непадалёк сажалку. Дык мясцовы люд чэрпаў спірт з вадаёма вёдрамі.

З вялікай ахвотай Яўгенія Рыгораўна згадзілася паказаць Рабінавы камень у лесе за вёскай. Гэта валун вышынёй каля трох метраў і даўжынёй каля пяці. Як сцвярджаюць вяскоўцы, у вайну камень намнога больш выступаў над зямлёй, што пад ім маглі схавацца трое запрэжаных у калёсы коней. Відаць, не абміналі ўвагай валун і нашы далёкія продкі ў дахрысціянскія

часы. Сюды яны маглі прыходзіць маліцца і прыносіць ахвярапрынашэнні. Праз усю паверхню камня праходзіць равок. Што гэта, рукатворны жолаб, па якому сцякала кроў прынесенай у ахвяру жывёлы, ці проста своеасаблівая форма валуна, сцвярджаць не бяруся. Компас паказаў напрамак паглыблення — дакладна з поўначы на поўдзень.

Падзякаваўшы Яўгеніі Рыгораўне за цікавую экскурсію, адпраўляемся ў зваротную дарогу. Наперадзе ў нас яшчэ два дзясяткі кіламетраў, але дарога дадому заўсёды здаецца не такой доўгай і далёкай.

***сакавік 2002 г.***

## Авеяны легендамі край

Я і двое маіх сяброў-краязнаўцаў — Васіль Шкіндзер і Алег Шушкевіч — вырашылі пазнаёміцца з краявідамі азёрнай Сушаншчыны, падумаўшы, што не магло таго быць, каб у далёкія часіны людзі не насялялі гэтыя прыдатныя для жыцця землі на берагах шматлікіх азёр. Ніякіх звестак пра наяўнасць там помнікаў далёкай мінуўшчыны ў навуковай і даведачнай літаратуры няма. Таму на Сушаншчыне яшчэ давядзецца плённа папрацаваць краязнаўцам і археолагам. Наш шлях ляжаў у Заслаўкі да маіх даўніх знаёмых Валянціны Аляксееўны і Генадзя Сцяпанавіча Шатыронкаў. Менавіта легенда, якую пачуў падчас тэлефоннай размовы ад дзядзькі Генадзя, і паклікала ў дарогу. Не маглі абысці ўвагай Сушу, дзе калісьці былі абарончыя збудаванні паміж двух азёр, злучаных рукатворнымі каналамі. На штучным востраве ў 1567 годзе рускія войскі Івана Грознага ўзвялі крэпасць «Кап'ё». Праіснавала фартэцыя да 1579 года, калі была зруйнавана ваярамі Вялікага Княства Літоўскага. На тым месцы з цягам часу пачалі сяліцца людзі. Цяпер у падмурках некаторых хат знаходзяцца камяні з крэпасці. На агародах вяскоўцы да гэтай пары знаходзяць каменныя ядры. Быў выпадак, калі мясцовы жыхар, капаючы гліну, знайшоў касцяк чалавека з жалезнай пікай. Распавяда-

юць людзі і пра баржу, якая перавозіла да крэпасці камяні і затанула ў адным з азёр. Завіталі ў невялікую вёску Загорцы, дзе пачулі паданне пра пана і яго скарб. Жыў гэты заможны чалавек у маёнтку Рагоўшчына. Пасля рэвалюцыі ён быў вымушаны прыхаваць багацці і пакінуць родныя мясціны. Тром жа сынам загадаў шукаць скарб на месцы, адкуль бачны пяць ці шэсць азёр. З тае пары не адзін мясцовы жыхар спрабаваў такім чынам разбагацець. Але ці краявіды змяніліся, ці пан няправільныя каардынаты даў, схованку так і не знайшлі. А другой палове дня мы нарэшце трапілі ў Заслаўкі. Пасля гасціннага пачастунку цёткі Валі адпраўляемся на авеяную легендай гару. Праваднiком узяўся быць Генадзь Сцяпанавіч. Даўні аповяд пра ўзвышша Гарадзішча дзядзька ведае ад мясцовага доўгажыхара.

Калісьці па цэнтру гары стаяла царква ды правалілася пад зямлю. Засталося невялікае заглыбленне. Яно добра бачна да гэтага часу. Ля падножжа гары ў пажухлай восеньскай траве бачым вяршыні шэрых камянёў. Пры дэталёвым аглядзе плоскіх, апрацаваных чалавекам глыб, надпісаў не знаходзім — за іх Генадзь Сцяпанавіч прымаў няроўнасці на камянёвай паверхні. Аднак, выяўляем толькі адзін добра бачны шасціканцовы крыж. Камяні — не што іншае, як рэшткі сярэднявечнага могільніка. Іх у нашых краях называюць Галодныя Магілы.

На самой гары культурны пласт, па якому можна было б устанавіць археалагічны аб'ект, не выявілі. Аднак, гарадзішча тут магло быць, калі дапусціць, што культурны слой знішчаны гаспадарчай дзейнасцю людзей. Дапушчэнне могуць пацвердзіць знойдзеныя намі два чарапкі керамікі прыкладна XV–XVII стагоддзяў. Культурнага пласта магло зусім не быць, калі гара служыла свяцілішчам — культавым месцам, дзе нашы прашчуры маліліся язычніцкім багам. Аб жыцці на гэтым месцы людзей задоўга да нашай эры пацвярджае не толькі легенда, але і знойдзеная непадалёк каменная сякера з адтулінай, датаваная другім тысячагоддзем да нашай эры.

Зробленае намі адкрыццё дазваляе з упэўненасцю гаварыць пра наяўнасць у раёне сушанскіх азёраў і навакольных вёсак не аднаго археалагічнага помніка.

***студзень 2004 г.***

# У небе і на зямлі

У чарговую экспедыцыю па выяўленню невядомых фактаў Вялікай Айчыннай вайны скіраваліся ў Верабкі. Вырашылі даследаваць месцы падзення нямецкага і савецкага самалётаў летам 1944 года каля вёскі.

У небе над Верабкамі падчас вызвалення Беларусі ад фашыстаў адбыўся паветраны бой. У дуэлі пераможцаў не было. Тады, верныя кожны свайму абавязку, экіпажы пайшлі на таран. Жыхары Верабак бачылі, як нямецкі самалёт, пакідаючы за сабой шлейф густога чорнага дыму, зваліўся ў недалёкае балота. Моцна пашкоджаны савецкі самалёт лётчыкі былі вымушаны пасадзіць на парослае соснамі балота, непадалёк ад нямецкага. Вяскоўцы, якія хутка збегліся на месца катастрофы, убачылі, што нямецкі самалёт знік у вялікай варонцы — пры сутыкненні з зямлёй выбухнуў боекамплект. У некалькіх сотнях метраў ад рэшткаў варожай машыны, на дрыгве стаяў савецкі самалёт. Пасля стала вядома, што лётчыкі засталіся жывыя. Праз колькі дзён вайскоўцы знялі з самалёта зброю, разрадзілі і пакінулі боекамплект. Пасля верабчане з корпуса знялі дзюраль на гаспадарчыя патрэбы. Па Верабках да гэтага часу ходзяць чуткі, што ў кагосьці на гарышчы валяецца хвост самалёта з чырвонымі зоркамі.

Факт паветранага бою над Верабкамі пяць гадоў таму пацвердзілі краязнаўцы. Там, дзе выбухнуў нямецкі самалёт, адкапалі дробныя дэталі. Сярод іх — дзюралевая пласціна з нумарам, якая цяпер захоўваецца ў школе. Не ўсё знялі людзі і з савецкага самалёта — засталіся рама і некаторыя дэталі. Праваднікам у першай экспедыцыі быў ураджэнец Верабак Васіль Хацкевіч. Тады без цяжкасцей адшукалі месцы, дзе



*Ля рэштак савецкага самалёта*

ляжалі рэшткі самалётаў. На гэты раз без пабочнай дапамогі рашылі знайсці іх, за што і паплаціліся. Некалькі гадзін дарэмна круціліся па балоце. З Верабак накіраваліся ў бок вёскі Юшкі. Мінулым летам жыхар вёскі Уладзімір Юшко паказаў захаванне шасці нямецкіх салдат непадалёку ад вёскі. Ужо тады магіла была раскапана. Гэта справа мясцовых падлеткаў, якія з пакалення ў пакаленне шукаюць там нейкія скарбы. Вось і цяпер мы ўбачылі нядаўнія раскопы — вакол ямы валяліся фрагменты чалавечых касцей, кавалкі скураных рамянёў, алюмініевыя гузікі. Склаўшы ў адно месца знаходкі, прысыпалі іх зямлёй. У сляпой нянавісці мы забываем пра маральны бок сваіх вар'яцкіх паводзін. І знявагу да ворага пераносім на сябе. Прага нажывы штурхае капаць і магілу нямецкага салдата, і курган нашага далёкага прашчура. У Юшках сустрака-

ем маладога мужчыну, просім што-небудзь паведаміць пра наяўнасць ля вёскі ваенных захаванняў. Ен раіць звярнуцца да сямідзесяцігадовай суседкі Марыі Міхно. Жанчына распавядае пра адзіночнае захаванне палоннага чырвонаармейца на беразе Эсы. Хавалі яго мясцовыя ў 1941 ці 1942 годзе. Зрабіўшы пэўныя запісы ў інфармацыйны аркуш і адзначыўшы месца захавання, рушым далей. У Слабадзе вырашаем праверыць інфармацыю аб нямецкім захаванні ўзбоч дарогі Чарнаручча — Красналукі. Па крупінках збіраем сведчанні людзей па гэтым факце. Дапамагла былая настаўніца Ларыса Шабунёва. Найбольш поўнымі былі звесткі Ягора Белавусава, які ў час вайны быў хлапчуком.

...Летам 1944 года, калі фашыстаў прагналі, у лесе працягвалі хавацца разрозненыя групы нямецкіх салдат. Адна такая група абстраляла на дарозе савецкую ваенную машыну. Па трывозе быў падняты запасны полк, які стаяў у Слабадзе. Большую частку немцаў злавілі, многія засталіся ляжаць забітымі пры дарозе. Цэлы дзень пякліся на сонцы нябожчыкі. І толькі пасля таго, як ад іх пайшоў смурод, узяліся за рыдлёўкі слабадскія мужыкі. Пахавалі не ў адной магіле. Побач з забітым выкопвалі неглыбокую ямку, скочвалі яго туды і прысыпалі зямлёй.

Ларыса Шабунёва пазнаёміла з ваенным пенсіянерам Леанідам Хадуном. На яго агародзе ў вайну месціўся нямецкі вайсковы склад. Да гэтага часу там трапляюцца знаходкі. Гаспадар «падарыў» нам корпус колішняй мінамётнай міны. А некалькі год таму выкапаў цэлую міну, абясшкоджваць якую потым прыязджалі сапёры.

***ліпень 2005 г.***

## Невядомыя пахаванні

Восенню 2005 года падчас экспедыцыі да невядомых ваенных пахаванняў мы апытвалі старажылаў вёскі Юшкі. Дапамаглі дзеці вайны Марыя Міхно і Уладзімір Юшко. Яны памяталі, як у 1941 годзе на паўднёва-заходняй ускраіне




Юшак хавалі чырвонаармейца, і нават згадзіліся паказаць, дзе была калісьці магіла. Але ніводзін з іх дакладнага месца не памятаў, бо лес вырас, змяніўшы ландшафт, і адшукаць магілу стала немагчыма.

За пошукі ўзяліся «Нашчадкі». Дэталёва праверылі ўсе пагоркі і яміны ля дрэў. На адным ствале згледзелі даволі выразны крыжык *(на здымку паказаны стрэлкай)*, выдрапаны некалі на кары. Праз ваенкамат паведамілі ў 52-гі спецыялізаваны пошукавы батальён аб няўлічаным ваенным пахаванні ля Юшак.

Раскопкі вяліся пад кіраўніцтвам намесніка камандзіра 2-й спецыялізаванай роты лейтэнанта Максіма Бухалы і старшага інструктара Сяргея Лушэчкіна. За пошукамі сачылі вучні Слабадской сярэдняй школы Антон Садоўскі, Арцём Логавін і Аляксандр Пыцько. Эксгумавалі парэшткі аднаго чалавека без асабістых рэчаў. Імя ўстанавіць не ўдалося.

Затым вайскоўцы 52-га пошукавага батальёна працавалі ў Чарнаруччы, знайшлі парэшткі чырвонаармейца. На могілках у Мацюшынай Сцяне паднялі на паверхню яшчэ дваццаць двух абаронцаў Айчыны.

Імёны пахаваных засталіся невядомымі. Аднак, адметна ўжо тое, што 24 салдаты будуць пахаваныя з воінскімі ўшанаваннямі. Яны заслужылі права на памяць нашчадкаў.

***чэрвень 2006 г.***

## Гарадзішча і Цар-дуб

Часам адпраўляемся ў далёкую дарогу за сотні кіламетраў ад роднага дому, у той час, як самае цікавае і новае можа знаходзіцца зусім побач. У адзін з суботніх дзён вучні восьмага-

дзявятага класаў пад кіраўніцтвам намесніка па выхаваўчай рабоце Вольгі Бабаед і педагога-арганізатара Таццяны Дзёмка на школьным аўтобусе скіраваліся пазнаваць наваколлі Лепельшчыны, адкрываць для сябе нязведаныя старонкі краю. Разам з дарослымі накіраваліся ў падарожжа і вучні пачатковых класаў. Трэцякласнік Сяргей Нядбайла, пачуўшы ад старэйшага брата Рамана, што той збіраецца кудысьці ехаць таксама напрасіўся ў дарогу, а каб весялей было, прыхапіў з сабой аднакласніка Мікіту Сівакова.

Першым аб'ектам, які наведалі быў Цар-дуб, што ўжо больш за чатырыста гадоў расце ў вёсцы Тадуліна. Гэта дрэва-волат з'яўляецца помнікам прыроды рэспубліканскага значэння і нанесена на карту «Помнікі прыроды Беларусі». Веліччу дрэва былі ўражаны не толькі вучні, але і настаўнікі. Яно настолькі тоўстае, што абхапіць яго змаглі толькі шэсць хлопцаў старэйшых класаў, узяўшыся за рукі.



*Цар-дуб у в. Тадуліна*

Далей маршрут экскурсіі пралягаў да вёскі Азерцы, дзе паміж двух азёр на высокім стромым пагорку з плоскай паверхняй знаходзіцца помнік археалогіі — гарадзішча днепрадзвінскай культуры першых стагоддзяў нашай эры. Жылі на ім людзі і ў пазнейшыя часы. Пра тое, што гэта помнік археалогіі, які ахоўваецца дзяржавай, сведчыла адпаведная шыльда, устаноўленая ля падножжа гарадзішча. Незадоўга да таго невялікія археалагічныя даследаванні помніка праводзіла аспірантка Інстытута гісторыі Акадэміі Навук Беларусі Зоя Харытановіч. Яна падцвердзіла знаходжанне на гэтым гарадзішчы паселішча балтаў у пачатку нашай эры.

Вяртаючыся дахаты, завіталі ў Вялікі Поўсвіж да краязнаўца Васіля Шкіндзера, падворак сялібы якога нагадвае музей пад адкрытым небам. Васіль рупіцца аб захаванні спадчыны нашых продкаў — сялянскіх прылад побыту, якімі яшчэ паўстагоддзя таму карысталіся людзі. Асабліва зацікавіла сцяна гаспадарчай будыніны, якая па-мастацку з вясковым каларытам выкладзена са старых колаў ад конскіх вазоў, а таксама кампазіцыя з прыроднага каменя, якая нагадвае нейкую фантастычную істоту з беларускай міфалогіі.

Знаёмства з чароўнай прыгажосцю роднага краю не пакінула абыякавым нікога. Да гэтага часу многія з іх не ведалі, што на Лепельшчыне ёсць свае цуды.

***сакавік 2008 г.***

## Аднавілі помнік гісторыі

Па-рознаму бавяць час дзеці ў летніках. З усіх мерапрыемстваў вучням найбольш падабаюцца вандроўкі па навакольных мясцінах. У адну з чарговых яны наведаліся на могілкі ў Рудні, дзе яшчэ раней быў знойдзены каменны крыж, які ледзьве паказваўся з зямлі. З сабой прыхапілі некалькі рыдлёвак, каб адкапаць і паставіць яго на месца. Калі крыж дасталі

з зямлі і пачысціл, то на адным з яго бакоў здолелі прачытаць высечаныя па вертыкалі лічбы «1859».

Укапаўшы крыж вертыкальна ў зямлю і акуль-турыўшы ля яго тэрыторыю, дзеці адправіліся ў зваротную дарогу, упэў-неныя ў тым, што зрабілі карысную справу — аднавілі не проста надмагільны камень, а помнік нашай гісторыі.

***ліпень 2009 г.***



*Каменны крыж у в. Рудня*

# Свядзіцкія курганы

У вёсцы Свядзіца Слабадскога сельсавета на сучасных могілках да сённяшняга дня захавалася больш за дваццаць курганоў — старажытных пахаванняў. У адзін з выхадных дзён мы з вучнямі праводзілі ў гэтым населеным пункце археалагічную разведку. Спачатку распытвалі жыхароў

Свядзіцы. Надзея Міхееўна Шамшур, старэйшая жыхарка вёскі, распавяла пра тое, што курганы засталіся пасля нейкай даўняй вайны. Аднак, гэта толькі прыгожае паданне, насамрэч у курганах да XIII, а месцамі і да XV стагоддзяў хавалі нашых продкаў.

Раней кургаоў было нашмат больш. Іх плошча магла даходзіць да аднаго гектара. Некалькі насыпаў, якія не былі знішчаны, і знаходзіліся па-за межамі цяперашніх могілак, прадпрымальныя вяскоўцы прыстасавалі пад свае гаспадарчыя патрэбы. Прама ў курганах зрабілі сховішчы для сельскагаспадарчай прадукцыі. Частка кургаоў, дзе потым размяшчаўся калгасны сад, была знішчана ў выніку гаспадарчай дзейнасці мясцовага калгаса.

***студзень 2010 г.***



*Курганны у в. Свядзіца*

# Лыжны паход да партызанскай сасны



Надпіс на сасне

У гады Вялікай Айчыннай вайны, з 1942 па 1944 гады, у лесе за вёскай Стайск базіраваліся розныя партызанскія фарміраванні. Надзейна хаваў пад сваімі шатамі векавы бор народных мсціўцаў. Верагодней за ўсё, ужо пасля вайны нехта з партызан на адной з соснаў пакінуў надпіс «Памяць вайны 1943 — 44 гг.». Менавіта да гэтай, можна сказаць, жывой сведкі вайны, скіраваліся ў чарговы паход. Як толькі адступілі лютыя маразы, юныя краязнаўцы на лыжах рушылі ў дарогу. Пераадолеўшы адлегласць у сем кіламетраў ад Велеўшчыны, слабадскія следапыты дасягнулі сваёй мэты. Што адбывалася амаль семдзесят гадоў таму назад у партызанскім лесе і хто мог пакінуць на дрэве аўтограф, сёння можна толькі здагадвацца. Толькі незвычайны помнік, як напамін аб апошняй вайне, яшчэ не адно дзесяцігоддзе будзе вабіць да сябе даследчыкаў тых падзей.



***люты 2012 г.***

*«Нашчадкі» ля партызанскай сасны*

# Дотык да сівой даўніны

*Нас цягне кудысьці ў нязведанае,*
*Завуць да сябе валуны.*
*І сілы даюць нам прадзеды,*
*Каб подых адчуць даўніны.*

## Знаходкі на валосавіцкай зямлі

Апошняя археалагічная экспедыцыя на тэрыторыі нашага раёна працавала ў 1991 годзе. Тады Людмілай Дучыц былі даследаваны старажытныя пахаванні ля вёсак Занькі і Заазер'е. Пасля дзесяцігадовага перапынку на Лепельшчыне зноў аднавіліся археалагічныя работы. Год таму маладым археолагам Андрэем Вайцэховічам былі раскапаны і вывучаны курганы ля вёскі Звязда Пышнянскага сельсавета. Гэтым летам, у другой палове ліпеня, Андрэй прадоўжыў пачатую работу па даследаванні старажытных пахаванняў, на гэты раз ужо ля Валосавіч. Дзейсную дапамогу навукоўцу аказала яго жонка Анюта, якая разам з мужам накіравалася ў экспедыцыю. Непасрэдны ўдзел у раскопках ўзялі неабыякавыя да мінулага свайго краю лепельскія краязнаўцы. Сярод іх Васіль Хацкевіч, Васіль Шкіндзер. Аўтару гэтых радкоў таксама давялося папрацаваць рыдлёўкай.

У першы дзень раскопак для даследавання абралі адзін з земляных насыпаў, абкладзеных камянямі, што знаходзяцца ў саміх Новых Валосавічах. Але нашыя намаганні былі марнымі. У раскапанай магіле нічога не знайшлі, акрамя попелу ад вогнішча,

якое палілі на месцы будучага пахавання. Па ўсёй верагоднасці, косці спарахнелі, што і знаку не засталося. А можа, гэта было тады даволі часта, родзічы насыпалі курган у памяць нябожчыка, склаўшага галаву далёка ад роднай зямлі.

У далейшым было вырашана працягваць даследаванні на курганным могільніку ў лесе за вёскай. Там археолагам на знаходкі шанцавала больш. На другі дзень было раскапана мужчынскае пахаванне XI стагоддзя, знойдзена бронзавая спражка ад папругі і жалезны нож з драўлянай ручкай, якая даволі добра захавалася.

Зрабілі шурфоўку пашкоджаных насыпаў, у адным з якіх знайшлі рэшткі касцяной ручкі з прыгожым арнаментам тонкай ручной работы.

Нягледзячы на даволі каштоўныя знаходкі, Андрэй марыў раскапаць жаночае пахаванне, бо ў такіх насыпах сустракаецца шмат рыштунку, па якому можна з большай верагоднасцю датаваць час вырабу знаходкі і племянную прыналежнасць нябожчыка. У наступным раскапаным кургане якраз і знаходзілася жаночая магіла. На жаль, ад касцей мала чаго засталося, а вось рыштунак захаваўся добра. Гэта рэшткі рытуальнага гаршэчка, які ставілі ў галаве нябожчыка, бронзавыя скроневыя кольцы, пярсцёнкі, а таксама прадметы побыту, зробленыя з жалеза: шыла, серп і невялікі ножык.



*Касцяная ручка «Галава барана»*

Усяго за восем дзён археалагічнай экспедыцыі было раскапана і вывучана пяць курганоў, сабраны даволі багаты матэрыял, які патрабуе далейшай навуковай апрацоўкі. Але ўжо цяпер, на падставе знаходак, можна гаварыць, што могільнік належыў крывічам і датуецца X-XI стагоддзямі.

***жнівень 2002 г.***

# Даследаванне курганоў

У другой палове жніўня закончыўся чарговы палявы сезон, на працягу якога Андрэй Вайцэхові прадоўжыў распачатую два гады таму працу па даследаванні абраду пахавання ў X–XIII стагоддзях. Для гэтай мэты ён абраў курганныя могільнікі каля вёсак Валосавічы і Звязда, дзе ў папярэднія гады праводзіў даследаванні і знайшоў унікальныя рэчы.

У Валосавічах за некалькі дзён работ былі даследаваны тры курганы, у якіх выяўлены жаночыя пахаванні. Асноўную масу прадметаў складаюць упрыгожанні з бронзы: вітыя бранзалеты і пярсцёнкі, бразготкі (пустацелыя шарыкі з кавалачкамі металу, якія засцерагалі ад нячысцікаў), а таксама шкляныя і пацягнутыя пазалотай пацеркі. Знаходкі датуюцца XI стагоддзем і з'яўляюцца этнавызначальнай рысай крывічаў. Асаблівую навуковую цікавасць уяўляў трэці раскапаны курган, дзе было парнае пахаванне мужчыны і жанчыны. Побач з мужчынскім касцяком былі знойдзены тры каваныя жалезныя цвікі з рэшткамі драўніны, што дае падставы гаварыць пра існаванне ў той час дамавін. Цела жанчыны пры пахаванні было загорнута ў тканіну, адбіткі якой захаваліся на знешнім баку бранзалета.

Увогуле валосавіцкая зямля хавае ў сабе шмат неразгаданых таямніц сівой мінуўшчыны. Сама назва вёскі паходзіць ад імя язычніцкага бога Вялеса, ці Волеса, які быў апекуном жывёлагадоўлі і галоўным бажаствам вясковага насельніцтва.

На Звяздоўскім могільніку было раскапана шэсць насыпаў, і ні ў адным пахавальны інвентар не паўтараўся. Напрыклад: у адным з курганоў было пахаванне жанчыны з крывіцкімі ўпрыгожаннямі; у другім знойдзены бронзавы змеегаловы бранзалет, больш характэрны для балцкага насельніцтва. Розніўся і абрад пахавання: у неглыбокіх ямах, у іншых курганах нябожчыкі ляжалі на грунце ці невялікай падсыпцы з

белага рачнога пяску. Паўсюдна пры раскопках траплляліся кавалкі жалеза са шлакам. Мабыць, побач з могілкамі выплаўлялі жалеза.

Кім жа было насельніцтва Звязды па сваёй этнічнай прыналежнасці — балтамі ці славянамі? На жаль, адназначнага адказу і цяпер няма. Землі вакол паселішча маглі быць памежнымі між арэолам рассялення славян і балтаў, якіх усё далей на паўночны захад адцяснялі крывічы-палачане. Нельга выключаць і верагоднасці таго, што адно з балцкіх плямёнаў, якое здаўна жыло тут, не закранула хваля перасялення. Яны мірна суіснавалі з прыйшоўшымі сюды славянамі, аказваючы значны ўплыў на іх культуру і побыт.

***кастрычнік 2003 г.***

## Няспраўджаныя надзеі археолагаў

На працягу трох жнівеньскіх дзён 2004 года археолаг Андрэй Вайцэховіч праводзіў раскопкі каля вёскі Новыя Валосавічы. Было даследавана некалькі пахаванняў на двух курганных могільніках. Знаходак адкапалі няшмат. Гэта расчаравала Андрэя, яго добраахвотных памагатых з Мінска і лепельскіх краязнаўцаў, што бралі ўдзел у даследаваннях.

У першы дзень раскапалі адну валатоўку канца IX — пачатку X стагоддзяў на курганным могільніку-2, які налічвае 25 насыпаў. Адразу пад дзірваном знайшлі абпаленыя косткі і рэшткі рытуальнай пасудзіны. Далейшыя даследаванні пакажуць каму належаць косткі — чалавеку, ці жывёліне.

Заклалі шурфы і на крукавай гары, якая ўяўляе марэнавы ўзгорак з левага боку ад лясной дарогі, што вядзе з Валосавічаў у Рэўтполле. Вяршыня гары — роўная пляцоўка, абнесеная невялікім валам. Мясцовыя людзі распавядаюць пра існаванне тут паселішча Крукава.

У шурфах добра прасочваўся 30–40 сантыметровы культурны пласт чорнай зямлі, насычанай арганічнымі рэчывамі, што

сведчыць аб наяўнасці ўмацаванага паселішча. Знойдзеная кераміка дазваляе аднесці гарадзішча да апошніх стагоддзяў да нашай — першых стагоддзяў нашай эры. У пазнейшы час яно магло выкарыстоўвацца як нейкая культавая пляцоўка — капішча ці свяцілішча. Але для таго, каб Крукава гара падзялілася сваімі таямніцамі, трэба правесці раскопкі.

На другі дзень археолагі перамясціліся на курганны могільнік-1, які налічвае сорак насыпаў. У раскапаным кургане на глыбіні 70 сантыметраў пад слоем попелу знайшлі абпаленыя косткі, кавалкі аплаўленай бронзы, чарапкі ад посуду з арнаментам, жалезны прадмет накшталт пінцэта.

На трэці дзень раскопак нічога значнага не знайшлі. У даследаваным насыпе X стагоддзя таксама знаходзіліся крэміраваныя косткі з абпаленымі жаночымі ўпрыгожваннямі і невялікі жалезны ножык.

У першым і другім выпадках спальванне нябожчыкаў праводзілася на месцы. Пасля чаго насыпаўся курган.

Суцяшалі сябе даследчыкі тым, што даследаванне курганоў з крэмацыяй мае не меншае значэнне для навукі, чым іншых археалагічных аб’ектаў.

***верасень 2004 г.***

# *Разгадка Крукавай гары*

Звычайна з надыходам зімы завяршаецца палявы сезон археалагічных даследаванняў. На вялікі жаль, у гэтым годзе археалагічныя раскопкі на тэрыторыі нашага раёна не праводзіліся.

Археолаг Андрэй Вайцэховіч, які не адзін палявы сезон даследваў на Лепельшчыне пахаванні X-XIII стагоддзяў, быў заняты раскопкамі курганоў у Докшыцкім раёне. Але напрыканцы кастрычніка Андрэй усё ж такі не прамінуў магчымасці наведацца на Лепельшчыну, для таго каб перадаць у краязнаўчы музей матэрыялы раскопак мінулага года, а таксама правесці

разведку па выяўленню новых помнікаў археалогіі. Разам з Вайцэховічам прыехаў Павел Кенько, аспірант інстытута гісторыі Акадэміі Навук Беларусі, які займаецца вывучэннем помнікаў археалогіі жалезнага веку.

Асабліва цікавіла археолагаў Крукава гара, якая была выяўлена лепельскімі краязнаўцамі мінулым летам недалёка ад Валосавічаў, куды яны і накіраваліся. Па сваёй форме гара авальная з плоскім верхам, з усіх бакоў абкапаная ровам, размяшчаецца на марэнным узгорку, парослым лесам. У мясцовых паданнях узгадваецца месца, дзе калісьці стаяла царква ды правалілася пад зямлю, па іншай версіі месціўся тут горад да якога ад падножжа ўзвышша вялі каменныя прыступкі.

У закладзеных па краю Крукавай гары шурфах быў выяўлены тоўсты пласт культурнага слою, што дае падставы гаварыць аб даволі доўгім існаванні на гэтым месцы ўмацаванага паселішча — гарадзішча. Культурны слой у месцах шурфоўкі быў багаты на знаходкі керамікі і крыцы, якая засталася ад выплаўкі жалеза.

Па тэхніцы лепкі керамікі была зроблена прыблізная даціроўка гарадзішча і вызначана этнічная прыналежнасць яго насельніцтва. Такім чынам, было ўстаноўлена, што Крукава гара — гэта ўмацаванае паселішча I–IV стст. н. э., на якім жылі прадстаўнікі плямёнаў штрыхаванай керамікі, якія адносяцца да старажытных балтаў. Пасля штрыхавікоў гарадзішча насялялі прадстаўнікі банцараўскай культуры (V–VI стст.) — належалі па этнічных рысах да славян. На думку Паўла Кенько, у пазнейшы час Крукава гара магла выкарыстоўвацца навакольным насельніцтвам як месца пакланення язычніцкім багам.

Дзякуючы археолагам, валосавіцкая зямля, так багатая помнікамі археалогіі, прыадкрыла яшчэ адну старонку свайго таямнічага мінулага.

***лістапад 2005 г.***

# Каменныя помнікі

На Лепельшчыне да нашага часу захаваліся пахавальныя помнікі XIV–XIX стагоддзяў. Яны як і курганы з'яўляюцца неад'емнай часткай матэрыяльнай і духоўнай культуры нашых продкаў. Вывучэнне гэтых помнікаў дазваляе разгледзіць шэраг гістарычных пытанняў, у тым ліку этнічныя і канфесійныя. Многія з магіл XIV–XIX стагоддзяў маюць знешнія прыкметы — камяні або каменныя крыжы.



*Каменны крыж каля в. Рэўтполле*

У навуковай літаратуры магілы XIV–XIX стагоддзяў, абкладзеныя камянямі, абазначаныя адным-двума валунамі, або каменнымі крыжамі, называюцца няйначай як жальнікі. Назва паходзіць ад беларускага слова жаль, альбо жальба. Але

ў народзе, урочышчы, дзе знаходзяцца жальнікі, адзначаны сваімі, мясцовымі назвамі. На Лепельшчыне яны носяць назвы «Галодныя Магілы», «Галоднікі». Бытуе думка, што ў такіх магілах пахаваны людзі, якія памерлі ў часы вялікага голаду. Паданні такога кшталту распавядаюць бабулі сваім унукам у Велеўшчыне. Тут, на ўскрайку вёскі, ва ўрочышчы «Селіца», ёсць каменныя надмагіллі і каменны крыж. Мінулым летам, вайскоўцы пошукавага батальёна памылкова раскапалі ў гэтым урочышчы адно пахаванне. Побач з касцямі быў знойдзены срэбраны нацельны крыжык.

Магчыма, такія павер'і ідуць з часоў XVI стагоддзя, калі Віцебшчына была спустошана падчас Лівонскай вайны (1558–1583 гг.).

У некаторых месцах жальнікі суседнічаюць з цяперашнімі могілкамі. Так, валуны-надмагіллі і каменныя крыжы ёсць на могілках вёсак Гарадзец, Стары Лепель і іншых. Найбольш шырока выкарыстоўваўся камень для вырабу надмагілляў у XV–XVIII стагоддзях. Але і ў XIX стагоддзі яшчэ шмат дзе з каменя рабілі крыжы, высякалі надпісы, абкладалі дробнымі камянямі надмагіллі. Напрыклад, у Велеўшчыне, Рудні, Аношках да нядаўняга часу захоўваўся звычай абкладаць магілы нябожчыкаў камянямі. На могілках вёскі Слабодка, што недалёка ад Старога Лядна, лепельскімі краязнаўцамі былі выяўлены камяні з датамі — на адным камені стаяла дата «1881 г.», а на другім — «1888». Да XIX стагоддзя адносяцца каменныя надмагільныя пліты з надпісамі на польскай мове (в. Гарадчэвічы) і на іўрыце (в. Слабодка, Лепель).

Навуковую каштоўнасць уяўляюць не толькі самі валуны-надмагіллі і каменныя крыжы, але і зробленыя на іх надпісы, малюнкі, крыжыкі, салярныя знакі. Па іх можна вызначыць не толькі дату пахавання, але і сказаць, да якой рэлігійнай канфесіі належыў нябожчык, да якога саслоўя адносіўся.

На вялікі жаль, лёс некаторых пахавальных помнікаў XIV–XIX стагоддзяў даволі трагічны. Многія з іх былі знішчаны ці часткова пашкоджаны ў другой палове XX стагоддзя. Напрыклад, так сталася са старымі польскімі могілкамі, што

месціліся на ўскрайку Паддуб'я. У 1970-я гады каменныя пліты з надпісамі на польскай мове былі выкарыстаны пры будаўніцтве жвіроўкі Лепель — Валосавічы. На месцы могілак зрабілі кар'ер, пясок з якога разам з чалавечымі косткамі ішоў на будаўніцтва ўсё той жа дарогі. Не адно дзесяцігоддзе праляжалі на ўскрайку леса каменныя крыжы і валуны ля в. Двор-Таронкавічы. Калісьці поле, дзе месціліся старыя могілкі, спатрэбілася мясцоваму калгасу пад пасяўныя плошчы. У адначассе быў знішчаны яшчэ адзін помнік духоўнай культуры нашых прашчураў. У 2003 годзе, дзякуючы намаганням краязнаўцы Васіля Шкіндзера і яго сяброў, могілкі ля Таронкавічаў былі адноўлены.

Разбурэнне могільнікаў, старажытных і не вельмі, заўсёды лічылася святатацтвам. Таму ад цяперашняга пакалення дарослых людзей будзе залежыць, як будуць зберагаць спадчыну дзядоў нашы дзеці. Для гэтага мы, перш за ўсё сваімі ўчынкамі, павінны паказаць ім шлях да духоўнага паразумення. Гэта можна зрабіць, зберагаючы магілы дзядоў і прадзедаў.

***снежань 2005 г.***

# «Французскія» і «рускія» магілы каля Замошша

Было тое ўвосень 1997 года. Я тады вучыўся на першым курсе гістфака ў Магілёўскім педінстытуце. Ад свайго выкладчыка археалогіі, вядомага ў навуковых колах Вячаслава Капыціна, атрымаў заданне: знайсці і апісаць археалагічны помнік. Ад людзей пачуў пра наяўнасць «французскіх» магіл ля вёскі Замошша Чашніцкага раёна. Гэта кіламетраў сем-восем ад Велеўшчыны. Сумненняў не было, гаворка ішла пра курганы. Засталося толькі іх знайсці. Не стаў адкладваць надоўга і ў адзін з цёплых восеньскіх дней адправіўся на пошукі.

Замошша. З роспытамі, як знайсці курганы, звярнуўся да першага сустрэчнага мужыка. Але той толькі чухаў патыліцу. Праз некалькі хвілін каля нас сабралася купка вяскоўцаў, мужчын і жанчын сталага ўзросту. Усім было цікава паглядзець на чужака, які не так часта забрыдае ў глухую вёску на ўскрайку раёна. А гэты яшчэ гаворыць па-беларуску. Урэшце-рэшт мы знайшлі агульную мову з замашанамі, толькі кабеты зазначылі: « Слухай хлапец, гавары па-нашаму, а то цябе зусім на разумеем». Прыйшлося ўважыць вяскоўцаў і для «больш цеснага кантакту», перайсці на «трасянку». Хутка ўжо ведаў у якім накірунку трэба рухацца, каб знайсці курганы.

Па словах вяскоўцаў курганоў у тутэйшых мясцінах многа. Распавялі паданне, што насыпы з'явіліся пасля вайны з Напалеонам. На гэтым беразе (левым) ракі Эса пахаваны францу-



*Курганны могільнік каля в. Замошша Чашніцкага раёна*

зы, а на супрацьлеглым, ля Валатовак, рускія салдаты. А яшчэ недзе ў Эсе ляжыць карэта з нарабаваным французамі дабром. Не стаў пераконваць замашан у адваротным, бо яны ўсё роўна будуць прытрымлівацца сваёй думкі, якая трывала замацавалася ў свядомасці людзей на працягу двух апошніх стагоддзяў.

У той дзень мне пашчасціла знайсці курганны могільнік, які налічваў дваццаць тры насыпы вышынёй ад 50 см да 1,5 м. У «Зборы помнікаў Віцебскай вобласці» згадак пра яго няма. Гэта значыла, што адкрыў невядомы для навукі помнік археалогіі. У будучым неаднаразова бываў на гэтым могільніку са сваімі вучнямі з Велеўшчынскай базавай школы, знайшлі яшчэ некалькі новых курганоў. У выніку атрымалася, што могільнік налічвае больш за трыццаць насыпаў.

Восенню 2002 года зрабіў для сябе яшчэ адну нечаканую знаходку. Вяртаючыся з чарговай вандроўкі, са сваімі хлапцамі з гуртка «Нашчадкі», вырашылі пад'ехаць да Эсы, каб адпачыць. Я застаўся каля веласіпедаў, а хлопцы разбрыліся па ляску ў пошуках сухога галля для вогнішча. Раптам нехта з іх прыбягае і радасным голасам паведамляе, што знайшоў курганы. Я быў здзіўлены — адкуль тут могуць узяцца курганы? Кожны раз спыняемся ў гэтым месцы адпачыць і нічога не знаходзілі, а тут вам, калі ласка. Падалося, што хлопцы маглі памыліцца. Увайшлі ў лес. Сапраўды, прама ля дарогі знаходзяцца два высокія насыпы, а далей яшчэ некалькі курганоў. Усяго налічылі каля дваццаці насыпаў вышынёй ад 1 да 2,5 м. На працягу некалькіх гадоў хаваў ад нас яловы гушчар старажытныя пахаванні. Не адзін з вышэй узгаданых помнікаў археалогіі не значыцца ў спісах зарэгістраваных.

Ля Валатовак таксама ёсць могільнік, ён налічвае дзевяць насыпаў. Узгадваецца ў « Зборы помнікаў Віцебскай вобласці». У канцы 1990-х гадоў нехта раскапаў некалькі курганоў. Ля аднаго, пазней, «Нашчадкамі»былі знойдзены два чалавечых чэрапы, адзін з іх належыў жанчыне, а другі мужчыну.

***студзень 2006 года.***

# Старажытнае гарадзішча

Мінулай восенню археолагі Інстытута гісторыі Акадэміі навук Андрэй Вайцэховіч і Павел Кенько праводзілі археалагічную разведку ў наваколлях Валосавічаў. Тады пры дапамозе лепельскіх краязнаўцаў удалося ўстанавіць месцазнаходжанне ўмацаванага паселішча — гарадзішча, у лесе за вёскай. Хто жыў на гарадзішчы і ў які час? На гэтае пытанне маглі даць адказ толькі археалагічныя раскопкі.

За разгадку таямніц гарадзішча, пра якое ў наваколлях ходзяць паданні, нібыта там стаяла царква і правалілася пад зямлю, узяўся Павел Кенько. З 15 па 17 жніўня ён праводзіў на гарадзішчы археалагічныя даследаванні. На паўднёва-усходнім ускрайку помніка быў закладзены шурф плошчай чатыры квадратныя метры. У першы дзень раскопак былі знойдзены гліняныя прасліцы, своеасаблівыя грузікі, якія адзяваліся на верацяно, некаторыя з іх былі пакрыты арнаментам. Самымі галоўнымі знаходкамі можна лічыць рэшткі посуду, па якому і вызначаюць прыналежнасць насельніцтва археалагічнага помніка да той ці іншай этнічнай супольнасці. У раскопе Павел і яго памагатыя знайшлі многа рэштак посуду з моцна заштрыхаванымі паверхнямі. На другі дзень, акрамя прасліц і керамікі, археолагам пашчасціла знайсці жалезныя вырабы — наканечнік стралы, кіяпадобныя шпількі, кавалак сякеры, а таксама косткі жывёл. Займалася насельніцтва гарадзішча і выплаўкай жалеза з балотнай руды, пра гэта сведчаць шматлікія кавалкі шлаку, што паўсюдна трапляўся ў культурным слоі падчас раскопак. Культурны пласт — слой зямлі са слядамі дзейнасці людзей, у раскопе дасягаў у вышыню больш аднаго метра, па меркаваннях Паўла, людзі жылі на гарадзішчы не адно стагоддзе.

На жаль, надвор'е перашкодзіла далейшым даследаванням гарадзішча, але і здабытых у час раскопак знаходак матэрыяльнай культуры нашых продкаў хопіць для таго, каб адказаць на пытанне, у які час людзі жылі на гарадзішчы, чым займаліся.

Ужо цяпер можна з упэўненасцю сказаць, што на гарадзішчы жылі прадстаўнікі культуры штрыхаванай керамікі, якія з самага пачатку жалезнага веку (VIII–VII стст.) і да сярэдзіны першага тысячагоддзя н. э. засялілі прасторы Лепельшчыны. Прадстаўнікоў гэтай археалагічнай культуры большасць даследчыкаў прылічвае да старажытных балтаў, што насялялі Беларусь задоўга да прыходу славян.

На працягу ўсяго, больш чым тысячагадовага перыяду, існавання сваёй супольнасці штрыхавікі, за некаторым выключэннем, жылі ў гарадзішчах. Гэтыя ўмацаваныя паселішчы яны будавалі на берагах азёр і рэчак, а таксама на ўзгорках. Так і гарадзішча, якое даследавалі ля Валосавіч, знаходзіцца на марэнным пагорку, з усіх бакоў абкапаным ровам, недалёка ад лясной рачулкі. Ужо ў першыя стагоддзі да н. э. яго насялялі людзі жалезнага веку, дакладную даціроўку існавання на гарадзішчы жыццядзейнасці дасць радыёвугляродны аналіз знойдзеных у культурным слоі абгарэлых бярвенняў. У пазнейшы час гарадзішча магло функцыянíраваць як культавы аб'ект язычнікаў-славян у раннім і высокім сярэдневякоўі, чые пахавальныя помнікі знаходзяцца недалёка ад старажытнага паселішча штрыхавікоў.

Увогуле, Павел Кенько застаўся задаволены вынікамі раскопак і мяркуе надалей вывучаць гэты археалагічны помнік.

***верасень 2006 г.***

# Курганы ля Велеўшчыны

Зпачатку восені і пакуль не выпадзе першы снег мы з вучнямі ходзім у краязнаўчыя экспедыцыі. Не стаў выключэннем сёлетні палявы сезон.

У мінулыя гады, займаючыся пошукам у наваколлях Велеўшчыны археалагічных помнікаў, знайшлі два могільнікі XIV-XIX стагоддзяў з каменнымі крыжамі. Аблазіўшы, як нам здавалася, усё наваколле, прыйшлі да высновы, што вакол вёскі археалагічных помнікаў быць не можа. Яно і лагічна,

бо Велеўшчына размясцілася сярод непраходных лясных гушчароў, дзе наўкол няма ні рэчкі, ні возера, якія ў даўнія часы маглі б прывабіць у нашу мясцовасць людзей. Таму лічылася, што вёска заснавана позна — недзе ў стагоддзі пятнаццатым, ці шаснаццатым. Гэта версія і надалей мела б пад сабой трывалы грунт, каб не наша сёлетняе адкрыццё.

Яшчэ ў пачатку вясны да нас звярнуўся мясцовы жыхар Іван Пшонка з прапановай паказаць «французскія магілы» непадалёк ад Велеўшчыны. Ён сцвярджаў, што на свае вочы бачыў некалькі насыпаў кіламетры за тры ад вёскі, у сосніку, аднак, было тое гадоў сорак таму, і цяперашняе існаванне курганоў Іван пацвердзіць не можа.

Не надта спадзеючыся на станоўчыя вынікі даследаванняў, «Нашчадкі» скіраваліся на пошукі курганоў. Якім жа было наша здзіўленне, калі ў паказаным месцы ўзбоч дарогі, што вядзе ў Цярэшкі, знайшлі курганы — старажытныя пахаванні нашых продкаў, разышоўшыся па лесе, налічылі 17 штучных насыпаў напаўсферычнай формы. Невысокія (сантыметраў 30–50), яны ўзвышаліся над зямлёй сведкамі падзей далёкай мінуўшчыны, як бы даказваючы існаванне жыцця ў гэтых мясцінах у першыя стагоддзі нашай эры.



*Андрэй Вайцэховіч каля раскапанага кургана*

Адкуль тут узяліся курганы? Дзе магло існаваць старажытнае паселішча? Каб атрымаць адказ на гэтыя пытанні, адаслалі апісанне курганнага могільніка археолагу Андрэю Вайцэховічу ў Інстытут гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Атрымалі тлумачэнні, што помнік археалогіі мог датавацца X–XI стагоддзямі. Больш дакладны ўзрост помніка можна вызначыць толькі пры раскопках.

Знаходка курганнага могільніка — сапраўдная сенсацыя для нашых мясцін. Яна дае падставы меркаваць пра больш старажытны ўзрост Велеўшчыны, ці іншага населенага паселішча, якое магло існаваць непадалёку.

***

P. S. У кастрычіку 2008 года археолаг Інстытута гісторыі Акадэміі Навук Андрэй Вайцэховіч даследаваў курганны могільнік. У ім налічваецца 17 круглых насыпаў дыяметрам 4–12 м, вышынёй 0,5–1,5 м. Адзін з насыпаў знаходзіцца з правага боку ад дарогі на адлегласці ад яе на 30 м. Было даследавана 3 курганы, якія пашкоджаны лесанарыхтоўкамі. У адным з курганоў быў знойдзены жалезны бранзалет, фрагменты керамікі. Ні ў адным з курганоў пахаванняў выяўлена не было. Датаваць помнік пакуль не маецца магчымым.

***студзень 2007 г.***

# На берагах старажытнага возера

Прыкладна пяць тысяч гадоў таму, калі ўзровень вады быў значна вышэйшы, азёры Окана і Бярэшча былі злучаны паміж сабой і ўтваралі адзіны вадаём, водная гладзь якога ляжала наўкол на многія кіламетры. Берагавая лінія таго старажытнага возера добра бачна ля Верабак, дзе высокі пясчаны бераг на захад ад вёскі рэзка паніжаецца і пераходзіць у забалочаную нізіну — дно колішняга вадаёма. Менавіта ў гэты час берагі і астравы возера пачалі засяляць плямёны паляўнічых і збіральнікаў, у гаспадарчай дзейнасці якіх ужо праяўляцца зачаткі земляробства і жывёлагадоўлі. Да такой высновы прыйшоў археолаг Інстытута гісторыі Акадэміі Навук Максім Чарняўскі на падставе археалагічных раскопак на адной са стаянак (паселішча людзей каменнага і бронзавага вякоў), якая знаходзіцца на невялікай выспе сярод тарфянога балота недалёка ад возера Бярэшча. Пяць тысяч год таму

гэта быў невялікі ўчастак сушы з усіх бакоў акружаны вадой. Па словах археолага, па берагах старажытнага возера і на аналагічных астравах таксама жылі прадстаўнікі нейкага аднаго племя. Па свайму этнічнаму паходжанню гэта былі прыбалты са слядамі ўплыву з боку фіна-ўграў — пляменаў, якія засялялі басейны Волгі, Акі і Камы.

На працягу тыдня Максімам Чарняўскім і яго памагатымі з Мінска, вучнямі Слабадской сярэдняй школы, краязнаўцамі, супрацоўнікамі музея, якія паслядоўна змянялі адзін аднаго падчас раскопак, было даследавана дзесяць квадратных метраў плошчы паселішча. Па знойдзеных прадметах можна датаваць стаянку IV — першай паловай I тысячагоддзя да н. э.



*На раскопках старажытнай стаянкі*

Унікальным з'яўляецца тое, што добра захаваліся прадметы, зробленыя з косці, якія ў асноўным захоўваюцца на тарфяніках — абламаны наканечнік стралы ці гарпуна, наканечнік дзіды, па якому можна меркаваць аб прыналежнасці стаянкі да больш ранняга часу — каля V тысячагоддзя да н. э. У вызначаны час асноўным матэрыялам, з якога рабілі прылады працы, з'яўляўся крэмень, было знойдзена два крамянёвых наканечнікі стралы, скрабкі, адбойнік, асобныя часткі крэменю. Крамянёвыя знаходкі сведчаць не толькі аб умелым выкарыстанні гэтага каменя ў гаспадарцы людзьмі бронзавага века, тэхніка апрацоўкі якога дасягнула сваіх вяршынь у параўнанні з мінулымі эпохамі, але і аб трывалых эканамічных сувязях з рэгіёнамі, адкуль дастаўляўся крэмень. Было знойдзена зашмат керамікі з разнастайнымі ўзорамі, а гэта значыць, што на працягу ўсяго існавання стаянкі адна археалагічная культура паслядоўна змяняла другую: нарвенская — IV тысячагоддзе да н. э, усвяцкая — пач. III — дру-

гая палова III тысячагоддзя да н. э., канец III тысячагоддзя да н. э. — культура грабенчата-ямачнай керамікі (фіна-ўгры), апошняя чвэрць III — сярэдзіна II тысячагоддзя да н. э. — паўночнабеларуская культура.

Добрыя прыродныя ўмовы, наяўнасць у вадаёме рыбы і вадаплаўнай птушкі спрыялі таму, што чалавек стала выкарыстоўваў дадзенае месца для пражывання на працягу некалькіх тысячагоддзяў, і толькі калі земляробства стала пануючым заняткам, людзі пакідаюць гэтыя мясціны.

***ліпень 2007 г.***

# *Помнікі археалогіі каля Верабак*

За смугою тысячагоддзяў хаваецца далёкая гісторыя роднага краю. Што адбывалася ў нашых мясцінах шмат гадоў таму, можна толькі здагадвацца. Часткова даць адказ на гэтае пытанне можа такая навука як археалогія. У апошняе дзесяцігоддзе Лепельшчына стала больш пільна, чым у папярэднія гады, прыцягваць увагу прафесійных археолагаў з Інстытута гісторыі Акадэміі Навук. Не стаў выключэннем і сёлетні год. На працягу некалькіх дзён у наваколлях вёскі Верабкі праводзілі археалагічную разведку навукоўцы з Інстытута гісторыі Акадэміі Навук Зоя Харытановіч і Максім Чарняўскі.

Трэба адзначыць, што ў 2006 і 2007 гадах Максім Чарняўскі, дзякуючы мясцоваму краязнаўцу Васілю Хацкевічу, выявіў і даследаваў паселішча, якое было заснавана нашымі далёкімі продкамі прыкладна V-VI тысяч гадоў таму на ўзбярэжжы ракі Бярэшча, ва ўрочышчы Дубавец у адным кіламетры на паўднёвы захад ад Верабак. Гэты перыяд у гісторыі называецца неалітам, ці новакаменным векам. У той час чалавек выбіраў для паселішчаў зручныя пясчаныя выспы недалёка ад вады — на пяску было сушэй і цяплей, здаравей для жыцця. У прыдатных для існавання месцах размяшчаліся цэлыя групы

паселішчаў. Па меркаванню археолагаў, тагачасныя паселішчы былі адносна невялікіх памераў — усяго некалькі жылых будынін і гаспадарчыя пабудовы.

У гэты самы час з'яўляюцца новыя віды гаспадарчай дзейнасці — земляробства і жывёлагадоўля, што прымушае людзей весці аселы лад жыцця, больш грунтоўна абсталёўваць месца пражывання. Дамінуючымі ў занятках застаюцца рыбалоўства і паляванне на дзічыну, якой заставалася шмат у навакольных лясах.

У выніку сёлетніх даследаванняў Чарняўскаму пры дапамозе Хацкевіча ўдалося выявіць яшчэ адно старажытнае паселішча, усяго ў паўкіламетры ад Дубаўца. Атрыманыя ў выніку шурфоўкі мясцовасці матэрыялы даюць падставы гаварыць пра тое, што людзі жылі ў гэтым месцы пяць тысяч гадоў таму, якраз у той самы час, як і на Дубаўцы, і з'яўляліся калі не кроўнымі родзічамі, то адназначна належалі да аднаго рода, ці племя.

Прааналізаваўшы ўсе наяўныя матэрыялы археалагічных даследаванняў Чарняўскі вылучыў гіпотызу, што, магчыма, на захад ад Верабак больш за 6 тысяч гадоў таму існавала сістэма азёр. На выскокіх, пясчаных берагах якіх і маглі быць не адно і не два паселішчы. Калі ўважліва паглядзець на сучасную карту, то можна пабачыць, як з захаду, поўдня і ўсходу наваколлі Верабак акружаюць балоты, якія ў ранейшыя часы былі ні чым іншым, як вадаёмамі. Ад іх на сёння засталіся толькі невялікія часткі ў выглядзе азёр Бярэшча і Окана. На берагах гэтых азёр археолагамі зафіксаваны прыкметы жыццядзейнасці старажытных людзей. Гэта можа служыць яшчэ адным доказам правільнасці вылучанай археолагам Чарняўскім навуковай гіпотэзы. А яшчэ сведчыць пра тое, што наш край быў ужо добра заселены VI тысяч гадоў таму.

Як жа склаўся лёс насельнікаў прыазёрных стаянак-паселішчаў у пазнейшы час? На гэтае пытанне даюць частковы

адказ знойдзеныя на раскопках артэфакты, а таксама навуковыя разважанні.

У сярэдзіне бронзавага веку, які прыходзіць на змену неаліту, адбываюцца значныя кліматычныя змены — паветра становіцца больш халодным і вільготным, падымаецца ўзровень вады ў вадаёмах. Ранейшыя, зручныя для жыцця берагі вадаёмаў забалочваюцца і людзі сыходзяць у іншую мясцовасць, больш прыдатную для вядзення земляробства і жывёлагадоўлі. Такімі месцамі з поўнай доляй верагоднасці маглі стаць сучасныя вёскі Окана, Селішча і Верабкі. Абжытыя мясціны людзі пакінулі дзесьці чатыры тысячы гадоў таму.

У той самы час, калі Максім Чарняўскі шукаў прыкметы існавання людзей у пойме ракі Бярэшча, Зоя Харытановіч займалася даследаваннем умацаванага паселішча — гарадзішча за некалькі соцен метраў на ўсход ад Верабак. Упершыню верабскае гарадзішча было абследавана археолагам Ляўданскім у 1930- м годзе. У 1970–80-я гады на гарадзішчы пабывалі археолагі Мітрафанаў і Заяц. Сучасныя даследаванні гарадзішчаў Лепельскага раёна, у тым ліку і каля Верабак, даюць магчымасць археолагам удакладніць этнакультурную прыналежнасць помнікаў.

На верабскім гарадзішчы людзі жылі ў жалезным веку, у I-III стагоддзях нашай эры. Знойдзеныя ў раскопе фрагменты ляпнога посуду адносяцца да днепра-дзвінскай культуры. Так умоўна ў археалогіі прынята называць этнічныя супольнасці людзей, якія ў сваёй матэрыяльнай культуры мелі агульныя рысы.

У выніку археалагічных даследаванняў каля Верабак археолагі атрымалі шмат новых матэрыялаў па старажытнай гісторыі Лепельшчыны, якія ў бліжэйшы час будуць уведзены ў навуковы абарот і дадуць магчымасць больш дэталёва вывучаць старажытную гісторыю краю сучасным даследчыкам.

***травень 2011 г.***

# Дотык да сівой даўніны

Вось ужо які год запар не абыходзяць увагай Лепельшчыну археолагі Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук. Не стаў выключэннем і сёлетні сезон раскопак, які звычайна пачынаецца ў канцы красавіка і цягнецца да глыбокай восені. На Лепельшчыну завіталі археолагі Максім Чарняўскі, Зоя Харытановіч (29-31 траўня) і Марат Клімаў. У папярэднія гады гэтыя навукоўцы ўжо даследавалі старажытныя паселішчы нашага раёна, якія адносяцца да розных па часе археалагічных культур.

Аб'ектам даследаванняў Марата Клімава стала гарадзішча і селішча ў наваколлях Кастрыцы. Менавіта на гэтах помніках у 1960-я гады праводзіў маштабныя раскопкі вядомы археолаг Георгій Штыхаў. Правёўшы дэталёвую разведку мясцовасці, Клімаў прыйшоў да высновы, што ў будучым варта працягнуць далейшае даследаванне дадзеных помнікаў.

Зоя Харытановіч у тандэме з Максімам Чарняўскім даследавалі наваколлі Верабак, дзе ў апошнія гады краязнаўцам Васілём Хацкевічам былі знойдзены ўнікальныя археалагічныя помнікі. Чарняўскага найбольш цікавілі берагі ракі Бярэшчы, якія, паводле яго гіпотызы і навуковага абгрунтавання, маглі быць кампактна заселены людзьмі прыкладна восем тысяч гадоў таму. Цяпер на Лепельшчыне вядомы помнікі, якія налічваюць не больш пяці тысяч гадоў. На працягу дня Чарняўскі разам з Васілём Хацкевічам, пераадольваючы шэраг прыродных перашкод — яшчэ не паспеўшыя высахнуць ад вясновай паводкі тванныя берагі Бярэшчы, парослыя хмызам і балотнай травой выспы ў пойме ракі — даследавалі навакольную мясцовасць. На адным з пясчаных пагоркаў, узараных кратамі, трапіўся невялікі выцягнуты плоскі каменьчык. Гэты прыродны матэрыял, старанна апрацаваны тысячы гадоў таму якімсьці нашым далёкім продкам, аказаўся наканечнікам стралы. На думку археолага, прадмет

налічвае каля сямі-васьмі тысяч гадоў і адносіцца да Кундскай культуры (8000 — 5000 гг. да н. э.). Археалагічная культура эпохі мезаліту на ўсходзе Прыбалтыкі і на поўначы Беларусі. Назва паходзіць ад паселішча каля г. Кунда (Kunda) у Эстоніі. Адметнай рысай культуры з'яўляецца шырокае выкарыстанне прылад працы і зброі з косці і рогу, а таксама пласцінчатых наканечнікаў стрэлаў. Асноўны занятак насельніцтва — паляванне і рыбалоўства. Сярод прылад працы і зброі — крамнёвыя сіметрычныя наканечнікі стрэл, скрабкі, каменныя сякеры, долаты і цёслы, касцяныя гладкія коп'і і наканечнікі стрэл, гарпуны, састаўныя рыбалоўныя кручкі, касцяныя кінжалы.

На тэрыторыі Беларусі вядома тры пасяленні Кундскай культуры, два ў Полацкім раёне і адно — у Верхнядзвінскім.

Знойдзены каля Бярэшчы наканечнік стралы наводзіць на думку, што і на Лепельшчыне магло існаваць паселішча дадзенай



*Археолаг Зоя Харытановіч і вучні Слабадской школы на раскопках верабскага гарадзішча. Травень 2012 г.*

археалагічнай культуры, і магчыма, не адно. Але пра гэта можна будзе гаварыць пасля правядзення археалагічных раскопак.

Верабскае гарадзішча, якое ў народзе называюць Плоская гара, Зоя Харытановіч пачала даследаваць у мінулым годзе. Тады быў закладзены невялікі шурф. Сёлета, маючы добраахвотных памагатых — вучняў нашай школы, археолаг змагла правесці найбольш грунтоўныя даследаванні. З Зояй сябруем даўно. Дапамагалі ёй раскопваць гарадзішчы ў Валосавічах і Старым Лепелі. Вось і сёлета сумеснымі намаганнямі даследчыкі выявілі багаты навуковы матэрыял. На працягу двух дзён шчыравалі з рыдлёўкамі і скрабкамі дзеці пад кіраўніцтвам прафесійнага археолага. Старанна перабіраючы рукамі грунт выяўлялі артэфакты, якія праляжалі ў зямлі каля двух тысяч гадоў. Асноўнымі знаходкамі сталі фрагменты ляпной керамікі, а таксама жалезнае шыла і фрагмент прасліцы — грузіка, які выкарыстоўваўся ў ткацтве. Хлопчыкаў і дзяўчынак найбольш уразіла тое, што на кавалках глінянага посуду да нашага часу захаваліся сляды чалавечых рук. Хто яго ведае, можа, нехта з іх дакрануўся, не проста да археалагічнай знаходкі, а адчуў дотык свайго далёкага продка.

***чэрвень 2012 г.***

## Аднавілі старыя крыжы

Некалькі стагоддзяў таму нашыя продкі ў памяць аб сваіх памерлых сваяках ставілі на пахаваннях надмагіллі ў выглядзе каменных крыжоў ці пліт. Звычайна, на плітах высякалі хрысціянскія сімвалы, пазначалі год пахавання ці рабілі нейкі надпіс. З цягам часу пахаванні такога кшталту сталі не проста памінальнымі помнікамі пращчурам, але і перайшлі ў разрад матэрыяльнай культурнай спадчыны. У народзе могілкі з каменнымі крыжамі і плітамі называюць «галодныя магілы». Навукоўцы гэтыя помнікі датуюць XIII–XVIII стагоддзямі і называюць жальнікамі.

На Лепельшчыне такога кшталту пахаванні можна знайсці амаль у кожнай вёсцы. Адзін з такіх жальнічных могільнікаў



*Ля паднятага крыжа ў в. Велеўшчына*

знаходзіцца на ўскайку вёскі Велеў-шчына. Старыя, парослыя дрэвамі і хмызам, могілкі мяжуюць з сучаснымі пахаваннямі. Сярод паўтара дзясятка каменных надмагілляў па форме можна вылучыць некалькі крыжоў, што, не вытрымаўшы выпрабаванне часам, паваліліся і паціху абрастаюць мохам.

Час ад часу старыя могілкі наведваем мы з вучнямі, абдзіраем з крыжоў мох, змятаем лісце. Але на большае ў дзяцей сілы не стае. І вось тут на дапамогу прыйшлі лепельскія краязнаўцы. Яны ўжо маюць вопыт аднаўлення могілак ў Таронкавічах, якія на сённяшні дзень з'яўляюцца сапраўднай турыстычнай «меккай» Лепельшчыны. Дайшла чарга аднавіць сярэднявечныя могілкі ў Велеўшчыне.

Першым было вырашана падняць самы вялікі не толькі па памерах, але і па вазе крыж. Пра гэты помнік сярэднявечча ад старажылаў Велеўшчыны дайшло некалькі паданняў. Па адной версіі ў крыж, у якога адбіта адно перакрыжжа і верхняя частка, было схавана золата. Адзін мясцовы жыхар і вырашыў гэта праверыць, пашкодзіўшы святыню. Золата ён так і не знайшоў. У другім паданні ідзе гаворка пра тое, што ў 1930-я гады крыж

ужо спрабавалі падняць некалькі мужыкоў. Але не здолелі гэта зрабіць, бо ўсе разам атрымалі разрыў сэрца.

Не зважаючы на пачутыя гісторыі, краязнаўцы Васіль Шкіндзер і яго сын Ілья, Васіль Хацкевіч, Уладзімір Шушкевіч, Валерый Чарэцкі, Вольга Ганчар і яе дзеці Сяргей і Ганна дружна ўзяліся за справу. Сумненні былі толькі ў тым, што чацвёра дарослых мужчын, жанчына і некалькі падлеткаў змогуць падняць паўтонную глыбу. Але вырашылі паспрабаваць прымяніць у гэтай справе не толькі фізічную сілу, але і элементарнае веданне законаў фізікі. Пры дапамозе некалькіх рычагоў і вяроўкі краязнаўцы здолелі паспяхова паставіць крыж на тое месца, дзе ён да гэтага стаяў некалькі стагоддзяў.

Такім жа чынам краязнаўцы паставілі на месца яшчэ некалькі крыжоў і каменнае надмагілле пачатку дваццатага стагоддзя. Крыху прыйшлося павазіцца з плоскай каменнай плітой вышынёй з паўметра. Карані дрэва, аплёўшы з усіх бакоў камень, не давалі паставіць яго вертыкальна. Але і гэты помнік сярэднявечча прыняў свой першасны выгляд. Доўга яшчэ разглядалі шурпатую паверхню каменя, на якім стагоддзі таму нехта выбіў раннехрысціянскі сімвал крыжа, які па форме сваёй больш нагадвае якар.

***жнівень 2012 г.***

## Вывучэнне Лепельшчыны ў 1930-я гады

У 1920-30-я гады ў Беларусі адбываўся сапраўдны краязнаўчы ўздым. Цікавасць да вывучэння мінулага свайго краюназіралася і на Лепельшчыне. Свае даследаванні праводзілі як аматары-краязнаўцы, так і прафесійныя навукоўцы. У 1929 годзе інспектар Цэнтральнага бюро краязнаўства БССР Андрэй Шашалевіч на невялікім астраўку сярод Лепельскага возера, каля вёскі Стары Лепель, выявіў сляды селішча з ганчарнай, з хвалістым арнаментам пасудай X-XII стагоддзяў. Цікавы той факт, што з'яўляючыся ся-

брам літаратурнага аб'яднання «Узвышша», Шашалевіч пад псеўданімам Адрый Мрый друкаваў свае творы. Сярод яго літаратурнай творчасці значнае месца займае сатырычны раман «Запіскі Самсона Самасуя».



*Аляксандр Ляўданскі*

У 1931 годзе пад кіраўніцтвам Аляксандра Ляўданскага Беларускай Акадэміяй навук была наладжана комплексная экспедыцыя. З чэрвеня па жнівень удзельнікі экспедыцыі даследавалі раён Бярэзінскага канала і ракі Беразіна, пачынаючы ад Лепеля да Бабруйска. У экспедыцыі прынялі ўдзел супрацоўнікі Інстытута гісторыі секцыі археалогіі Васіль Дружчыц, Сяргей Дубінскі, Аляксандр Каваленя, секцыі этнаграфіі — М. Я. Грынблат і І. А. Сербаў. Інстытут мовазнаўства прадстаўлялі Баркоўскі і І. Сербаў.

Раён р. Бярэзіна быў абраны экспедыцыяй з прычыны колькасці інтарэсаў даследчыкаў розных галін у сувязі з пастаўленымі імі для распрацоўкі тэмамі. Этнографы паставілі сабе мэтай вывучэнне ранейшых галін гаспадаркі БССР. З гістарычна-археалагічнага боку басейн Бярэзіны, як слаба даследаваны да гэтага часу, з'яўляўся аб'ектам пошукаў помнікаў археалогіі. Тым больш, што р. Бярэзіна з'яўлялася часткай вялікага воднага шляху IX–XI стагоддзяў.

Асноўным транспартам удзельнікаў экспедыцыі былі плаўсродкі, якія па загадзе Лесбелу былі прадастаўлены ў часовае карыстанне Лепельскай сплаўной канторай.

Гісторыка-археалагічная частка экспедыцыі ставіла сабе за мэту раскопкі і вывучэнне помнікаў матэрыяльнай культуры. Экспедыцыя рабіла выхады ў бок асноўнага маршруту — ракі і пунктаў прыпынку. Такім чынам у наваколлях Лепеля была даследавана мясцовасць радыўсам 15-20 кіламетраў. Знойдзеныя помнікі заносіліся на карту, рабіліся іх абмеры, замалёўка і фатаграфаванне. На некаторых з іх праводзіліся раскопкі. У час экспедыцыі

археолагі выявілі і даследавалі шэраг помнікаў мінуўшчыны. Недалёка ад Стай было знойдзена селішча з рэшткамі ганчарнага посуду. Даследаваны гарадзішчы каля вёсак Стары Лепель, Гарадок, Стараселле, пасёлка Аўгустова (цяпер в. Звязда).

Не пакінулі без увагі і старажытныя пахаванні — курганы. Асабліва зацікавілі ўдзельнікаў экспедыцыі магілы, абкладзеныя камянямі. Мелі яны кругападобную або падоўжаную форму. Яшчэ і цяпер шмат у якіх паселішчах Лепельшчыны зафіксавана наяўнасць могілак з аналагічнымі пахаваннямі. Датуюць іх XII–XIV стагоддзямі.

Экспедыцыяй па ўсіх пастаўленых праблемах была зроблена вялікая колькасць фотаздымкаў, асабліва па аб'ектах звязаных з вывучэннем лесасплаву і рыбацтва. Былі сфатаграфаваны важнейшыя помнікі матэрыяльнай культуры. Для гэтых мэт экспедыцыя мела спецыяльна сканструяваную невялікую палявую камеру для праяўкі на месцы работы ў любы час пластынак і друкавання фотаздымкаў. Зроблены замалёўкі і замеры даследаваных аб'ектаў.

На працягу работы экспедыцыі вялася і культурна-масавая работа, якая зводзілася да чытання лекцый на месцах стаянак. У Лепелі былі прачытаны лекцыі на наступныя тэмы: «Класавая барацьба ў літаратуры», «Нацыянальны-дэмакратызм і чарговыя задачы мовазнаўства»; у Домжарыцах — «Класавая сутнасць рэлігіі», «Купалле, як пераджытак вясельнага святкавання». Акрамя таго былі зроблены даклады і праведзены шэраг гутарак на антырэлігійныя тэмы і тэмы культурна-гістарычнага характару ў сувязі з даследаваннем археалагічных помнікаў.

Зробленыя ўдзельнікамі экспедыцыі адкрыцці далі штуршок у даследаванні нашага рэгіёна. Па сённяшні дзень на тагачасныя працы ў галіне археалогіі, этнаграфіі робяць спасылкі сучасныя даследчыкі. На жаль, многае з таго, што зафіксавалі і сабралі вучоныя ў 1930-я гады, было згублена ў вадавароце гістарычных пераўтварэнняў.

***кастрычнік 2012 г.***

# Ад вёскі да вёскі

*Па сцежка — дарогах*
*Роднага краю*
*У кожную вёсачку*
*Я завітаю.*

## Сумнае вяселле

Жыве ў Аношках адна цікавая бабулька — Ганна Іванаўна Аношка. Шмат чаго пабачыла яна ў сваім жыцці, шмат чаго можа распавесці... У той вечар пачуў не адну гісторыю, але гэта ўразіла больш за іншыя сваім драматызмам. Шмат людзей і звязаных з іх лёсамі падзей адышло ў нябыт, іх ужо ніхто і не ўзгадае. А гэта паданне яшчэ доўгі час будуць пераказваць з вуснаў у вусны бабулькі сваім унукам...

Было тое даўным-даўно. Жыў у Слабадзе пан, была ў яго дачка-прыгажуня, далёка разносілася слава пра яе красу. Многія панічы заляцаліся да Вольгі, але нікому так і не ўдалося знайсці ключык да яе сэрца. Ці кахала ўжо каго, ці толькі чакала дзяўчына свайго суджанага, пра гэта мы ніколі не даведаемся. Як бы там не было, бацька лічыў галоўным аддаць дачку замуж. Ды не за абыкаго, а за багатага паніча. Такім чынам пан спадзяваўся выправіць сваё пахіснутае фінансавае становішча, дый дачка тады ні ў чым адмаўляць сабе не будзе. Словам, у грошах шчасце шукаў ёй і сабе бацька.

З'явіўся ў бацькі-пана на прыкмеце жаніх для Вольгі недзе пад Мінскам, за якога можна было аддаваць дачку. Праўда, жаніх немалады быў. Ну і што? Непрыгожы? Таксама няважна. Як кажуць

у народзе: сцерпіцца-злюбіцца. На тым і дамовіліся са сватамі. Бацька паехаў дахаты паведаміць дачцэ аб сваім рашэнні, а жаніх пачаў рыхтавацца да вяселля.

Шмат бяссонных начэй правяла Вольга, усё ўгаворвала бацьку, каб дазволіў самой вырашаць свой лёс, але пан быў няўмольны. Мусіла дзяўчына ісці замуж за нялюбага ёй чалавека.

Надышоў той дзень, калі Вольга пакідала родны дом, дзе прайшло дзяцінства, дзе марыла пра каханне. Ці думала яна, што так усё павернецца, у адзін момант перакрэсляцца мары і надзеі? Не, яна ніколі не стане жонкай нялюбага ёй чалавека!..

Праводзіць у далёкую дарогу прыгажуню сабралася шмат народу. Нехта зайздросціў, але больш спачувалі, быццам прадчувалі нешта нядобрае. Схавалася ў дарожным пыле чацвёрка вараных коней, якая далей і далей несла Вольгу ад родных мясцін насустрач невядомасці.

Надышоў дзень вяселля. Усе былі па-святочнаму ўсхваляваныя і радасныя, адна Вольга заставалася задуменнай і сумнай. Яна зачынілася ў сваім пакоі прыбірацца. Гасцям не цярпелася пабачыць дзяўчыну ў вясельным убранні. А той усё не было. Ды жаніх загадаў ламаць дзверы ў пакой, дзе была нявеста. Карціна, якая паўстала перад вачыма сведкаў, мабыць яшчэ доўга мроілася ім у снах. На ложку, у вясельным убранні ляжала з усмешкай на твары мёртвая Вольга.

На стале стаяў куфель, з якога дзяўчына выпіла атруту. Яна палічыла за лепшае павянчацца са смерцю, чым з нялюбым чалавекам.

Чатыры вараных кані, запрэжаныя ў чорную карэту, імчалі дзень і ноч. Гэты «вясельны» картэж вёз цела Вольгі ў Слабаду.

Бацька зрабіў дачцэ шыкоўнае пахаванне. Кожнаму, хто прыходзіў да панскага маёнтка, давалі чвэртку гарэлкі, булку і селядзец, каб памянуць нябожчыцу-нявесту.

Калі будзеце ў Слабадзе, то абавязкова пачуеце аповяд пра тое сумнае вяселле.

***снежань 2000 г.***

# Дзе пяюць салаўі, у кустоўях лазы

У гэтых мясцінах заўсёды стаіць цішыня. Толькі двойчы на дзень, у абед і ўвечары, дае аб сабе ведаць цягнік, бо чыгунка побач. Ды якая-небудзь машына праедзе. І ўсё зноў патанае ў цішыні, як быццам наўкол няма ніводнай жывой істоты. Але так здаецца толькі на першы погляд, бо не адразу разгледзіш за кустамі лазы невялічкую вёсачку Лазовікі. Менавіта ад тых лазовых кустоў і атрымала яна назву. Першыя насельнікі з'явіліся там даўным-даўно, прыйшоўшы з навакольных вёсак. Нельга сказаць, што вабіла перасяленцаў урадлівая зямля. Усю лепшую прыбралі да рук паны, таму і даводзілася людзям асвойваць цаліну і абжывацца на ёй.

Лазовікі ніколі не былі вялікай вёскай. Калі я быў малы, там стаяла восем хат. Цяпер засталося шэсць. Жылыя тры. Жыхары астатніх ці памёрлі, ці паехалі дажываць свой век да дзяцей. Падобных на Лазовікі песелішчаў па раёне раскідана шмат. Аднак, гэтая вёска мне дарагая па-свойму, бо жывуць у ёй мае дзядуля Пашка і бабуля Вольга Маляўкі. У Лазовіках прайшлі мае дзіцячыя гады, там знаёмыя кожны кусток, кожны пагорак.



*Дзед Пашка і бабуля Вольга Маляўкі*

Бывала, выганім з дзедам кароў у поле і да вечара, пакуль гнаць жывёлу дахаты, слухаю яго аповяды пра тое, як калісьці жылі людзі, адкуль паходзіць назва той ці іншай мясцовасці.

Асабліва прыгожа ў Лазовіках вясной, калі ўсё навокал ажывае — дрэвы апранаюцца ў зялёнае

ўбранне, распускаюцца першыя кветкі, а салаўі спяваюць песні, схаваўшыся ў лазе. Усё жыццё пражылі ў Лазовіках мае дзяды. Дзядуля пасвіў калгасную жывёлу, бабуля больш завіхалася каля хаты — гадавала дзяцей, а потым унукаў. Цяпер яны на пенсіі, але клопатаў меней не стала. Трэба дагледзіць гаспадарку, а яна не малая.

Колькі казалі старым, каб пажылі крыху дзеля сябе, адпачылі на старасці гадоў, дык слухаць не хочуць. Разважаюць: хто яшчэ паклапоціцца аб дзецях і ўнуках, як не бацькі. А выгадавалі і паставілі на ногі Павел з Вольгай шасцёра дзяцей. Цяжка было, але паразуменне і павага адзін да другога дапамагалі ў складаныя часіны. Цяпер яны маюць трынаццаць унукаў і двух праўнукаў. Усе дзеці жывуць непадалёку ад бацькоў, не раз'ехаліся па свеце, таму і цесна бывае ў хаце ў выхадныя і святочныя дні, калі збіраецца амаль уся вялікая сям'я, і гэта дзядам толькі ў радасць.

Месцяцца Лазовікі непадалёку ад Лепеля, і дабрацца туды нескладана. Аднак, гэта цяпер, раней было па-іншаму. Памятаю, як бацька кідаў матацыкл далёка за вёскай, а сам нёс мяне на плячах праз лужыны, якія здаваліся тады невялічкімі азёрамі. Калі зрабілі дарогу, пачаў хадзіць аўтобус у суседнюю вёску Горкі. Стала зручней туды ў магазін дабірацца з Лазовікаў. Не дае ператварыцца ў глушмень гэтым мясцінам чыгунка. Каб не яна, даўно разбеглася б моладзь з тых самых Горак. Радуе і тое, што дачнікі пакуль сюды не дабраліся. Карысці ад іх мясцоваму люду як з казла малака, а клопату вышэй галавы.

На жаль, цяпер не стае часу, каб выбрацца да дзядоў і адпачыць ад будзённай мітусні. Але як толькі з'яўляецца вольная хвіліна, абавязкова наведваюся ў Лазовікі, каб праведаць старых, як калісьці раней, паслухаць іх аповеды, парады і павучэнні, прагуляцца па Бабінаму саду, дзе стаяла хата прадзедаў, атрымаць асалоду ад цішыні, набрацца жыццёвай сілы і... зноў вярнуцца да штодзённых клопатаў.

У дзядоў я бываў амаль кожны тыдзень. Балазе, веска Чэрцы, дзе да свайго сталення мы жылі з маці і айчымам, знаходзіцца за пяць кіламетраў ад Лазовік. Таму для мяне не было вялікай цяжкасцю на веласіпедзе з ветрам пракаціцца да дзядоў. Асабліва было весела на дзядоўскай сялібе ў святы. Мне найбольш падабалася Радаўніца. Памятаю, як упершыню дзядуля з бабуляй узялі мяне на могілкі, дзе пахаваныя ўсе нашыя родзічы. З тае пары мне хацелася ведаць значна больш, чым толькі месца пахавання прашчураў.

У 1883 годзе ў сялянскай сям'і Іллі і Домны Аксяновічаў з вёскі Зорніца нарадзіўся сын Даніла. Лёс хлопца быў такі, як і яго бацькоў — гнуць спіну на сваім надзеле. Ажаніўся. Але нядоўга цешыліся маладыя: пачалася Першая сусветная вайна, і Данілу забралі ў царскае войска. Ваюючы на фронце трапіў ён у нямецкі палон, у якім прабыў шэсць з паловай гадоў. За гэты час родныя аплакалі Данілу як нябожчыка. Можна ўявіць, з якім здзіўленнем і радасцю сустрэлі бацькі сына жывым і здаровым. Акрамя радасці сустрэчы, перанёс Даніла і горыч страты. Ганна, яго жонка, згубіўшы ўсялякую надзею дачакацца мужа, выйшла замуж за іншага. Але трэба было ўчарашняму палоннаму неяк жыць. З Малога Жэжліна ўзяў сабе жонкай Альшбету Крачкоўскую, якая нарадзіла яму Вольгу і Аляксея. Потым маладая сям'я пераехала ў Лазовікі. У гэтай вёсцы і пражылі жыццё прадзеды. Памёрла баба Альшбета ў верасні1945 года. Здавалася, смерць жонкі, з якой пражыў у горы і радасці доўгія гады, павінна была зламаць Данілу. Але дзед аказаўся мацнейшым за абставіны жыцця, пражыў 84 гады і памёр у 1967 годзе. Знайшлі вечны спакой прадзеды на могілках у Зорніцы, на маляўнічым беразе ракі Ула...

Як ужо казаў, жыве ў Лазовіках толькі тры сям'і, але назваць вёску выміраючай язык не паварочваецца. Ёсць там яшчэ малыя лазоўцы — Насця ды Іван. А калі ёсць дзеці ў вёсцы, то будзе ў яе і будучыня.

***травень 2001 г.***

# Дзед Аляксей і яго вёска


Аляксей Банько

Чэрцы. Той, хто праязджае праз гэтую вёску, жартуе «У Лепелі жывуць лепяльчане, а ў Чэрцах — чэрці?» Ды і самую вёску часам так і называюць — Чэрці. Хто яго ведае, можа і жылі даўным-даўно ў гэтых мясцінах чэрці і надалі такую назву свайму паселішчу. Але я, тутэйшы жыхар, чарцей ніводнага разу не сустракаў, за выключэннем тых, якія падобныя да нас з вамі і робяць вяскоўцам розную шкоду. Цяперашнія жыхары Чэрцаў зусім не ведаюць гісторыю свайго паселішча, ды яна іх мала клапоціць. Але жыве тут адзін чалавек, які можа распавесці шмат цікавага пра нашу вёску. Дзед Аляксей — асоба неардынарная, тыя ці іншыя падзеі, якія адбываліся амаль на працягу ўсяго дваццатага стагоддзя не толькі ў Чэрцах, звязаны з яго лёсам. Аляксей Апанасавіч Банько нарадзіўся ў 1909 годзе ў маёнтку Чэрцы. Бацька яго працаваў у тутэйшага пана Стэндэля. Калі Аляксей падрос, стаў дапамагаць бацьку і старэйшым братам упраўляцца на панскай гаспадарцы. Пасвіў жывёлу, выконваў іншую працу, што па сіле маленькаму хлопчыку. Жылося сям'і Банько нядрэнна, дзеці мелі магчымасць наведваць школу, што была ў Гарадчэвічах. Сюды ж, у Гарадчэвічы, па выхадных і святах ездзілі ў царкву і на кірмаш.

На пачатку дваццатага стагоддзя вёска Чэрцы ў такім выглядзе, як цяпер, не існавала. Быў толькі маёнтак з гаспадарчымі пабудовамі і некалькі хат, дзе жылі сяляне, якія працавалі ў пана. Адна з такіх хат захавалася да нашых дзён, у ёй нарадзіўся і жыве цяпер дзед Аляксей. Шмат ён пабачыў на сваім вяку за 92 гады жыцця.

У 1917 годзе, прыхапіўшы самае неабходнае, збеглі паны. Усталявалася савецкая ўлада, і сялянам сталі даваць ва ўласнасць зямлю. Вось тады і пачалі з'язджацца ў Чэрцы людзі з мясцін, дзе той зямлі не хапала. Так утварылася вёска. Але ва-

кол яшчэ працягвалі існаваць хутары, ад якіх цяпер засталіся толькі назвы — Казелькі, Лапэшчына... Не паспелі людзі адчуць сябе паўнапраўнымі гаспадарамі, як у 1930-х пачалася калектывізацыя, зямлю давялося аддаць дзяржаве. Тых, хто не хацеў рабіць гэта добраахвотна, раскулачвалі і ссылалі ў Сібір. Так здарылася з вяскоўцамі, якія жылі ў Казельках. Яны яшчэ ў пана выкупілі надзел зямлі і таму развітвацца з ёй у іх не было ніякай ахвоты, за што і паплаціліся.

У Чэрцах быў створаны калгас «Новы шлях», куды Аляксей уступіў без усялякіх роздумаў і ваганняў, веручы, што калектыўна будзе жыць лепш. Так і працаваў бы ў калгасе малады хлопец, «будуючы светлую будучыню», аднак прыйшла позва ў войска. Служыць трапіў у артылерыю, дзе цягаў на конях гармату. За час праходжання службы давялося Аляксею крыху павяваць: спачатку прымаў удзел у вызваленні Заходняй Беларусі ў 1939 годзе, потым, у 1940 годзе, будучы ўжо кулямётчыкам, ваяваў з фінамі. Да гэтага часу на правай шчацэ дзеда захаваўся шрам ад фінскага асколка, якім яму выбіла зубы. Такая вось насычаная баявымі паходамі была ў дзеда служба, з якой яму пашчасціла вярнуцца жывым у родную вёску. Не паспеў былы салдат зноў прывыкнуць да плуга і касы, якіх не трымаў у руках некалькі гадоў, як зноў прыйшлося брацца за зброю. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Гэтую страшную навіну Аляксей пачуў у лесе каля вёскі Гарадзец, дзе быў на вайсковых зборах. Тады, летам 1941 года, Чырвоная армія так хутка адступала, што дывізія, куды трапіў служыць радавы Банько, праз некалькі тыдняў вяла баі ўжо на подступах да Масквы, дзе і трапіла ў акружэнне. Невялікай групе акружэнцаў пашанцавала прарвацца да сваіх, астатнія трапілі ў палон, у тым ліку і Аляксей. З-пад Масквы палонных накіравалі ў Віцебск, а адтуль — па лагерах: каго ў Оршу, каго ў Лепель. Так Банько апынуўся на радзіме. З Лепельскага канцлагера яго выкупілі родныя, і пакуль не прыйшлі рускія, даводзілася небараку хавацца ад немцаў, каб зноў не трапіць у

іхнія кіпцюры. Пасля вызвалення Беларусі яго зноў забіраюць у дзеючую армію, набытая раней практыка дапамагла Аляксею выжыць на той вайне. Перамогу ён сустрэў у Чэхаславакіі.

Вярнуўся Аляксей Банько дамоў толькі тады, калі стала зразумела, што вораг не пагражае не толькі з Захаду, але і з Усходу. Пасля дэмабілізацыі з войска падаўся працаваць у калгас. Адтуль і пайшоў на пенсію. Да апошняга часу дзед Аляксей са сваёй жонкай Еўфрасінняй, якой зараз 90 гадоў, трымаў гаспадарку. Але здароўе ўжо не тое, што было раней. Таму давялося адмовіцца ад каровы і каня. Але курыца ды кот радуюць старых.

Нягледзячы на ўзрост ды праблемы са здароўем, дзед дома не сядзіць. Часта бывае ён у ваенным гарадку Заслонава, што за 10 кіламетраў ад Чэрцаў. Ездзіць туды, каб набыць харчоў для сям'і, бо ў мясцовым магазіне выбар не надта багаты. Яшчэ некалькі гадоў таму дабіраўся ён туды на веласіпедзе. Словам, як і кожнага з нас, не абыходзяць старога бытавыя праблемы. І вырашаць іх стараецца самастойна.

Чэрцы. Гісторыя гэтага паселішча пачынаецца задоўга да XX стагоддзя. І назва яго паходзіць не ад чарцей, а ад старажытнай славянскай земляробчай прылады — чартал. У 1857 годзе каля Чэрцаў праводзіў археалагічныя раскопкі Міхаіл Кусцінскі. Ім было знойдзена адно са старажытных пахаванняў, дзе выяўлены рэшткі чалавечых касцей і некаторыя рэчы. Наяўнасць гэтых фактаў дае падставы сцвярджаць аб старажытным паходжанні нашай вёскі. Тое гаворыць і дзед Аляксей.

***сакавік 2001 г.***

## Была. Ёсць. Будзе...

У школе мы праводзім лепшыя гады жыцця. Пераступіўшы аднойчы парог школьнага будынка наіўнай малечай, пакідаем сцены школы ўжо пасталеўшымі юнакамі і дзяўчатамі. І яшчэ доўга ўзгадваем любімых настаўнікаў, школьных сяброў, першае каханне. Так было, ёсць і будзе, па-

куль існуе школа. Але ці задумваліся мы, што школа, як і чалавек, мае свой лёс, сваю гісторыю.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі трэба было ствараць новую — савецкую сістэму адукацыі. У Беларусі гэта адбывалася на падставе «Палажэння аб адзінай працоўнай школе РСФСР» ад 16 кастрычніка 1918 года. І ўжо з 1 лістапада навучальныя ўстановы пачалі работу. Па ўсёй верагоднасці, тады і была адчынена школа непадалёк ад Чэрцаў, якая стала папярэдніцай цяперашняй Чэрскай базавай школы. Тады яна насіла назву «Гушчанская», атрымаўшы яе ад панскага маёнтка. Дзед Аляксей Банько з Чэрцаў узгадаў, што іх, хлопчыкаў і дзяўчынак вучыў настаўнік з Гарадчэвіч. Але нядоўга радаваліся вяскоўцы магчымасці вучыць дзяцей. Вясной 1919 года пачалася польская акупацыя, школу зачынілі. Заняткі аднавіліся толькі ўвосень, калі прагналі палякаў. У 1922 годзе Гушчанская школа была рэфармавана ў сямігодку. У Чэрцах, у былым панскім маёнтку, таксама былі пачатковыя класы.



*Калектыў Гушчынскай сямігодкі. Фота 1939 г.*

На жаль, ніхто ўжо не ўзгадаў імён настаўнікаў, якія працавалі ў 1920-я гады. Але менавіта на іх долю выпалі самыя цяжкія гады станаўлення школы. У 1930-х гадах школа працягвала работу па навучанню і выхаванню маленькіх грамадзян Савецкай дзяржавы. У той час дырэктарам быў Лука Калінкавіч Шыцько. Яго жонка, Аляксандра Пухава, таксама настаўнічала, выкладала біялогію. Жылі яны ў школе. Астатнія настаўнікі кватаравалі ў Юндзілаўцы. Алена Іванаўна Трубека, якая тады вучылася ў Гушчыне, узгадала прозвішчы некаторых з іх. Беларускую мову выкладала Вераб'ёва, геаграфію — Антуневіч, працавалі таксама Батракоў, Мечыслаў Кулевіч, Марыя Бецэнка, Міхаіл Пліско, Ганна Ліндарэнка, Зоя Насавец.

Нехта з настаўнікаў быў незадаволены працай дырэктара, і ў 1939 годзе Шыцько знялі з пасады. Замест яго прызначылі выпускніка Віцебскага педагагічнага інстытута Анатоля Якаўлевіча Завадскага. У той не вельмі спакойны час, радзіме патрабаваліся адукаваныя абаронцы. Таму пачалі забіраць на тэрміновую службу настаўнікаў. Так ў 1940 годзе большая частка настаўнікаў мужчын Лепельскага раёна была прызвана ў Чырвоную Армію. Гэткі лёс напаткаў і дырэктара Гушчынскай сямігодкі Анатоля Завадскага. Ніхто з былых вучняў далёкіх саракавых так і не ўзгадаў прозвішча таго, хто быў наступным дырэктарам. А ў хуткім часе пачалася Вялікая Айчынная вайна. Школа згарэла. Невядома, ці то немцы такім чынам выкаранялі савецкія пачаткі, ці партызаны не хацелі пакідаць ворагу народныя здабыткі.

1944 год. На Захад адкацілася кананада вайны. Трэба было пачынаць усё з нуля. Нягледзячы на розныя цяжкасці, восенню дзеці селі за парты. На жаль, будынак Гушчынскай сямігодкі не аднавілі з-за недахопу сродкаў. Але ў Чэрцах зноў пачала працаваць пачатковая школа. Удалося звязацца з Таісіяй Арцёмаўнай Шарлаевай, якая працавала тады ў школе дырэктарам, а цяпер жыве ў вёсцы Гогалеўка Чашніцкага раёна. Яна паведаміла, што з ёй у той час працавалі бежанцы з-пад Віцебска Галіна

Паўлаўна Петухова, жыхарка вёскі Новая Зара Чашніцкага раёна Валянціна Якаўлеўна Старухіна, Клаўдзія Фёдараўна Яско (па мужу Марцынкевіч). Працавалася цяжка. Не хапала падручнікаў, ручак. Сшыткі сшывалі з мішэняў, якія засталіся ад вайскоўцаў. Чарніла рабілі з крушыны, карыстацца ім можна было некалькі дзён, пакуль не скісала.

У 1946 годзе ў Чэрцы прыехалі працаваць Пучкоўскія — Клаўдзія Іванаўна і яе муж.

Чэрская пачатковая школа лічылася школай узрастання. Пасля заканчэння пачатковых класаў дзеці заставаліся вучыцца далей на месцы. Так школа «дарасла» да сямі класаў. У 1948 годзе па накіраваннях пачалі прыязджаць настаўнікі старэйшых класаў. Дырэктарам прызначылі М. М. Вінаградскага. А ўжо ў снежні яго замяніў Анатоль Казіміравіч Завадскі — аднавясковец і цёзка даваеннага дырэктара. Пры новым кіраўніку пад школьныя класы былі прыстасаваныя яшчэ некалькі драўляных пабудоў. Будаўніцтва новай школы пачалося ў 1958 годзе. Не паспелі яе ўзвесці, як згарэў адзін з будынкаў старой. Вучыцца пачалі ў дзве змены, адначасова на грамадскіх пачатках працуючы на завяршэнні будаўніцтва.

Былая настаўніца рускай мовы і літаратуры Ягенія Іванаўна Сільвановіч распавядае пра сваю працоўную дзейнасць у школе і зусім не скардзіцца на тагачасныя ўмовы працы, калі даводзілася дома правяраць цэлыя торбы сшыткаў, выдаваць баявыя лісткі на ферме, па вечарах праводзіць палітзаняткі з механізатарамі, удзельнічаць у мастацкай самадзейнасці і выконваць хатнія справы.

1960-80-я гады былі «залатымі» для Чэрскай школы. Яе наведвалі вучні з чатырнаццаці вёсак. Аддана працавалі настаўнікі Андрэй Васільевіч і Яўгенія Іванаўна Сільвановічы, Адам Адамавіч і Алена Уладзіміраўна Ясюкевічы, Мікалай Іванавіч і Кацярына Антонаўна Машары, Паліна Андрэеўна Міхно, мая першая настаўніца Зінаіда Іванаўна Міхасенка і многія іншыя. Яны давалі сваім выхаванцам трывалыя веды.

21 год нязменным дырэктарам быў Анатоль Завадскі. Шмат чым яму абавязаны жыхары Чэрцаў. У 1969 годзе стары дырэктар саступіў месца новаму, Дзмітрыю Іванавічу Юшко, а сам узяўся выкладаць гісторыю. Пасля дырэктарам быў Сцяпан Кірылавіч Аляксандровіч.

На жаль, цяпер школа перажывае не самыя лепшыя гады свайго жыцця. Нехапае сродкаў для рамонту будынку, скарачаецца колькасць вучняў, заядаюць іншыя будзённыя праблемы. Нягледзячы на тое, настаўнікі і вучні восенню збіраюцца адзначаць восемдзесят тры гады сваёй школы. Хочацца верыць, што яна адзначыць стогадовы юбілей.

***кастрычнік 2001 г.***

## Аношкаўскае ці Оч?

Успякотныя летнія дні да невялікага азярка, што плёскаецца хвалямі ля вёскі Аношкі, з'язджаюцца дзясяткі адпачываючых з бліжэйшых вёсак. Але мала хто ведае сапраўдную назву вадаёма. Спакон вякоў тубыльцы называюць возера Оч, яны і цяпер карыстаюцца ёй. Жыхары наваколляў ведаюць яго як Аношаўскае, такую назву падаюці і даведнікі. Вядома, так прасцей. Адкуль жа тады ўзялося слова Оч? На жаль, на гэта пытанне нават старажылы не ведаюць адказу.

Па ўсёй верагоднасці гідроніму Оч больш за тысячу гадоў. І ён мае балцкі корань. Насяляўшыя ў тыя часы наваколлі балцкія плямёны давалі рэкам і азёрам свае назвы. У нашым раёне гэта рэкі Ула і Эса. З прыходам славян назвы вадаёмаў і паселішчаў заставаліся ва ўжытку.

Озера Оч размяшчаецца ў арэоле пражывання старажытных балтаў. Да таго ж побач з Аношкамі цячэ Эса. Усё гэта дае падставы меркаваць, што менавіта папярэднікі славян далі вадаёму гэтую кароткую прыгожую назву — Оч.

***студзень 2003 г.***

# Паданне пра Гогалі

Недалёка ад вёскі Вілы ўзбоч дарогі ёсць два невялікія возеры — Вялікі і Малы Гогалі. Ад чужога вока іх захінае сасновы лес. Нетутэйшы чалавек нават і не здагадаецца, што дзесьці паблізу знаходзяцца вадаёмы.

Праз прызму стагоддзяў данесла да нас людская памяць паданне пра ўтварэнне гэтых азёр. Дзе цяпер б'ецца аб берагі вада Гогаляў, было паселішча. Мясцовы люд і цяпер знаходзіць ля вадаёмаў старадаўнія прадметы побыту.

Здалёк прыехаў у паселішча чалавек са сваёй дружынай. У вёсцы яго назвалі Чарнявым. Неяк гэты Чарнявы запрыкмеціў мясцовую прыгажуню Бярозу. Тая ж нават не заўважыла хлопца, які стаў паўсюль падпільноўваць яе.

— Ідзі за мяне замуж, — угаворваў дзяўчыну Чарнявы. — У палацы жыць будзеш, як князёўна.

— Не трэба мне твайго багацця, — адказвала Бяроза. — Кахаю я другога. За яго замуж пайду.

Чарнявы ж не супакойваўся. Аднойчы ўвечары заспеў ён прыгажуню адну ў капліцы на могілках, дзе тая малілася Богу. З усіх бакоў абступілі дзеўку хаўруснікі няўдалага жаніха, каб тая не здолела ўцячы.

— Бяроза, любая, — енчыў чужынец, — ідзі за мяне. Не пойдзеш — сілай вазьму.

Цудам дзяўчына вырвалася з рук нягоднікаў і кінулася дахаты. У той самы момант капліца пачала праваьвацца пад зямлю, заплываць балотнай тванню. Чарнявы і яго памагатыя так і не паспелі адтуль выбрацца. Вяскоўцы стаўшыя сведкамі здарэння вырашылі, што бяроза вядзьмарка, якую трэба забіць. Акружылі хату, дзе схавалася дзяўчына са сваім любым хлопцам і бацькамі, пачалі кідаць камяні, спрабавалі падпаліць будынiну, але нічога не атрымалася.

Раніцай замест хаты людзі ўбачылі прыгожае возера з празрыстай вадой — сімвалам духоўнай чысціні Бярозы. На месцы капліцы таксама ўтварылася возера значна меншых памераў.

Не пакінуў Бог без пакарання Чарнявага і яго памагатых, усяліў іх душы ў невялікія плывучыя астравы. Яны і цяпер, не знаходзячы пастаяннага прытулку, слізгаюць па воднай роўнядзі Малога Гогаля. Час ад часу збіраюцца разам, і тады скрозь шолах чароту прарываецца іх жалобны шэпт: «Бяроза, Бяроза!..»

***красавік 2003 г.***

# Велеўшчына

Вёска Велеўшчына раскінула свае сіметрычныя вуліцы паміж лясоў і балот на ўскрайку раёна. Адсюль да суседняй Чашніччыны рукой падаць. Недзе ў XIV–XV стагоддзях з'явіліся ў тутэйшых глухіх мясцінах першыя жыхары. Шукалі людзі паратунак ад розных павіннасцей. Зрэшты, паселішчы, насельніцтва якіх вызваляліся ад дзяржаўных і феадальных падаткаў і не ведала прыгону, называліся «слабоды» (паходзілі ад назоўніка «свабода»). Магчыма аналагам слабод былі назвы паселішчаў, утвораных ад слова «воля». Адсюль Волеўшчына з цягам часу трансфармавалася ў Велеўшчыну. Некаторыя старажылы ўзгадваюць нейкую старую карту. Нібыта на ёй нанесены населены пункт з назвай Волеўшчына. Але этнографы прытрымліваюцца іншай гепотэзы паходжання назвы вёскі. Так Аляксей Глушко схільны да таго, што назва Велеўшчына паходзіць ад імя язычніцкага бога Велеса, ці Волеса. Падобную версію агучыў у сваёй кнізе «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны» Эрнст Ляўкоў.

На пачатку года ў вёсцы налічвалася 136 двароў з насельніцтвам 380 чалавек. У населеным пункце ёсць школа, сельскі Дом культуры, магазін, паштовае аддзяленне. У недалёкім мінулым размяшчалася тут і кантора праўлення калгаса «Радзіма». У сакавіку бягучага года, паводле адной з мадэляў рэфармавання, гаспадарку далучылі да калгаса «Пражэктар». Тыя вяскоўцы, што засталіся працаваць у аб'яднаным сельгаспрадпрыемстве, пачалі зведваць пэўныя нязручнасці.

Кожную раніцу даводзіцца дабірацца на працу за 10 кіламетраў на цэнтральную сядзібу — у вёску Слабада, вяртацца прыцемкам, таму не застаецца часу на ўласнае падвор'е.

У мясцовай майстэрні з тэхнікі засталося тры камбайны на захоўванні і некалькі трактароў на ферме. Астатнія сельгасмашыны былі перагнаны ў Слабаду. Яшчэ год таму знайсці трактар, каб апрацаваць агарод ці прывезці дроў, праблем не было. Цяпер жа галоўным памочнікам вяскоўцаў зноў стаў не механізатар, з якім прывыклі разлічвацца «паўлітрам», а ўладальнік каня. Балазе, не ўсіх збылі ў час суцэльнай механізацыі. Нягледзячы на цяжкасці з тэхнікай, праўленне «Пражэктара» здолела выдзеліць людзям камбайны, каб зжаць сялянскія надзелы.

У розных галінах сельскай гаспадаркі, як ні дзіўна, занята толькі трэцяя частка працаздольнага насельніцтва Велеўшчыны. Невялікі працэнт складае вясковая інтэлігенцыя — настаўнікі і работнікі культуры. Астатнія — гэта працаўнікі лесу: хто рупіцца ў Цярэшкінскім лясніцтве запаведніка, хто ў лясгасе. Дарэчы, большасць леснікоў — былыя калгаснікі «Радзімы».

У асабліва цяжкім становішчы апынулася мясцовая базавая школа-сад, дзе вучацца 67 вучняў. Апошнія год-два не было ніякай дапамогі ад базавай гаспадаркі. Бульбу і тую дзецям даводзілася прыносіць з дому. Цяперашняму кіраўніцтву і ўвогуле няма ніякай справы да праблем навучальнай установы. Не звыкліся з тым, што не толькі Слабадская школа з'яўляецца падшэфнай, але і Велеўшчынская. Ды і чым дапаможаш з пустой кішэняй? Неяк летам «забыліся» забраць з раённых спаборніцтваў дзяцей, і тыя да самага вечара чакалі калгасны аўтобус. Маўляў, не нашы, не слабадскія, хай купляюць бензін, тады паедзем. Толькі дзякуючы дапамозе бацькоў і прыватнага прадпрымальніка Канстанціна Баравіка калектыў школы зрабіў касметычны рамонт у старым будынку, сваімі сіламі давёў да ладу памяшканні новай пачатковай школы. Заклапочаны настаўнікі і зніжэннем колькасці дзяцей. Справа не толькі ў тым, што нараджаць перасталі. Даўно залічылі жы-

хары Велеўшчыны сваё паселішча ў разрад неперспектыўных. Пасля вучобы моладзь стараецца ўладкавацца на працу дзесьці ў горадзе. Акрамя гэтага, пачалі пакідаць вёску тыя, хто паспеў абзавесціся гаспадаркай, нарадзіць дзяцей. За апошнія пяць год з Велеўшчыны з'ехалі адзінаццаць сем'яў, а школа не далічылася пятнаццаці вучняў. Пужае маладых вяскоўцаў перспектыва закрыцця школы. Як вядома, школа ды клуб заўсёды з'яўляліся паказчыкамі цывілізаванасці і культуры вёскі. І калі здарыцца так, што навучальную ўстанову ў бліжэйшы час зачыняць, то не вытрымае нават самы стойкі. Сабраўшы хатулі і дзяцей, з'едзе вясковец у свет шукаць лепшай долі. А пакуль кожны раз перад заканчэннем навучальнага года дырэктар і завуч падлічваюць, колькі вучняў прыйдзе ў школу першага верасня.

***кастрычнік 2003 г.***

## Пра Людчыцы і зніклую царкву

У дзяцінстве неаднойчы быў у акаляючых родныя Чэрцы населеных пунктах. Але даведацца пра іх мінулае ніяк не выпадала. І толькі цяпер, выбраўшы вольную хвіліну, спецыяльна рушыў па знаёмых мясцінах. За пяць кіламетраў ад Чэрцаў месціцца вёска Людчыцы. Завітаў да былой загадчыцы Чэрскай сельскай бібліятэкі Ніны Кашаваравай, каб даведацца, дзе жывуць мясцовыя старажылы. З ёй пайшлі да 84-гадовай Зінаіды Вячэрскай, якая распавяла пра паходжанне назвы вёскі, аб чым чула ад маці, а тая — ад бабулі.

Пры прыгонным праве ў ваколіцах пасяліўся пан. Меў ён шмат дачок. Дзяўчаты любілі гуляць у зялёных лугах, адкуль вярталіся з букетамі люцікаў. Гэтых кветак шмат расло на панскіх палях, таму і маёнтак назвалі — Люцікі, пазней — Людчыцы.

Ці кветкі дапамаглі сфарміравацца назве вёскі, пытанне спрэчнае. Дакладна ж вядома, што багаты чалавек сапраўды жыў у гэтых мясцінах. Захаваліся падмуркі ад панскай сядзібы

ў вёсцы Двор-Людчыцы, што побач з Людчыцамі. Апошняга пана забілі злодзеі ў 1917 годзе, але і ім не пашчасціла. Злавілі ліхадзеяў людчыцкія мужыкі і таксама забілі. Магіла аднаго з забойцаў пана да гэтага часу зарастае хмызняком недзе на мясцовых могілках. Нейкі час людзі нават баяліся хаваць нябожчыкаў побач з тым месцам.

Мікалай Карага ахвотна распавёў паданне пра знікшую царкву. Стаяла яна на высокім пагорку, злева ад дарогі, што вядзе да могілак, ды потым раптоўна знікла. Прайграў культавую будыніну ў карты поп, а раніцай ад яе і падмурка не засталося. На тым царкавішчы, адкуль адкрываюцца прыгожыя краявіды, ладкуе цяпер моладзь Купалле. Паданняў пра знікшую ці затануўшую царкву даволі шмат ходзіць не толькі на Лепельшчыне. Атаясамліваюць іх з культавымі месцамі нашых продкаў-язычнікаў. На полі, за Людчыцкімі могілкамі, яшчэ ў 70-х гадах праглядваўся шэраг курганоў. У выніку гаспадарчай дзейнасці насыпы былі знішчаны. Цяпер на тым месцы — палеткі сортавыпрабавальнай станцыі. Напрыканцы 80-х гадоў зраўнялі з зямлёй тры вялікія курганы на прымыканні да Аршанскай шашы палявой дарогі, што вядзе ў Двор-Людчыцы.

Знішчаныя помнікі археалогіі даюць падставу меркаваць, што сучаснае паселішча мае старажытнае паходжанне, якое сягае каранямі ў X — XIII стагоддзі.

***снежань 2004 г.***

# Барсукі

Вёска Барсукі мае даволі цікавую гісторыю свайго ўзнікнення. Калісьці на гэтым месцы стаялі асобныя хутары. У 1930-я гады з хутароў стварылі калгас. Першымі ў калгас уступілі Кунчэўскі Фёдар, Кунчэўскі Гаўрыла, Прывада Фёдар, Прывада Сямён, Урбан Гаўрыла, Кунчэўскі Елісей, Кунчэўскі Пракоп, Мацкевіч Сяргей, Мацкевіч Леанід, Цяліца

Юльян, Цяліца Восіп, Цяліца Кірыл. Ва ўрочышчы «Зеркала», паміж хутарамі Багдановічаў, Мацкевічаў, Кубараў, пабудавалі гаспадарчыя памяшканні. Сюды сагналі ўсю жывёлу, звезлі сельскагаспадарчую тэхніку. У асабістым карыстанні кожнага засталася адна карова і надзел зямлі з разлікам 5 сотак на душу. Першым старшынёй на непрацяглы час абралі Урбана Гаўрылу. Потым старшынямі былі Кунчэўскі Гаўрыла, Кубар Арцём, Мацкевіч Сяргей і іншыя. Справа гэта была складаная, невядомая, і старшыні мяняліся амаль кожны год.

Ва ўрочышчы «Гарадок», на беразе Бярэзінскага канала, знаходзілася Бярэзінская пачатковая школа воднікаў, у якую хадзілі дзеці з навакольных хутароў. Пасля ўтварэння калгаса школу таксама перавезлі ва ўрочышча «Зеркала».

У хуткім часе па краіне прайшла хваля раскулачвання. Закранула яна і нашу мясцовасць. Першымі, у 1932 годзе, раскулачылі і саслалі сям'ю Маліноўскага Адольфа. Зараз ад гэтага хутара засталася адна назва — Маліноўшчына, ды неглыбокія рвы на месцы каналаў, якія ўручную капаў гаспадар, каб адвесці ад поля ваду. Там, дзе калісьці расла збажына і гародніна, зараз стаіць густы лес. Пасля Маліноўскага пад раскулачванне трапілі сем'і Закрэўскага Браніслава, Буевіча Антона, Будрэвіча Вінцэся. Сям'ю Будрэвіча выслалі ў Талды-Курганскую вобласць. Вярнуліся яны ў Беларусь толькі пасля вайны.

А потым прыйшоў яшчэ адзін даволі складаны перыяд у жыцці сялян — барацьба з так званымі «ворагамі народа». Дастаткова было аднаго даноса, каб чалавека забралі, як кажуць «без суда і следства». Сярод нашых землякоў былі рэпрэсіраваны: Казлоўскі Франц Іванавіч, Куноўскі Вікенцій Лявонавіч, Куноўскі Вячаслаў Лявонавіч, Прывада Мікалай Лазаравіч, Цяліца Іосіф Францавіч, Цяліца Карл Францавіч, Цяліца Юльян Францавіч, Цяліца Антося Іосіфаўна.

Тое, што калгаснікі жылі на сваіх хутарах, часам даволі далёка адзін ад аднаго, стварала вялікія цяжкасці ў рабоце. Было вырашана звезці хутары ў адно месца. Спачатку рашылі бу-

даваццa ва ўрочышчы «Зеркала». Дзе, ужо стаялі калгасныя хлявы, загоны, была пабудавана малочная. Аднак, у 1936 годзе непадалёк пачалося будаўніцтва дарогі Лепель — Мінск, якая дала магчымасць хутарам звязацца з навакольным светам. Таму канчаткова выбралі месца бліжэй да бальшака. Тут ужо было некалькі хутароў ва ўрочышчах Папоў Кашэль, Навінкі і Лаўкі. Сюды ў 1939 годзе пачалі звазіць бліжэйшыя хутары з урочышчаў Сакол, Барок (Паўлава), Чорны Дуб, Кеста, Брусн ічны. А ў 1940 годзе звезлі астатнія хутары з урочышчаў Гарадок, Фундацыя, Барсукі і П'яная Гара. Магчыма, назва аднаго з хутароў засталася ў назве вёскі, хоць доўгі час вёску ў абыходзе называлі Варашылава, бо калгас насіў гэта імя. Сюды ж прывезлі і школу. Вёска пабудавалася трыма пасёлкамі. Кожны з іх меў сваю назву. Даволі цікавая гісторыя ўтварэння гэтых найменняў. Напрыклад, пасёлак Зорка называўся так таму, што нявесткі тут былі ў большасці з вёскі Зароўе. На другім — жылі сем'і, дзе жанчыны былі родам з вёскі Навінкі. А вось пасёлак Лыскі атрымаў назву таму, што побач расло вельмі многа алешніку. Жанчыны зразалі з яго кару і выкарыстоўвалі яе як фарбу для афарбоўкі нітак, адзення. На дрэвах заставаліся залысіны. Вось і атрымалася назва Лыскі. На пачатку вайны ў вёсцы было звыш трыццаці дамоў. Яна з'яўлялася ўжо цэнтрам аб'яднанага калгаса, у які ўваходзілі яшчэ жыхары вёсак Валова Гара і Окана. Аб'яднаны калгас стаў насіць імя Чкалава, бо гэта імя насіў калгас з вёскі Валова Гара.

У 1941 годзе большасць мужчын з вёскі былі мабілізаваныя. Многіх праводзілі з музыкай, песнямі, як на вайсковую службу. Людзі не думалі, што вайна зацягнецца надоўга. Увесь цяжар сялянскай працы лёг на плечы жанчын і старых. У 1942 годзе пачалася блакада. Хаваліся па лясах, балотах. З кары дрэў рабілі буданы, каб можна было размясціць дзяцей. Многіх немцы пазнаходзілі. Мужчын расстрэльвалі на месцы, жанчын і дзяцей сагналі ў лагер. Потым маладзейшых адпраўлялі ў Германію. З нашай вёскі адправілі Кунчэўскую Марыю, Куноўскую Марыю,

Міраповіч Праскоўю. Спадзеючыся, што іх не разлучаць, яны запісаліся на адно прозвішча Міраповіч. Дзяўчатам пашанцавала, іх выслалі ў Аўстрыю, у горад Зальцбург. Там яны працавалі ў баўэра. Усе трое выжылі і вярнуліся пасля вайны дадому. А вось мужчын шмат загінула. Пасля перамогі дахаты вярнуліся адзінкі. Сярод іх — Міраповіч Андрэй, Кунчэўскі Віктар, Быкаў Іван, Багдановіч Павел, Куноўскі Іосіф.

У час вайны вёска знаходзілася ў зоне дзеяння партызанаў. Сяляне дапамагалі партызанам: пяклі хлеб, давалі адзенне, коней. Фашысты жорстка расправіліся з вяскоўцамі. У блакаду 1943 — 1944 гадоў, перад самым прыходам Чырвонай Арміі, амаль уся вёска была спалена. Ацалелі толькі некаторыя хаты ды гаспадарчыя пабудовы, якія былі размешчаны на водшыбе. Засталося таксама цэлым памяшканне мясцовай школы. Вось у гэтых будынках і асталёўваліся жыхары, якія вярнуліся з лесу. У некаторых дамах жыло па пяць-шэсць сямей адначасова.

У памяць аб загінуўшых земляках у 1971 годзе ў цэнтры вёскі Барсукі ўзведзены помнік-скульптура воіна з аўтаматам. На помніку выбіта 71 прозвішча тых, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Вельмі цяжка вёска аднаўлялася пасля вайны. Палеткі амаль усе зараслі хмызняком. Прыходзілася ўручную вырываць кусты, карчаваць пні. Аралі на сабе. Каб было спадручней, да плуга прымацоўвалі жэрдку, за якую бралася па некалькі жанчын. Такім чынам цягалі плуг. Упрагалі таксама кароў, быкоў, якіх удалося захаваць у вайну. За насеннем хадзілі пешшу ў Лепель і Празарокі. Потым цягнулі гэтыя дарагія клункі з зернем на санках, а то і проста на плячах. У вёсцы аднавілі калгас. Старшынёй быў абраны Кунчэўскі Фёдар. Праз некаторы час яго змяніў Багдановіч Павел, потым Гардзіёнак Раман. У цэнтры сяла пабудавалі гаспадарчыя памяшканні. У 1950-я гады за прададзены лес купілі два грузавыя аўтамабілі. Працавалі на іх Кунчэўскі Міхаіл і Гардзіёнак Іван. Палі пачалі апрацоўваць

трактарамі, якія прысылалі з МТС. Пасля расфарміравання МТС калгасу выдзелілі два трактары.

У 1950-я гады ў вёсцы стварылася многа новых сем'яў. Пачалося актыўнае будаўніцтва жылля. Разам з жылымі дамамі будаваліся аб'екты сацыяльна-культурнага быту. У 1950 годзе пабудавалі клуб. У ім размясцілі таксама бібліятэку, якая да гэтага часу знаходзілася ў вёсцы Валова Гара. Быў пабудаваны магазін, бо да гэтага часу тавары прадаваліся ў лаўцы, размешчанай на кватэры. Старое памяшканне магазіна, якое знаходзілася ва ўрочышчы «П'яная Гара» на беразе Бярэзінскага канала, у вайну было спалена.

У 1957 годзе Бярэзінская пачатковая школа была ператорана ў сямігодку, а потым васьмігодку. Вучняў у школе было многа, займацца даводзілася ў дзве змены. Таму ў 1966 годзе пабудавалі новую прасторную школу. На жаль, у студзені 1967 года яна згарэла. Дзяцей на непрацяглы час размясцілі ў Домжарыцкай школе. У Барсукі перавезлі фінскі домік, які пераабсталявалі пад школу, яна праіснавала да 1975 года. Потым была пераўтворана ў пачатковую, а ў 1977 годзе наогул закрылася. Дзеці пачалі вучыцца ў Домжарыцкай СШ. Знаходзіліся яны там увесь тыдзень, жылі ў школьным інтэрнаце. Дадому прыязджалі толькі на выхадныя. У 1981 годзе калгас купіў новы аўтобус. На ім сталі вазіць дзяцей на заняткі кожны дзень.

У сувязі з вялікім жыллёвым і сацыяльным будаўніцтвам калгасна-гаспадарчыя пабудовы, якія знаходзіліся да гэтага часу ў цэнтры вёскі, прыйшлося пераносіць на новае месца. Выбралі для гэтага пустку, якая знаходзілася паміж цэнтрам сяла і пасёлкам Зорка. Тут размясцілі хлявы для кароў, коней, свінаферму, кармакухню, свірны. На беразе рэчкі пабудавалі малочную. Працавала піларама.

З 1961 года старшынёй калгаса стаў Шайтар Сцяпан Антонавіч. У бытнасць яго старшынёй, пагалоўе калгаснай жывёлы значна павялічылася. Будаваць новыя памяшканні

не было як, бо навокал знаходзілася балоцістая мясцовасць. Вырашылі зноў пераносіць ферму на новае месца. Выбралі для гэтага ўрочышча «Галяк» на водшыбе ад вёскі. Зямля тут была пясчаная, непрыгодная для земляробства. Таму і называлася месца «Галяк». Вось тут у 1967-1968 гадах пабудавалі новыя памяшканні для жывёлы. Перавезлі некалькі ранейшых будынкаў са старога месца.

У 1963 годзе ў вёску было праведзена радыё. У 1965 годзе ў дамах сялян загарэлася электрычнае святло. У 1965-66 гадах у вёсцы пачала працаваць яшчэ адна арганізацыя — Барсукоўскае лясніцтва, якое належыла Лепельскаму лясгасу. Першым ляснічым быў Рудак В., пасля яго Жарнасек Канстанцін. У 1983 годзе лясніцтва скасавалі, а матэрыяльную базу, дакументы перадалі ў Слабадское лясніцтва.

На месцы былога ўтвараецца новае лясніцтва, якое належыць Бярэзінскаму дзяржаўнаму запаведніку. Ляснічым працуе Рамановіч П. У 1991 годзе лясніцтва рэарганізавана ў паляўнічую гаспадарку. Былі створаны брыгады лесарубаў, і вялікая частка мужчын пераходзіць сюды на працу з калгаса. Кіруе гаспадаркай Ігнаценка М. М.

У 1974 годзе калгас Чкалава з цэнтрам у вёсцы Барсукі ўзначальвае Шалак Мікалай Дзям'янавіч, пры яго кіраўніцтве калгас спецыялізуецца на адкорме буйной рагатай жывёлы. Гэта дае свае вынікі. Сяло пачало багацець. Ствараюцца новыя сем'і. Узнікае жыллёвая праблема ў калгасе будуюцца жылыя дамы. У 1980-82 гадах у вёсцы ўзнікае новая вуліца. Ёй даюць назву Маладзёжная, бо селяцца тут маладыя сем'і. Адначасова ў цэнтры вёскі будуецца дзіцячы сад, у якім з 1981 года пачынаюць звінець дзіцячыя галасы. Загадчыцай дзіцячага сада працуе былая настаўніца Шайтар Елізавета Астапаўна (Еўстаф'еўна).

Пасля калгас узводзіць яшчэ адзін будынак. У ім размяшчаецца фельдшарска-акушэрскі пункт і комплексны прыёмны пункт. Загадвае ім Парфіновіч В. і Чуес В. Старое памяшканне

ФАПа аддаецца пад жыллё. У пакоі КПП размяшчаецца аддзяленне сувязі. Гэта дае магчымасць вызваліць пад жыллё яшчэ адзін дом.

У снежні 1984 года калгас узбуйняецца за лік далучэння да яго вёсак Верабкі, Бяседы, Окана. Павялічваецца колькасць пасяўных плошчаў. У калгасе з'яўляецца дойны статак. У сувязі з гэтым змяншаецца севазварот. Аднак гэта не апошнія пераўтварэнні. У 1988 годзе калгас імя Чкалава аб'ядноўваюць з калгасам «Пражэктар». Цэнтрам становіцца вёска Слабада.

У 1987-88 гадах да будынка дзіцячага сада прыбудоўваецца яшчэ адно крыло. У ім адкрываюць Барсукоўскую пачатковую школу. Кіруе ёй маладая настаўніца Яроменка А. М.

У 1990 годзе на базе былога калгаса імя Чкалава ствараецца малое аграрна-прамысловае прадпрыемства (МАПП) «Барсукі». Планавалася, што ў ім будуць развівацца падсобныя промыслы. З гэтай мэтай пачынаюць будаваць гаспадарчыя пабудовы — піўзавод, цэхі па апрацоўцы скуры, станцыю тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў (СТА). Вёска ўяўляе сабой суцэльную будаўнічую пляцоўку. Кіруе арганізацыяй Карчагін У. М. Аднак задуманае спраўдзіць не ўдалося. З 1991 года прадпрыемства зноў набывае статут калгаса. Мяняецца спецыялізацыя. Будаўніцтва замарожваецца. У 1995 годзе ў калгас вяртаецца былы кіраўнік Шалак М. Д. Аднак, пастаянныя хістанні ў розныя бакі не прайшлі бясследна. Нягледзячы на ўсе намаганні, калгас ужо не можа вярнуць былую славу. Далейшае развіццё ўсіх сфер не адбываецца. Пачынаецца сыход моладзі з вёскі, бо тут для іх няма ніякай перспектывы. У 1997–98 гадах усю тэхніку, землі, пабудовы перадаюць на баланс Лепельскага прафтэхліцэя. Былы калгас становіцца падсобнай гаспадаркай ліцэя. Людзям не стае работы, бо не кожны можа штодзень ездзіць на працу ў райцэнтр. Многія звальняюцца, едуць у іншыя месцы. У гэты час пачынае нарошчваць моц іншае прадпрыемства — эксперыментальная лесапаляўнічая гаспадарка «Барсукі». Гаспадарка знаходзіцца на балансе Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Будуецца піларама

і цэх па апрацоўцы драўніны. Ствараюцца новыя рабочыя месцы. Масцовыя жыхары становяцца работнікамі запаведніка. Частка працуе ў лесе, займаецца нарыхтоўкай драўніны. Астатнія гэтую драўніну перапрацоўваюць. Дошкі з пілармы рэалізуюцца па ўсёй рэспубліцы. Прадукцыя ідзе на экспарт.

Колькасць насельніцтва ў вёсцы паступова змяншаецца, старэе. У 1998 годзе закрываецца Барсукоўская пачатковая школа. А праз два гады і дзіцячы сад. Гэтыя ўстановы становяцца неперспектыўнымі. Тыя ж вучні, што яшчэ засталіся, наведваюць Домжарыцкую СШ на базе якой адкрываецца экалагічны ліцэй. Для дастаўкі вучняў запаведнік выдзяляе аўтобус. З 2006 года яго перадаюць у веданне аддзела адукацыі.

З сацыяльных сфер у вёсцы застаюцца працаваць магазін, аддзяленне сувязі, ФАП, клуб і бібліятэка. Па меры магчымасці яны абслугоўваюць вясковых жыхароў.

*P. S. Матэрыял падрыхтаваны пры садзейнічанні бібліятэкара Барсукоўскай сельскай бібліятэкі Доўнар Зоі Аляксандраўны*

***2008 г.***

## Пастрэжжа

Вёска Пастрэжжа ніколі не была вялікім населеным пунктам, таму знайсці звесткі ў літаратуры пра гэтае паселішча даволі складана. На вялікі жаль, людская памяць не данесла да сённяшніх дзён паданне пра паходжанне назвы вёскі. Аднак, існуе навуковая гіпотэза тлумачэння назвы паселішча. Спадзяванне толькі на этнографаў, якія з цягам часу разгадаюць сэнс паходжання назвы Пастрэжжа.

У сваім аповедзе пра гісторыю вёскі буду спасылацца на скупыя факты, якія ўдалося сабраць.

З пісьмовых крыніц вядома, што населены пункт Пастрэжжа існаваў ужо ў 1889 годзе як маёнтак Бярэзінскай воласці Барысаўскага павета. Уладальніцай гэтага маёнтка была Брынк Усціна Вільгельмаўна, дваранка па паходжанні, лютэранскага веравызнання. У яе ўласнасці мелася 300 дзесяцін зямлі.

На карце «трохвёрстцы» 1913 года вёска пазначана як фальварак *Подстрежье.* Уваходзіла ў склад Бярэзінскай воласці Барысаўскага павета.

У 1924 годзе маёнтак Пастрэжжа ў складзе Домжарыцкага сельсавета Барысаўскай акругі. На гэты час у вёсцы налічвалася 5 гаспадарак і 24 жыхары.

У пачатку 1930-х гадоў у вёсцы арганізаваны калгас «1-га мая». Першым старшынёй абраны Іван Блажэвіч.

На карце 1933 года вёска пазначана пад назвай Пастрэжцэ. У вёсцы налічвалася 14 двароў.

Не абмінула вёску і Вялікая Айчынная вайна. Размешчаная ў самым цэнтры Бярэзінскага запаведніка сярод непраходных балот і лясоў, вёска была прывабным месцам для партызан. У дакладной запісцы сакратара мінскага абкама КП (б) Б І. Ф. Клімава сакратару ЦК КП (б) Б П. К. Панамарэнка «Аб рабоце Мінскага абкама КП (б) Б» ад 15 верасня 1942 года вёска ўзгадваецца як база партызанскага атрада Рамана Дзякава.

Пазней у навакольных лясах дзейнічалі партызанскія брыгады «Жалязняка», «Дзядзькі Колі», імя Кірава. За што вёска і паплацілася ў ліпені 1943 года. У час карнай аперацыі супраць партызан «Котбус» вёска была спалена і 60 яе жыхароў загублены. З вайны не вярнулася дзевяць жыхароў Пастрэжжа.

Пасля вайны ў вёсцы нанава адбудавана 18 хат. У выніку пасляваенных адміністратыўна-тэрытарыяльных пераўтварэнняў Пастрэжжа ў складзе Домжарыцкага сельсавета ўвайшло ў склад Лепельскага раёна Віцебскай вобласці.

Узімку 1963 года землі мясцовага калгаса былі перададзены Бярэзінскаму дзяржзапаведніку.

Людзі пакрысе сталі перасяляцца ў іншыя мясціны. Працы на той час хапала, а вось дзецям даводзілася дабірацца ў школу ў Пераходцы і Домжарыцы, што стварала вялікія нязручнасці.

Афіцыйна вёска Пастрэжжа перастала існаваць у 1975 годзе.

***жнівень 2011 г.***

# Вострава

Паселішчы з назвай Востраў, Вострава, Астравы ў Беларусі сустракаюцца паўсюдна. Усе гэтыя назвы вытворныя аднаго слова *«востраў»*. Не выключэнне і назва лепельскай вёскі Вострава. Яе можна патлумачыць наступным чынам — участак сушы, акружаны вадой ці балотам, участак сушы не заняты лесам, ці поле паміж лесу.

Пра паходжанне Вострава існуе паданне. Даўным-даўно прабіраўся праз дрымучыя лясы і тванныя балоты нейкі рыцар са сваёй дружынай. Выйшлі людзі на сухое месца, менавіта туды, дзе да нядаўняга часу існавала Вострава, і засталіся жыць. А паселішча сваё так і назвалі — Вострава.

Дакументальных крыніц, якія б сведчылі аб часе ўзнікнення паселішча, няма, а, можа, пакуль яшчэ не знайшлі дапытлівыя краязнаўцы. Вядома толькі, што на пачатку XX стагоддзя вёска ўжо існавала, дакладней, не вёска, а два засценкі. Так некалі называлі невялікія паселішчы, якія знаходзіліся недалёка адзін ад другога, з аднолькавай назвай. Першы і другі называліся Вострава. У адным засценку налічвалася восем двароў, у другім — чатыры. Знаходзіліся паселішчы ў складзе Барысаўскага павета Мінскай губерні.

У 1930-я гады Вострава існавала як тры асобныя паселішчы: Востраў — 1–10 двароў, Востраў-2 — 2 двары і Востраў-3 — 9 двароў. Тады ж вёскі перададзены ў склад Лепельскага раёна Віцебскай вобласці.

Нягледзячы на тое, што асобныя часткі вёскі знаходзіліся на значнай адлегласці адна ад другой, усё ж такі жыхары кожнага Вострава адчувалі сябе аднавяскоўцамі, жыхарамі аднаго населенага пункта.

Так было да таго часу, пакуль Вострава не пакінуў апошні жыхар на пачатку XXI стагоддзя.

***жнівень 2011 г.***

# Пунты

Павел Піліпавіч, мясцовы доўгажыхар, нарадзіўся і ўсё сваё жыццё правёў у Лазовіках, ад якіх да Пунтаў рукой падаць. Таму ён добра ведаў колішніх жыхароў гэтай вёскі, з многімі працаваў у адным калгасе «Парыжская камуна». Жыхары двух суседніх вёсачак заўсёды былі ў курсе таго, што адбывалася ў суседзяў. Аліна Еўдакімаўна нарадзілася ў Пунтах у 1934 годзе. Жанчына добра памятае падзеі якія адбываліся ў вёсцы ў 1940-50-я гады, да таго часу, пакуль не з'ехала ў свет шукаць лепшую долю.

Годам раней у маім краязнаўчым нататніку ўжо быў зроблены падрабязны запіс пра Пунты і яе жыхароў. Аліна Еўдакімаўна і дзед Пашка ўзгадалі яшчэ шмат цікавых фактаў.

Паводле пісьмовых крыніц паселішча ўзгадваецца ў 1906 годзе як вёска Горкі-Пунты ў складзе Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета, у якой налічвалася 12 двароў і 100 жыхароў.

Дзед Пашка распавёў паданне аб паходжанні назвы вёскі. Раней навакольныя з Пунтамі землі належалі пану. Да панскага маёнтка, які знаходзіўся за некалькі кіламетраў у Азерцах, дабірацца па балоцістай няўдобіцы было дрэнна. Таму пабудавалі гаспадарчыя панскія пабудовы на ўскрайку ўрадлівага поля. Тут знаходзілася пуня, у якой складалі сена, абмалочвалі снапы. Адным словам, быў гаспадарчы пункт. З цягам часу там дазволілі сяліцца і работнікам. Так узнікла невялікая вёсачка, жыхары якой працавалі на панскіх палетках. За аснову назвы новага паселішча ўзялі слова «пункт». Жыхары навакольных паселішчаў утвораную вёску так і называлі — Пункт, а яе насельнікаў пунктаўцамі. Магчыма аднойчы ў афіцыйных дакументах пісар, знарок ці па няўважлівасці, прапусціў пры напісанні назвы літару «к». З таго часу вёску і завуць Пунты.

Перад Вялікай Айчыннай вайной колькасць двароў амаль не змянілася, затое жыхароў значна паболела. У кожнай хаце

было не менш чым па пяць душ. У сям'і Еўдакіма Філімонавіча і Марыі Фядосаўны Шайтараў, бацькоў Аліны Яско, было пяцёра дзяцей. Ды і ў іншых не меней.



*Еўдакім Шайтар у нямецкім палоне*

...У 1914 годзе многіх пунтаўскіх мужчын забралі на Першую сусветную вайну. Пайшоў біць немца Алінін бацька Еўдакім і яго старэйшы брат Мікалай. Мікалай склаў сваю галаву дзесьці пад Рыгай. Еўдакіму пашчасціла болей, ён застаўся жывы, але трапіў у нямецкі палон, у якім прабыў амаль чатыры гады. У палоне выжыў дзякуючы таму, што ведаў кравецкую справу. Шыў фуражкі ў фірме аўстрыйскага прадпрымальніка. Пасля ў сям'і Шайтараў доўга захоўваўся цэлы стос паштовак, дасланых Еўдакімам з далёкай Нямеччыны. Толькі некаторыя словы ў тых допісах нямецкі цэнзар замазаў чарнілямі.

***

Пасля вяртання з палону Еўдакім працягваў займацца кравецкай справай, дзякуючы чаму сям'я Шайтараў мела добры па тым часе дастатак. Працы дадалося, калі на 116-м кіламетры ў другой палове 1930-х гадоў размясціліся вайсковыя часткі. Не адзін дзясятак шынялёў перашыў ваенным Алінін бацька.

У пачатку 1930-х гадоў не мінула калектывізацыя і Пунты. Разам з Лазовікамі і Міхаловам яны ўтварылі калгас імя

Войкава. У такім складзе ён праіснаваў некалькі месяцаў. Узначальваў яго мой прадзед Піліп Маляўка. Пазней да калгаса былі далучаны Горкі. З такой назвай гаспадарка праіснавала некаторы час і пасля вайны, а затым увайшла ў склад калгаса «Парыжская камуна». У новай гаспадарцы прадзед заняў пасаду брыгадзіра.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, многія пунтаўскія мужчыны зноў вымушаны былі ўзяцца за зброю. Жыхары, што засталіся ў Пунтах, працягвалі займацца звыклай сялянскай працай. Вечарамі моладзь збіралася на танцы. Быў нават свой ансамбль. Алініна старэйшая сястра Тася іграла на балалайцы, дзядзька Іван — на скрыпцы, Карбовіч — на цымбалах, Савосцін — на гітары, прышлы прыпіснік-чужак — на гармоніку. У доўгія калядныя вечары, як і да вайны, жанілі «Цярэшку». За «бацьку» і «маці» заўсёды былі Еўдакім і Марыя Шайтары.



*Іван Шайтар. Фота 1930-х гг.*

Час ад часу ў вёску наязджалі то немцы, то народнікі. Але ніхто з вяскоўцаў ад іх не пацярпеў. З вайны ў Пунты не вярнуліся трое мужчын. Сярод загінуўшых значыцца і родны дзядзька Аліны Еўдакімаўны Іван. Па волі лёсу ён таксама, як і дзядзька Мікалай у Першую сусветную, загінуў пад Рыгай у верасні 1944 года.

Бедна жылося пасля вайны ў вёсках, таму моладзь пасталеўшы раз'язджалася па свеце. Так было і ў Пунтах. Пад канец XX стагоддзя з'ехаў адтуль апошні жыхар.

У пачатку 1950-х гадоў, скончыўшы школу, пакінула Пунты і Аліна. Праз пэўны час вярнулася на радзіму. Выйшла замуж у Лазовікі, дзе цяпер дажывае свой век. Шчымліва становіцца ў жанчыны на душы ўвосень, калі з лазовых кустоў асыпаецца долу лісце і адкрываецца краявід на старыя пунтаўскія ліпы, пад якімі калісьці стаяла бацькоўская хата, у якой прайшло яе дзяцінства.

***снежань 2011 г.***

# Ад Слабады да Аношак

Вёска Слабада Слабадскога сельсавета — адно з самых старажытных паселішчаў Лепельшчыны. Раней яна мела іншую назву — Свяда. Упершыню гэтая назва ўзгадваецца ў пісьмовых крыніцах у 1563 годзе.

Захаваліся падмуркі драўлянай царквы названай у гонар святых бяссрэбранікаў і цудатворцаў Касьмы і Даміяна. Можна меркаваць, што царква існавала ўжо ў XVI стагоддзі. Але ў 1943 годзе драўляны будынак згарэў у полымі вайны. Сёння мы можам пабачыць на гэтым месцы толькі падмуркі. У пачатку XXI стагоддзя намаганнямі вернікаў пачалася работа па аднаўленні Слабадскога прыхода. Храм знаходзіцца ў драўляным будынку, які быў пабудаваны ў пачатку XX стагоддзя. Яго таксама можна лічыць адным з помнікаў драўлянай архітэктуры, што захаваліся.

Візітнай карткай Слабады па праве можна лічыць ліпавую алею, якая была пасаджана больш за сто гадоў таму назад тагачаснымі ўладальнікамі вёскі Івановымі. Засталося каля трохсот велічных ліп, якія сваімі шатамі падпіраюць неба.

Адразу за Слабадой раўнінная мясцовасць рэзка мяняецца ўзгорыстымі краявідамі. Трэба прыкласці шмат намаганняў, каб узабрацца на высокую гару, якую ў народзе называюць Міласніца. Цікавае паданне захавалася пра гэтую гару ў народзе.

Калі ў Слабадзе не было яшчэ сваёй царквы, святар з Валосавічаў прыехаў сюды па міласціну. На зваротным шляху багата нагружаныя вазы не змаглі адолець гару. Таму частку міласціны святар прыхаваў каля дарогі. Калі на наступны дзень вярнуўся за пакінутым дабром, яго на тым месцы ўжо не было.

З Міласніцы адкрываюцца далягляды вёсак Гарадзянкі і Далікі. Збочыўшы крыху ўправа, можна патрапіць на журавінавае балота і пакаштаваць карыснай і смачнай ягады. А калі пашчасціць, то можна ўбачыць занесеную ў Чырвоную кнігу рэдкую птушку — скапу. Гэтае месца знаходзіцца пад аховай дзяржавы і мае назву заказнік «Клецішча».

Паміж вёскамі Вілы і Юшкі, недалёка ад дарогі, у гушчары маладога бору схаваліся ад чалавечага вока два невялікія лясныя азярцы — Вялікі і Малы Гогалі. Азёры атрымалі сваю назву дзякуючы птушцы Гогаль, што водзіцца ў гэтых мясцінах.

Недалёка ад Вялікага Гогаля, на пагорку заціснутым з аднаго боку забалочанай поймай ракі Палявежа, з другога тваннымі берагамі возера, знаходзіцца гарадзішча «Батарэя». Археолагі датуюць яго першым стагоддзем нашай эры. На гарадзішчы людзі не жылі пастаянна. Яно служыла ім схованкай на час ліхалеццяў. Пазней магло выкарыстоўвацца як язычніцкае капішча. Мясцовыя ж жыхары звязваюць назву гэтага помніка археалогіі з падзеямі вайны 1812 года. Нібыта на гары стаяла батарэя французскіх гармат, якая страляла па Лепелі.

Мінуўшы вёску Юшкі, у маляўнічым лясным куточку на ўзбярэжжы ракі Эса, можна крыху адпачыць і спатоліць смагу крынічнай вадой. Некалькі кіламетраў звілістай жвіроўкі, якую зусім нядаўна апранулі ў асфальт, прывядуць на бераг Верабскага канала, які з'яўляецца часткай Бярэзінскай воднай сістэмы і быў пабудаваны ў 1798–1803 гадах. Яшчэ і сёння можна пабачыць зрубы старых шлюзаў, насупраць якіх пабудавана «калавурка» — адміністрацыйны будынак канала.

Старым Барысаўскім шляхам, што некалькі стагоддзяў звязваў Лепельшчыну са старажытным горадам Барысавам

і далей трымаў свой накірунак на Мінск, можна патрапіць у вёску Велеўшчына. Сярод іншых паселішчаў сельсавета яе вылучае абрад «Жаніцьба Цярэшкі», што захаваўся да нашых дзён. Завітаўшы сюды калязднымі вечарамі, можна прыняць удзел у гэтым ігрышчы, пачаставацца самабытнымі стравамі мясцовай кухні.

Сярод гістарычных помнікаў, якіх таксама багата ў наваколлях Велеўшчыны, можна вылучыць камень Крэсла Напалеона. Памяць тутэйшых жыхароў данесла звесткі аб тым, што нібыта на гэтым камені адпачываў сам французскі імператар.

У вёсцы Аношкі, на беразе маляўнічага возера Оч, можна адпачыць у аграсядзібе «Аношкі». Значны каларыт культурнаму асяроддзю нашага рэгіёна надае фальклорны гурт «Аношкі», што аб'яднаў таленавітых жанчын, якія памятаюць і даносяць да сучаснікаў традыцыі дзядоў праз песні, абрады і звычаі.

***люты 2012 г.***



*Фальклорны гурт «Аношкі»*

# Зацяклассе

Вёска Зацяклассе мае даволі даўнюю і багатую гісторыю. Цяпер гэта невялікае паселішча з некалькіх дзясяткаў хат, якое з усіх бакоў акаляюць лясныя масівы і непраходныя балоты. Дзіўна, што нейкіх паўтара стагоддзя таму назад тут на ўсю моц віравала жыццё.

За пяць кіламетраў на поўнач ад Зацяклясся знаходзіцца возера Тэкліц, назва якога і лягла ў аснову назвы вёскі. Цікавае паданне пра гэта распавяла знаўца мясцовай гісторыі Таісія Іванаўна Казлоўская.

У даўнія часы ў Пышне жаў пан, у якога была адзіная дачка Тэкля. Закахалася дзяўчына ў прыгоннага хлопца. Але не доўга цешыліся сваімі пачуццямі маладыя. Пра тое каханне даведаўся бацька-пан, і каб пазбегнуць залішніх турбот, аддаў каханага сваёй дачкі ў царскае войска на дваццаць пяць гадоў. Не думаў пан, што гэтым накліча бяду на сваю сям'ю. У адчаі ад няспраўджаных надзей Тэкля не знайшла нічога іншага, як суняць свой боль аб растанні з любым чалавекам, наклаўшы на сябе рукі. Нядоўга думаючы, дзяўчына рынулася ў возера. З тае пары і называюць вадаём Тэкліц. Яшчэ раней за возера, у непраходныя багны, пачалі ссяляць непакорных панскім парадкам сялян і тых, хто ўжо меў правіннасць за розныя парушэнні тагачасных законаў. Так узнікла паселішча, што з цягам часу і атрымала назву Зацяклассе, што азначае, паселішча за возерам Тэкліц.

Нягледзячы на неспрыяльныя для жыцця ўмовы, з цягам часу паселішча разраслося і мела больш за трыста двароў. Аднойчы ў аднячассі вёску выкасіла малярыя. Засталіся некалькі сем'яў з прозвішчам Барадзёнкі. Яны перасяліліся ў больш спрыяльнае для жыцця месца, дзе цяпер стаіць вёска. Так гэта было ці не, можна толькі здагадвацца. Але з архіўных дакументаў вядома, што напачатаку XX стагоддзя ў вёсцы, разам з маёнткам налічвалася ўсяго сорак жыхароў. А

доказам таго, што Зацякляссе ў старажытнасці было вялікім паселішчам, з'яўляюцца значныя па плошчы вясковыя могілкі. Тут маецца вялікая колькасць каменных надмагілляў з высечанымі на іх крыжамі, а таксама рознага памеру каменныя крыжы, на адным з іх высечаны год «1882», на іншых нанесены надпісы на латыні.

Напачатку XIX стагоддзя, калі была збудавана Бярэзінская водная сістэма, навакольныя землі набылі Штромбергі.



*Пахаванне Штромбергаў у в. Зацякляссе*

Прадстаўнікі гэтага знатнага прозвішча належылі да старажытнага прыбалтыйскага роду і насілі баронскі тытул. Навапечаных уладальнікаў Зацяклясся прываблівала наяўнасць у наваколлі вялікіх лясных масіваў і магчымасць сплаву дзелавой драўніны.

З гістарычных крыніц вядома, што ўладальнікам Зацяклясся ў 1878 годзе з'яўляўся Апалінарый Штромберг, ва ўласнасці якога было 1095 дзесяцінаў зямлі. На вясковых могілках можна пабачыць родавае пахаванне колішніх уладальнікаў. Тут знайшлі свой вечны спачын пяць прадстаўнікоў знатнага дваранскага роду. Пра тое сведчаць зробленыя на польскай мове надпісы на надмагільных плітах. Апалінарый Штромберг спачыў у 1883 годзе, маючы за плячыма пяцьдзесят год.

Напачатку XX стагоддзя маёнтак Зацяклясce належыў Петуховым. У наяўнасці яны мелі двухпавярховы дом, збудаваны па праекце італьянскага архітэктара. Побач з домам была ліпавая алея, якая вяла да альтанкі, дзе гаспадары любілі частаваць гасцей чаем. Наўкола ўсё было засаджана кветкамі, разбіты вялікі сад, які вымерз зімой 1940 года. Пасля рэвалюцыі 1917 года ў панскім доме размяшчаліся школа і сельсавет. У 1943 годзе немцы мелі намер перавезці сядзібу сабе пад штаб у Гарадзец, але партызаны спалілі будыніну. Акрамя маёнтка сярод значных архітэктурных пабудоў можна вылучыць драўляную царкву Святых Апосталаў Пятра і Паўла, збудаваную ў 1896 годзе. Яна таксама не захавалася.

У памяці старажылаў засталіся добрыя ўспаміны пра апошніх уладальнікаў Зацяклясся. Асабліва паважалі вяскоўцы гаспадыню. Яна была жанчынай строгай, але справядлівай. Заўсёды дапамагала тым, у каго здаралася бяда. Дзівацтвам пані лічылі тое, што яна сама збірала грыбы, потым сама іх варыла. А грыбы брала чарвівыя. Казала: калі чарвякі не точаць грыбы, то і людзям іх нельга браць. Яшчэ больш дзіўным вяскоўцы лічылі панскага сына. Той кожную раніцу летам і зімой бегаў, рабіў зарадку ў чым маці нарадзіла.

Назаўсёды пакінулі абжытае месца зацяклескія паны напачатку 1920-х гадоў — сышлі разам з адступаючым польскім войскам. А скарбы схавалі дзесьці ў наваколлі. Ужо некалькі дзесяцігоддзяў запар пераказваюць зацяклясцы гісторыю пра тое, што, пакідаючы маёнтак, закапалі паны каштоўнасці пад адным з надмагільных камянёў Штромбергаў. Ужо ў наш час аднаго разу нехта бачыў, як ля могілак стаяў таямнічы памаранчавы аўтамабіль. Пасля чаго вяскоўцы выявілі адно з панскіх пахаванняў раскапаным. Меркавалі, нібыта гэта сын апошніх уладальнікаў вярнуўся па спадчыну бацькоў. Шукалі скарбы і мясцовыя жыхары, але безвынікова.

У першай палове XX стагоддзя вёска апынулася ў віхуры гістарычных падзей. У кастрычніку 1919 года ля Зацяклясся вялі жорсткія баі з палякамі часткі Чырвонай Арміі. Найбольш пацярпела паселішча ў гады апошняй вайны. У 1943 годзе ў наваколлях базіраваліся фарміраванні 1-й Смаленскай брыгады. За гэта немцы хацелі расстраляць усіх жыхароў вёскі, але перадумалі. Затое папалілі ўсе хаты. Год людзі жылі на астравах сярод балота. Напамінам аб тых падзеях служыць помнік і брацкая магіла ў цэнтры вёскі, дзе спачываюць некалькі дзясяткаў партызанаў і чырвонаармейцаў.

Трэба адзначыць, што родам з Зацяклясся былі бацькі вядомага тэнара Вялікага тэатра, любімага спевака Сталіна, Героя Сацыялістычнай Працы Казлоўскага Івана Сямёнавіча. Яго бацькі з'ехалі ва Украіну, пад Кіеў, дзе і нарадзіўся будучы вядомы спявак савецкай эпохі.

Пасля вайны вёска адрадзілася, да 1960 года з'яўлялася цэнтрам сельсавета, дзейнічаў калгас «Чырвоная перамога». Мелася школа-васьмігодка. З цягам часу пацягнуўся мясцовы люд бліжэй да цывілізацыі. Сведкамі былой значнасці і велічы вёскі засталіся адзінкавыя ліпы ад колішняй панскай алеі ды каменныя крыжы і пліты на могілках, што захоўваюць памяць пра тых, хто тварыў гісторыю вёскі стагоддзі таму назад.

***сакавік 2012 г.***

# На жыццёвых перакрыжаваннях

*Прайсці па жытнёваму полю,*
*Па чорнай, урадлівай раллі.*
*Пражыць сваю цяжкую долю*
*І шчасце нарэшце знайсці...*

## Дваццаць вёснаў жыцця

Спакойна слухаць аповяд гэтай жанчыны немагчыма — зацінае дыханне ком, падступіўшы да горла. Дзевятнаццаць гадоў таму Рэгіна Рыгораўна Садоўская не дачакалася з афганскай вайны сына Уладзіміра. Ад успамінаў на вачах у маці выступаюць слёзы. У сям'і Івана і Рэгіны Садоўскіх, якія жылі ў Цярэшках, адзінаццатага верасня 1965 года нарадзіўся сын Уладзімір. У яго былі яшчэ дзве сястры — старэйшая Валя і малодшая Оля. Вучыцца хлопчык пайшоў у пачатковую школу, што была ў Востраве, а затым у Велеўшчынскую васьмігодку. Былыя Валодзевы настаўніцы Надзея Антонаўна Лосева і Людміла Васільеўна Шайтар успамінаюць пра хлопчыка як пра даволі прыклад-



*Уладзімір Садоўскі*

нага і працавітага вучня. Аднакласніца Аня Дзёмка ўзгадвае, што ён вылучаўся з асяроддзя равеснікаў самастойнасцю і мэтанакіраванасцю. Не па гадах Валодзя быў дарослы. Пасля заканчэння школы У. Садоўскі вучыўся ў Лепельскім гідрамеліярацыйным тэхнікуме. Затым некаторы час працаваў па спецыяльнасці.

У лістападзе 1984 года прыйшла позва з ваенкамата. Кожны тыдзень маці дасылала сыну ў войска лісты. Наколькі хапала часу, Валодзя стараўся на іх адказваць. У адным са сваіх пасланняў дадому ён дзякаваў родным за пасылку і коратка паведамляў, што едзе ў камандзіроўку. Чытаючы тое пісьмо, бацькі нават не здагадваліся, куды едзе іх сын. Валодзя ў той самы час у складзе свайго падраздзялення быў накіраваны ў Сярэднюю Азію. Прайшоўшы кароткую падрыхтоўку і атрымаўшы вайсковую спецыяльнасць снайпера, радавы Садоўскі апынуўся ў Афганістане. Выконваючы першае заданне ў складзе спецгрупы, «Садзік», так саслужыўцы называлі Валодзю, падарваўся на міне. Дваццаць першага сакавіка 1985 года ад атрыманых ран ён памёр. Ішла дваццатая вясна жыцця, і ўсяго паўгода не дажыў хлопец да свайго юбілею. Пахавалі Уладзіміра Садоўскага на вясковых могілках у Велеўшчыне. Воіна-афганца пасмяротна ўзнагародзілі ордэнам Чырвонай Зоркі. Праз шэсць гадоў пасля гібелі сына памёр бацька. Не вытрымала сэрца перажытай трагедыі. Засталася Рэгіна Рыгораўна адна са сваёй бядой. Нядаўна перасялілася ў Велеўшчыну з выміраючых Цярэшак. Цяпер туліцца ў невялікай хаціне, якую прадаставіў сельсавет. Увесь час жанчына задаецца пытаннем: «За што загінуў яе Валодзя? Каму патрэбна была тая вайна?!» Няхай душэўныя пакуты застануцца тым, хто пасылаў нашых салдат на тую вайну. А Уладзімір Садоўскі і яшчэ семсот семдзесят беларускіх хлопцаў, заплаціўшы сваімі жыццямі, да канца выканалі інтэрнацыянальны абавязак.

***сакавік 2004 г.***

# Песенніца


Соф'я Кузьміч

З Соф'яй Пятроўнай Кузьміч пазнаёміўся сем гадоў таму ў Велеўшчынскім клубе падчас абраду «Жаніцьба Цярэшкі». З тае пары і доўжыцца наша сяброўства. Кожны раз пры сустрэчы асаблівыя пачуцці выклікаюць песні, якія гучаць у выкананні Соф'і Пятроўны і яе сяброўак з фальклорнага гурта. Прасякнуты яны самабытнасцю тутэйшых мясцін. Нездарма пачутыя калісьці ад старэйшых жанчын народныя матывы, праспяваныя Соф'яй Кузьміч і іншымі жыхарамі Сталюг і Аношак, увайшлі ў кнігу З. А. Мажэйка «Песні беларускага Паазер'я». Нарадзілася Соня Дзёмка ў 1934 годзе на хутары Краснаўка непадалёку ад Сталюг. З дзяцінства самым моцным уражаннем засталася вайна. На ўсё жыццё запалі ў памяць успаміны аб тых жахлівых днях. Пасля вайны дзяўчына закончыла сямігодку ў Замошшы, восьмы клас у Слабадзе. Затым у 1953–54 гадах набывала веды ў мястэчку Волма Маладзечанскай вобласці ў сельскагаспадарчай школе па спецыяльнасці тэхнік-палявод. На гэтым вучоба скончылася. Рабочыя рукі патрэбны былі ў калгасе, ды і замуж ісці наспеў час. Дома чакаў жаніх — Сяргей Кузьміч, за якога выйшла замуж у 1955 годзе. Збудавалі ў Сталюгах хату. Нарадзілі і выправілі ў свет чаты-

рох дачок і аднаго сына. Да пенсіі працавалі Кузьмічы ў мясцовым калгасе — ён шафёрам, яна паляводам у брыгадзе.

Некалькі гадоў таму пакінуў гэты свет Сяргей Васільевіч. Дзеці, хоць і наведваюць маці даволі часта, але больш часу тая бавіць адна. Нядаўна дачка прывезла з Мінска гарэзлівага коціка Цішку, які радуе старую рознымі выбрыкамі і разганяе самоту. Па жыцці Соф'я Пятроўна аптыміст, засумаваць сабе не дае. Падтрымлівае сувязі са сваімі сяброўкамі, што жывуць у Аношках і Чорнай Лазе. Збіраюцца раз-пораз, спяваюць песні, вядуць гутаркі аб жыцці-быцці. Асаблівай нагодай для такіх вячорак з'яўляюцца народныя святы, у час якіх можна ўдосталь павесяліцца. У раёне, мабыць, няма роўных Пятроўне па выкананню частушак, якія можа спяваць не адну гадзіну. Аднойчы на конкурсе ў Віцебску без перапынку праспявала сто трыццаць сем частушак, якія сама і склала. Піша і вершы.

Куплеты пачала складаць, калі засталася адна, раней не да таго было. Піша свае вершы Соф'я Пятроўна ноччу, калі асабліва адчуваецца адзінота, і сон няйдзе. Увесь час трымае пад падушкай сшытак, каб адразу запісаць думкі, што ў галаву прыйшлі.

Я люблю деревеньку свою// Под названьем Сталюги.// Здесь берёзки так стройно стоят//И бушуют зимние вьюги.// Здесь проходит дорога домой, // По которой мы в детстве ходили,// По которой отцов, сыновей// На войну проводили.

Гэтыя радкі з верша «Деревенька», прасякнутага любоўю да сваёй вёскі і нейкім сумам па даўно пройдзеных днях. Ёсць яшчэ некалькі вершаў, прысвечаных дзецям. Але лепш за ўсё атрымліваецца пісаць частушкі — тры вучнёўскія сшыткі імі спісала. Сюжэты бярэ са штодзённага жыцця. Цяпер Соф'я Пятроўна з нецярплівасцю чакае надыходу лета. Тады да яе на пабыўку з'едуцца ўнукі, і забудуцца на пэўны час бяссонныя ночы, праведзеныя ў адзіноце.

***сакавік 2004***

# Ліквідатар



Сяргей Пшонка

Сяргей Пшонка быў адным з першых, хто прымаў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. У маі 1985 года хлопца ў дзевятнаццацігадовым узросце прызвалі ў шэрагі Савецкай Арміі. Ён радаваўся, што служыць будзе недалёка ад родных Сталюг — у Барысаве, у 80-м асобным батальёне хімічнай аховы. За год службы юнак прызвычаіўся да частых вучэбных пад'ёмаў па трывозе. Таму, калі пад раніцу 30 красавіка 1986 года іх падраздзяленне паднялі па трывозе, мала хто здзівіўся. Пра аварыю на ЧАЭС, якая здарылася 26 красавіка, тады мала хто ведаў. Хімбат тэрмінова пагрузілі ў цягнік і павезлі ў невядомым накірунку. Пра аварыю Сяргей даведаўся ад тэхніка роты, калі цягнік спыніўся на станцыі ў Мар'інай Горцы.

Палатачны лагер «хімікаў» разгарнуўся за дваццаць кіламетраў ад эпіцэнтру аварыі. Саслужыўцы Сяргея працавалі непасрэдна на самім рэактары — ачышчалі яго ад абломкаў. Потым праводзілі дэзактывацыю і дэгазацыю мясцовасці. Сяргей быў вадзіцелем, увесь тэрмін камандзіроўкі на МАЗе вазіў з Барысава патрэбныя для работы на месцы аварыі рыштунак і правіянт, таму меў невялікую магчымасць дыхаць свежым паветрам.

У кожнага салдата тэрміновай службы заўсёды быў з сабой кішэнны дазіметр, але мала тады хто звяртаў увагу, колькі радыяцыі «падхапіў». Тое, што яму пашчасціла болей, чым астатнім, Сяргей зразумеў значна пазней, калі вярнуўся са

службы, а газеты ў поўны голас загаварылі пра небяспеку, якую можа таіць чарнобыльская радыяцыя.

На пастаяннае месца дыслакацыі хімбат вярнуўся ў лістападзе 1986 года, і болей ужо салдат тэрміновай службы ў Чарнобыль не пасылалі, а набіралі мужчын з запасу, якія мелі дзяцей і дасягнулі пэўнага ўзросту.

Вярнуўся з войска Сяргей у родныя Сталюгі ў маі 1987 года. За ўдзел у ліквідацыі аварыі быў узнагароджаны медалём «Удзельніку ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС». Ільготамі, якія прадугледжваліся ліквідатарам, ніколі не карыстаўся — не лічыў патрэбным. А напамінам аб тым, што калісьці прымаў удзел у ліквідацыі адной з самых страшных аварый сучаснасці, сведчыць адпаведны запіс у ваенным білеце і адзіны здымак у «дэмбельскім» альбоме, на якім адлюстраваны чацвёрты рэактар АЭС, пашкоджаны ў час аварыі.

***красавік 2008 г.***

# Пагранічнік-інтэрнацыяналіст

Можна сказаць, што ўсё жыццё ўраджэнца Верабак Васіля Азаронка звязана з граніцай. Яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай вайны Васілёў бацька Яўген Мікалаевіч ваяваў у партызанскай брыгадзе «Чэкіст» пад кіраўніцтвам афіцэра-пагранічніка Герасіма Кірпіча. Не пакінулі абыякавымі аповеды Герасіма Кірпіча пра мужнасць герояў-пагранічнікаў у гады вайны вясковага юнака. Ён цвёрда вырашыў стаць пагранічнікам. Пасля заканчэння сярэдняй школы № 2 г. Лепеля Васіль быў прызваны на тэрміновую службу ў пагранічныя войскі, служыў на савецка-кітайскай мяжы. У 1967 годзе пасля вучобы ў школе малодшых лейтэнантаў, быў накіраваны намеснікам начальніка заставы ў Амурскую вобласць. Затым скончыў Далёкаўсходняе вышэйшае каманднае вучылішча — прызначылі начальнікам заставы. З 1974 па 1977 гады кур'ер


Васіль Азаронак

спецаховы пасольства СССР у Турцыі, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пасля вяртання з-за мяжы зноў служыў начальнікам заставы на Далёкім Усходзе.

Першы раз у Афганістане Васілю Азаронку давялося пабываць у 1984 годзе, тады яго камандзіроўка цягнулася ўсяго сорак пяць дзён. Манеўровая група, начальнікам якой быў Васіль, выконвала баявую задачу па ахове газаправоду. Чарговы раз трапіў у Афганістан у 1986 годзе, тады камандзіроўка зацягнулася на дзесяць месяцаў. У Афганістане пагранічнікі выконвалі свае звыклыя функцыі — прыкрывалі дзяржаўную мяжу СССР ад прарыву банд, а таксама трымалі пад кантролем караванны шлях, па якому маджахеды перапраўлялі з Ірана ў Афганістан зброю. Мотаманеўровую групу, у якой Васіль быў начальнікам штаба, выкінулі высока ў гарах. Давялося абжывацца па суседству з «духамі», колькасць якіх, па дадзеных разведкі, даходзіла да двух тысяч, а падраздзяленне пагранічнікаў налічвала ўсяго восемдзесят чалавек. Спачатку маджахеды вельмі інтэнсіўна абстрэльвалі пазіцыі пагранічнікаў, тыя адказвалі рэдкімі стрэламі з аўтаматычнай зброі і мінамётаў — адчуваўся недахоп боепрыпасаў, якія дастаўлялі верталётамі. У хуткім часе сітуацыя памянялася на карысць пагранічнікаў, была добра наладжана дастаўка боепрыпасаў, правільна выбраная пазіцыя дазваляла трымаць сітуацыю пад кантролем. Цяпер «духі» турбавалі савецкіх воінаў толькі ноччу, але іхнія абстрэлы шкоды наносілі мала, бо пазіцыі «зялёных фуражак» размяшчаліся на васемсот метраў

вышэй у гарах. Васіль успамінае адзін выпадак, калі «духі» ў іхнім раёне вырашылі пераправіць вялікі караван са зброяй, але пагранічнікі заміналі ім гэта зрабіць. Ноччу маджахеды пайшлі на штурм пагранічных пазіцый, але ў апошніх было ўсё гатова для сустрэчы «гасцей». На поўную моц запрацавала батарэя мінамётаў, паляцелі ў ворага ручныя гранаты — нападзенне было адбіта, ніводзін пагранічнік у баі не загінуў і нават не быў паранены. Дарэчы, за ўсе дзесяць месяцаў знаходжання ў гарах ніводзін салдат з мотаманеўровай групы не загінуў.

За выкананне інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане Васіль Азаронак быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і медалём «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы СССР». У адстаўку выйшаў у званні маёра ў 1991 годзе, некалькі гадоў таму вярнуўся на пастаяннае месца жыхарства з Расіі ў Беларусь. Зараз жыве ў горадзе Жодзіна, але не забывае сваёй малой радзімы — у Верабках бывае на працягу года не адзін раз.

У Васіля не толькі ўсё жыццё звязана з граніцай, але і ўсю яго сям'ю можна назваць пагранічнай. Старэйшы сын Вадзім пайшоў па бацькавых слядах, ён афіцэр ФСБ Расіі, паспеў павајаваць у Чачні. Зяць Аляксандр тэрміновую таксама служыў у пагранічных войсках. У Мінскім сувораўскім вучылішчы вучыцца ўнук Канстанцін, які ўжо прымервае дзядулеў кіцель з баявымі ўзнагародамі.

***студзень 2009 г.***

# БТР успыхнуў, нібы факел...

Праз гарніла афганскай вайны прайшло каля двух дзясяткаў хлопцаў з вёсак Слабадскога сельсавета. Пыцько Аляксей быў першым, хто трапіў на тую вайну.

Нарадзіўся Пыцько Аляксей 12 лютага 1961 года ў Велеўшчыне. Бацька Міхаіл Якаўлевіч і маці Ніна Маркаўна працавалі ў калгасе «Радзіма». Акрамя Аляксея, у сям'і Пыцько гадавалася яшчэ двое сыноў — старэйшы Міхаіл і малод-

шы Васіль. Аляксей рос хлопцам кампанейскім, яго паважалі за адкрытасць і дабрыню.



*Аляксей Пыцько*

У 1967 годзе Лёшка пайшоў вучыцца ў першы клас Велеўшчынскай васьмігадовай школы. У сярэдзіне 1970-х гадоў сям'я Пыцько пераязджае жыць у Гадзіўлю, невялікую вёску за тры кіламетры ад Велеўшчыны. У 1976 годзе Аляксей працягвае вучобу ў Слабадской сярэдняй школе, пасля заканчэння якой у 1978 годзе паступае вучыцца ў Лепельскую аўташколу ДТСААФ. З 28 жніўня па 15 снежня 1978 года ён навучаецца па праграме падрыхтоўкі вадзіцеляў транспартных сродкаў катэгорыі «С».

11 красавіка 1979 года Аляксей быў прызваны Лепельскім райваенкаматам на тэрміновую службу ў шэрагі Савецкай Арміі. Яго накіравалі для праходжання службы ў Венгрыю, дзе ён удасканальваў навыкі сваёй грамадзянскай спецыяльнасці вадзіцеля. З Венгрыі бацькі атрымлівалі не частыя і скупыя на словы пасланні, і раптам хлопец перастаў дасылаць дадому аб сабе весткі. Толькі праз ваенкамат маці змагла даведацца, дзе знаходзіцца яе сын і тое, што з ім усё добра. Лаканічны, казённы адказ ваенных начальнікаў не мог супакоіць бацькоў. На працягу ўсёй далейшай службы яны баяліся, каб з іх сынам не здарылася бяда.

У той самы час, калі бацькі губляліся ў здагадках і абівалі ганкі ваенкамата, Аляксей адпраўляўся з Венгрыі ў Афганістан. 2 лютага 1980 года ў складзе свайго падраздзялення ён апынуўся ў гэтай азіяцкай краіне, дзе ішла вайна і

гінулі нашы хлопцы. А ён, як і іншыя, не мог адразу паведаміць бацькам, дзе знаходзіцца.

У Афганістане Аляксей служыў вадзіцелем БТРа. Суправаджаў калоны з грузамі па горных дарогах. У час аднаго баявога задання бронетранспарцёр Аляксея падбілі, сам ён цудам застаўся жывы. Паспеў выхапіць з палаючай машыны аўтамат, а ваенны білет і іншыя дакументы згарэлі. Пасля гэтага выпадку хлопец лячыўся ў шпіталі — падчас бою быў кантужаны.

Год і пяць месяцаў быў на мяжы жыцця і смерці. Яму пашчасціла вярнуцца дадому жывым і здаровым. Пасля гэтага ў ваенным білеце Аляксея з'явіўся запіс наступнага зместу: «З 02.02.1980 г. па 06.07.1981 г. аказваў інтэрнацыянальную дапамогу народу ДРА.»

Пасля войска трэба было ўцягвацца ў мірнае жыццё, пастарацца забыць усе жахі, якія прыйшлося перажыць на вайне. Але ўсё ж вайна давала аб сабе ведаць. Аляксей, і так гарачы па сваёй натуры, станавіўся ў пэўныя хвіліны проста адчайным. Не мог спакойна глядзець, як крыўдзілі слабейшага, лічыў сваім гонарам абараніць яго. Мог на злом галавы кінуцца ў бойку з некалькімі крыўдзіцелямі. Першым не лез, але ва ўсёй акрузе яго баяліся і паважалі.

Не мог ён забыцца на тую праклятую вайну, ды яшчэ сябры лезлі з роспытамі. Мог нешта расказаць, але каб выхваляцца перад хлопцамі, такога не было.

Вярнуўшыся з Афганістана Аляксей адразу ўладкаваўся на працу ў Лепельскі лясгас вадзіцелям. Праз пэўны час кіраўніцтва калгаса «Радзіма» перацягнула хлопца да сябе. У калгасе былому воіну-афганцу далі новы ГАЗ-53.

...Позняй восенню 1989 года Аляксей трапіў у аўтамабільную аварыю. Недалёка ад Велеўшчыны не справіўся з кіраваннем свайго «ГАЗона», машына звалілася ў кювет. Ад атрыманых траўм Аляксей памёр на месцы дарожнага здарэння.

***люты 2010 г.***

# Адданасць прафесіі



Ганна Падабед

У дзяцінстве Аня Шапавалава нават і не задумвалася, што стане медыкам, ды не проста медыкам, а ветэрынарным урачом. Пасля заканчэння ў 1973 годзе Слабадской сярэдняй школы спрабавала паступаць на агранома, нават экзамены здала на выдатна. Але лёс распарадзіўся інакш. Параілі добрыя людзі дзяўчыне паступаць на ветурача, тая згадзілася. Тры гады вучобы ў Лужаснянскім сельгастэхнікуме праляцелі хутка. Аня з лёгкасцю авалодала выбранай прафесіяй — вучылася з ахвотай, старанна асвойвала тэарэтычныя і практычныя веды «звярынай медыцыны». Атрымаўшы дыплом ветэрынарнага фельчара, стала працаваць у калгасе «Радзіма», які знаходзіўся непадалёк ад роднай Слабады. Спачатку на працу дабіралася на аўтобусе, потым жыла на кватэры. У хуткім часе дзяўчыну запрыкмеціў мясцовы хлопец Алесь Падабед. Маладыя людзі стварылі сям'ю — пабудавалі ўласны дом, выгадавалі трох сыноў.

Неаднаразова Ганне Пятроўне прапаноўвалі пасаду ветурача ў лепельскай лячэбніцы, але кінуць наладжаны быт і любімую, хоць і цяжкую працу неяк не рашалася. Гарадскія даброты не надта прываблівалі жанчыну, хацелася адчуваць сябе сапраўднай гаспадыняй на ўласным падворку. Нават трохпакаёвую кватэру з усімі зручнасцямі, што выдзеліў маладой сям'і калгас, змянілі на ўласны дом.

У 1988 годзе жанчына заняла ў калгасе «Радзіма» пасаду галоўнага ветурача. Абслугоўваць даводзілася ста-

так у паўтары тысячы кароў на чатырох фермах, якія былі раскінуты па навакольных вёсках. Зімой, калі дарогу замятала снегам, да аддаленых фермаў у Аношках і Востраве даводзілася дабірацца на кані.

З 2003 года, калі калгас «Радзіма» аб'ядналі з «Пражэктарам» працы прыбавілася. На сённяшні дзень Ганна Пятроўна сочыць за здароўем рагатых пацыентаў на чатырох фермах сельгаспрадпрыемства «Пражэктар» — у Велеўшчыне, Даліках, Свядзіцы і Слабадзе. Адным словам, працы хапае, асабліва са студзеня па сакавік, калі пачынаюцца масавыя ацёлы кароў. Звяртаюцца са сваімі клопатамі да ветурача таксама і вяскоўцы, якія трымаюць на сваіх падворках жывёлу. Нікому не адмаўляе ў дапамозе Ганна Пятроўна.

З любоўю і павагай ставіцца жанчына да сваёй працы. І днём і ноччу, калі трэба, спяшаецца да каровак, шчыра радуецца, калі хворыя жывёлы ідуць на папраўку, ці з'яўляюцца на свет здаровенькія цялятк. За трыццаць чатыры гады працы ветурачом Ганна Пятроўна ні на хвіліну не пашкадавала аб тым, што калісьці маладой дзяўчынкай выбрала гэтую клопатную прафесію.

***люты 2010 г.***

## У шэрагу першых

Нямала нашых землякоў адзначана дзяржаўнымі ўзнагародамі. Аляксандр Падабед быў у шэрагу першых, чые працоўныя заслугі дастойна ацаніла маладая беларуская дзяржава. 3 мая 1999 года ён атрымаў з рук Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі медаль «За працоўныя заслугі», да яго такой узнагароды ўдастойваліся ўсяго дваццаць сем чалавек.

Нарадзіўся Аляксандр у в. Велеўшчына ў 1961 годзе. Скончыўшы Велеўшчынскую васьмігодку, Слабадскую сярэднюю школу, хлопец рана вылецеў з бацькоўскага гнязда. Вучыўся на чыгуначніка, служыў у войску. Набытыя веды сталі трывалым падмуркам будучай прафесіі маладога чалавека,



Аляксандр Падабед

дапамаглі правільна выбраць свой працоўны шлях. Вось ужо дваццаць восем гадоў Аляксандр працуе ў Мінску на прадпрыемстве «Белкамунмаш» слесарам-электрыкам па наладцы і запуску тралейбусаў.

На пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя белкамунмашаўцы стаялі ля вытокаў стварэння ўласнага тралейбуса. Немалы ўнёсак у агульную справу зрабіў і наш зямляк, за што і быў узнагароджаны медалём. Зараз наш тралейбус нічым не саступае сусветным аналагам вядучых вытворцаў гэтага эканамічнага і экалагічна чыстага віду транспарту. Францыя, Германія, Аўстрыя, краіны СНД і Балтыі — тут часта бывае ў працоўных камандзіроўках Аляксандр Падабед, даводзіць да ладу электронную тэхніку.

Нягледзячы на занятасць, Аляксандр часта наведвае ў Лепелі сваіх бацькоў, якія па праву ганарацца сваім сынам. Не сорамна за сына бацьку Мікалаю Восіпавічу. У 1969 годзе ён за высокія паказчыкі па вырошчванні бульбы быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». А цяпер і сын адзначаны высокай дзяржаўнай узнагародай — таксама за працоўныя заслугі.

***жнівень 2010 г.***

## У гарачым небе Афганістана і Чарнобыля

Не забываецца на родныя мясціны кавелер двух ордэнаў Чырвонай Зоркі Пётар Раманенка. Не вельмі часта, але наведваецца ў Далікі, дзе прайшлі дзіцячыя гады, адкуль з



*Пётр Раманенка*

бацькоўскага гнязда вылецеў у вялікі свет.

Дарогу ў дарослае жыццё хлопцу дала Свядская сярэдняя школа. У час вучобы будаваў планы на будучыню. Але ні як не мог і падумаць, што далейшы лёс будзе звязаны з войскам. Тым больш, не думаў, што будзе лётчыкам.

Пасля заканчэння вучылішча ў ваенкамаце прапанавалі вывучыцца на верталётчыка. Адмаўляцца не стаў. Не гожа было яму, вясковаму хлопцу, пасаваць перад цяжкасцямі.

Верталётнай справе вучыўся ў віцебскім аэраклубе, які ў савецкія часы лічыўся, бадай, галоўнай кузняй верталётных кадраў. У Пясчанцы, галоўнай вучэбнай базе віцебскага аэраклуба, Пётр налятаў 60 гадзін. Яшчэ 30 гадзін на курсах у Актарску Саратаўскай вобласці, дзе давалі яшчэ дадатковыя навыкі па ваеннай спецыяльнасці.

У 1971 годзе лейтэнант Раманенка прыступіў да службы. Восем гадоў малады афіцэр адточваў вайсковыя навыкі на Далёкім Усходзе. Потым службовы лёс закінуў яго ў Венгрыю, дзе служыў яшчэ тры гады.

Увесну 1984 года ў частку прыйшоў загад падрыхтаваць эскадрыллю верталётчыкаў для адпраўкі ў Афганістан. У складзе эскадрыллі было і звяно, якім камандаваў капітан Раманенка.

Спачатку пілотаў перавялі ў Адэсскую ваенную акругу, на аэрадром Булык. Потым — на тры месяцы, на практыку ў Каган, што пад Ташкентам. Пасля падрыхтоўкі на кароткі час вярнулі ў Адэскую акругу, і ў жніўні 1984 года эскадрыллю перакінулі ў Афганістан.

***

Верталётная часць размяшчалася ў горадзе Кундуз на поўначы Афганістана. Непадалёк ад савецка-афганскай мяжы. Пасля першых баявых вылетаў, шоку ад першых абстрэлаў, пачаліся цяжкія, суровыя баявыя будні. Лёталі верталётчыкі на машынах МІ-8.

Ва ўмовах горнага Афганістана, калі асноўныя баявыя дзеянні вяліся на вышыні і поспех іх залежыў ад своечасовай падтрымкі з паветра, наяўнасць верталётаў, іх неацэнныя якасці станавіліся гарантыяй перамогі. Душманы за верталётамі натуральна палявалі, бо за кожную збітую вінтакрылую машыну плацілі немалыя грошы. Не абышлося без стратаў і ў звяне Пятра Раманенкі, «Сцінгерам» быў падбіты яго вядомы, толькі паспеў пачуць у навушніках:»Жэню падбілі! Ён гарыць!» На схіле гары знайшлі толькі абломкі ды некалькі абвугленых целаў.

Першы ордэн Чырвонай Зоркі... Увечары прыйшоў загад вылецець на дальнюю кропку ў цясніну А-уну. Забраць двух параненых салдатаў і аднаго забітага. Вылецелі яны ўдвух з Жэнем, ён тады яшчэ быў жывы. Пакуль прыляцелі, ужо сцямнела. Не паспелі загрузіць параненых і забітага, як пачаўся жорсткі абстрэл. Камандзір кропкі катэгарычна забараніў вылет, бо на ўзлёце верталёты могуць падбіць. Машына амаль безабаронная, пакуль не набярэ вышыню і хуткасць. Пётр аператыўна па радыё звязаўся з камандаваннем у Кабуле, тыя далі дабро на ўзлёт, які прайшоў удала. Узляталі верталётчыкі ў поўнай цемры, якая толькі зрэдку падсвечвалася ракетамі ды трасіруючымі кулямі. На развітанне авіятары шарахнулі ракетамі па гарах, дзе заселі баевікі.

Дзясяткі баявых вылетаў і кожны раз рызыкуеш жыццём, сваім і баявых паплечнікаў. Адзін з баявых эпізодаў Пётр Сілівеевіч узгадвае падчас нашай гутаркі. Ішла па гарах група дэсантнікаў ужо не першы дзень. Незадоўга да гэтага быў бой,

з'явіліся параненыя і забітыя, але група нікога не пакінула, усіх неслі на сабе. Камандзір дэсантнай дывізіі асабіста звярнуўся да верталётчыкаў, каб эвакуіраваць падначаленых. Вызваўся нават сам ляцець. Пляцоўка для прызямлення знаходзілася на вышыні каля трох тысяч метраў над узроўнем мора (межавая для МІ-8), у цясніне, затуленай стомятровымі скаламі. Падляцелі, апрацавалі ракетамі бліжэйшыя горы, каб баевікі знянацку не накрылі ракетамі. Пётр сеў, а вядомы застаўся баражыраваць у паветры, прыкрываць. Загрузілі параненых і забітых, пачалі ўзлятаць. Ды мала таго, што машына загружаная і вышыня вялікая — яшчэ і рухавік у ёй на той час быў слабаваты, не хапала магутнасці. Яшчэ адзін верталётны нюанс — узлятаць лепей пры сустрэчным ветры, таму Пётр развярнуўся на вузенькім пятачку паміж скаламі і паціху павёў верталёт уперад, раз-пораз закранаючы пярэднімі коламі вялікія камяні. Вось так, пераскокваючы з каменя на камень, лавіруючы між скал, МІ-8 узляцеў. Як набралі вышыню метраў сто, Пётр перадаў кіраванне штурману Мікалаю, а сам папрасіў закурыць. Камандзір дэсантнай дывізіі працягвае цыгарэту, а пілот не можа яе ўзяць — рукі ад перажытага толькі што напружання калоцяцца. За гэту аперацыю Пятру Раманенку датэрмінова прысвоілі званне маёра.

***

Пётр Раманенка з баявымі сябрамі вярнуліся ў Саюз у лістападзе 1985 года. Грымнуў чорны красавік 1986-га, Чарнобыль. З першага мая маёр Раманенка са сваім звяном удзельнічаў у тушэнні аварыйнага рэактара. Лётаючы над ім скідвалі ў жэрала спецыяльную сумесь, якая тармазіла рэакцыю, змяншала выкіды. Колькі рэнтгенаў ён атрымаў у тыя дні, ні адзін прафесар медыцыны так дакладна і не сказаў — шмат. Зараз ужо многіх саслужыўцаў няма ў жывых. За Чарнобыль маёр Раманенка ўзнагароджаны другім ордэнам Чырвонай Зоркі.

Да звальнення ў запас даслужваў у Малдове. Калі пачалася грамадзянская вайна ў Прыднястроўі, Пётр быў ужо пенсіянерам. Зараз жыве ў Ціраспалі, зрэдку прыязджае на малую радзіму.

***студзень 2011 г.***

# ...Не поле перайсці

У народзе кажуць:»Жыццё пражыць, не поле перайсці, удвая лягчэй удвух па ім ісці». Вось ужо шэсцьдзесят пяць год крочаць па жыцці разам Пётр Ягоравіч і Адзіяда Іванаўна Марцінкевічы з Домжарыцаў. Можна сказаць, што Пётар і Адзіяда ведаюць адзін аднаго ўсё сваё свядомае жыццё. Спачатку хадзілі ў адзін клас Ляхавіцкай школы, якую скончылі перад самай Вялікай Айчыннай вайной. З першых месяцаў вайны Пётр стаў падпольшчыкам — выконваў розныя даручэнні партызанскага кіраўніцтва брыгады «Дубава». Затым быў прызначаны камандзірам аддзялення чатырнацатага атрада гэтай брыгады. Не заставалася ў баку і Адзіяда, разам з сяброўкамі сабрала і перадала партызанам чатырнаццаць вінтовак, выконвала абавязкі партызанскай сувязной. У хаце Адзіядзіных бацькоў у Ляхавічах працяглы час размяшчаўся штаб брыгады «Дубава». У студзені 1944 года дзяўчына была залічана ў гаспадарчы ўзвод — шыла і мыла адзенне, працавала на кухні, выконвала шэраг гаспадарчых работ.

Менавіта ў гады вайны маладыя людзі зразумелі, што не могуць жыць адзін без аднога. Але напоўненае штодзённай рызыкай жыццё не давала праявіцца пачуццям у поўнай меры. Неаднаразова за гады партызанства Пётр быў на валасок ад смерці, але нейкая звышнатуральная сіла ратавала яго ад немінучай гібелі. Толькі ўлетку 1944 года зранены, але жывы вярнуўся хлопец у родную вёску Каранеўку, што была недалёка ад Ляхавічаў, і адразу падаўся да любай дзяўчыны, якая чакала яго. Пажаніліся маладыя ў 1946 годзе. Каб ужо

больш ніколі не расставацца ў гэтым жыцці. Разам працавалі ў Ляхавіцкай школе, яна ў пачатковых класах, ён — настаўнікам хіміі і біялогіі, затым завучам і дырэктарам гэтай школы. У 1975 годзе Пётр Ягоравіч узначаліў калектыў Домжарыцкай сярэдняй школы, і зноў побач з ім яго дарагая сяброўка Адзіяда Іванаўна.



*Пётр і Адзіяда Марцінкевічы*

Марцінкевічы пражылі доўгае і шчаслівае жыццё, маюць двух сыноў. У летнія месяцы іхняя хата напаўняецца гоманам унукаў і праўнукаў. Нельга сказаць, што ўсё ў жыцці Марцінкевічам давалася лёгка, але ўдвая лягчэй па жыцці ісці разам. Разам яны ўжо сёмы дзясятак.

***верасень 2011 г.***

# Шлях да Зоркі Героя


Іван Янкоўскі

Некалькі гадоў таму свята адзначалі жыхары неіснуючай цяпер вёскі Забаенне Домжарыцкага сельсавета. Нават вяліся спрэчкі, а ці была ўвогуле такая вёска ў Лепельскім раёне. Была. На Лепельшчыне і цяпер нямногія ведаюць, што ў гэтай невялікай вёсачцы ў нетрах Бярэзінскага запаведніка ў 1924 годзе нарадзіўся наш славуты зямляк — Герой Сацыялістычнай Працы Янкоўскі Іван Дзмітрыевіч. Цярністы і звілісты шлях прайшоў ён да сваёй Зоркі Героя.

Прырода шчодра надзяліла Івана розумам і ведамі. Яму не склала ніякіх цяжкасцяў у 1939 годзе скончыць Слабадскую няпоўную сярэднюю школу. Пасля была вучоба ў фабрычна-завадскім вучылішчы ў Мінску на бетоншчыка, праца ў Лідзе на будаўніцтве ваеннага аэрадрома, мара вучыцца далей. Але ўсе планы парушыла вайна. Іван вымушаны быў вярнуцца ў родную вёску. Пасля таго, як у навакольных лясах з'явіліся партызаны, хлопец добраахвотна, прыхапіўшы з сабой вінтоўку, падаўся ў лес, у брыгаду «Жалязняк». У баях з фашыстамі ў 1943 годзе быў цяжка паранены і кантужаны. Але малады арганізм прагнуў жыцця. Падняўшыся на ногі, працягваў змагацца з ворагам. За смеласць і рашучасць у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў тыле быў узнагароджаны медалямі «За адвагу» і «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

Пасля вызвалення Беларусі Іван Янкоўскі скончыў шэраг курсаў пры ЦК КПБ і СНК БССР і быў накіраваны на працу па

партыйнай лініі ў Брэсцкую вобласць. У 1947 годзе на непрацяглы час вяртаецца на Лепельшчыну, дзе працуе на пасадзе старшыні Домжарыцкага сяльпо.

З 1948 па 1955 год працаваў на розных партыйных і гаспадар-чых пасадах у Давыд-Гарадоцкім раёне Брэсцкай вобласці. У той час адстаючай галіной эканомікі заставалася сельская гаспадарка. Тут адчуваўся не толькі недахоп матэрыяльных сродкаў, але і маладых ініцыятыўных кадраў, здольных узваліць на сябе цяжар адказнасці на самым складаным участку. Таму ў красавіку 1955 года маладога, ініцыятыўнага камуніста Івана Янкоўскага, які з дзяцінства ведаў кошт цяжкай сялянскай працы, у складзе «трыццацітысячнікаў» накіроўваюць старшынёй калгаса «17-га верасня». У 1958 годзе за высокія паказчыкі ў вытворчасці сельгаспрадукцыі ён быў узнагароджаны ордэнам Леніна і прэміраваны аўтамабілем «Победа». А калгас з адстаючага выйшаў на лідзіруючыя ролі не толькі ў раёне, але і ў вобласці. Перадавы вопыт маладога старшыні калгаса і яго падначаленых шырока асвятляўся ў той час у перыядычным друку, на радыё і тэлебачанні.

Першыя ўдалыя поспехі на пасадзе кіраўніка калгаса не ўскружылі галаву Івану Дзмітрыевічу. Не той быў час, не тая была эпоха. З яшчэ большым імпэтам узяўся ён за справу, калі ў 1959 годзе даверылі кіраўніцтва адным з самых адстаючых калгасаў Столінскага раёна «40 год Кастрычніка». У «спадчыну» дасталася запазычанасць дзяржаве і калгаснікам паўтара мільёна рублёў, нізкія ўраджаі ўсіх культур, недахоп тэхнікі. Трыццаць чатыры гады жыцця аддаў гэтаму калгасу Іван Дзмітрыевіч. Як і папярэдні калгас, вывеў у шэраг перадавых. Імя Янкоўскага зноў загучала на ўсю Беларусь. З цягам часу гаспадарка стала перадавой школай вопыту па ўсіх паказчыках. Вялікая роля ў гэтым, на думку Івана Дзмітрыевіча, належала кадрам, якія ён старанна падбіраў. Ва ўсе сферы вытворчасці ўкараняўся самы перадавы вопыт гаспадарання. Вынік не прымусіў сябе доўга чакаць. За высокія

паказчыкі ў вытворчасці бульбы, агародніны і садавіны Указам Прэзідыўма Вярхоўнага савета СССР ад 30 красавіка 1966 года Івану Дзмітрыевічу было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

На працягу ўсяго свайго гаспадарання Іван Дзмітрыевіч дбаў не толькі аб высокіх вытворчых паказчыках, але і клапаціўся аб тых, хто працаваў на зямлі. Яшчэ напачатку сваёй працоўнай дзейнасці ў якасці старшыні калгаса ён зразумеў, што толькі стварыўшы адпаведныя бытавыя ўмовы можна затрымаць на зямлі селяніна. На сродкі калгаса ў вёсцы Альшаны была ўзведзена школа больш чым на тысячу месцаў, дзіцячы садок на сто месцаў, Дом культуры, лазня, амбулаторыя, шэраг іншых гаспадарчых пабудоў.

Яшчэ не аднойчы, на працягу працоўнай дзейнасці Іван Дзмітрыевіч быў адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі, сярод якіх ордэны Кастрычніцкай рэвалюцыі, Знак Пашаны.

Хочацца спадзявацца на тое, што імя Івана Дмітрыевіча Янкоўскага будзе належным чынам ушанавана на Лепельшчыне і зойме пачэснае месца ў шэрагу нашых знакамітых землякоў.

***студзень 2012 г.***

# Станіслаў Блажэвіч

Прысвяціўшы ўсё жыццё лесу, ён не забываўся пра гісторыю свайго краю. Як умеў, даносіў да сучаснікаў падзеі мінулага. Маючы ад прыроды добрую памяць, мог гадзінамі падрабязна распавядаць, што адбывалася раней. Ён быў даволі апантаным чалавекам. Сваёй жыццёвай энергіяй, ідэямі зараджаў навакольных настолькі, што тыя з ахвотай браліся за выкананне задуманага Станіславам Іванавічам. Не пабаюся сказаць гэтага слова, ён быў Краязнаўцам з вялікай літары.

Станіслаў Іванавіч Блажэвіч нарадзіўся ў 1933 годзе ў вёсцы Пастрэжжа, што ў самых нетрах Бярэзінскага запаведніка. Ён зведаў на сабе ўсе цяжкасці гістарычнай эпохі, у якой давяло-

ся нарадзіцца. У 1930-я гады бацька быў рэпрэсіраваны, неўзабаве пачалася Другая сусветная вайна. У віхуры вайны бацька заўчасна згінуў. Затым было паўгалоднае пасляваеннае існаванне, калі маці адной даводзілася падымаць на ногі пяцярых сыноў.


Станіслаў Блажэвіч

Сваё дзяцінства і юначыя гады Стась правёў сярод дрымучых бароў і багністых балот запаведніка, мабыць таму і далейшы яго лёс быў звязаны з лесам. У 1952 годзе падаўся ў здымшчыкі жывіцы. Але рамантычнаму хлопцу не падабалася яго прафесія. Ён прагнуў ахоўваць лес, а не нішчыць яго. Добра памятаў пачутае яшчэ ў дзяцінстве ад дарослых, што лес на працягу доўгіх стагоддзяў даваў людзям надзейную ахову, быў іх кармільцам. Таму праз чатыры гады падаўся леснікам у Вялікарэцкае лясніцтва Бягомальскага лясгаса. У 1959 годзе Бярэзінскі запаведнік быў адноўлены і Вялікарэцкае лясніцтва ўвайшло ў яго склад. Станіслава Блажэвіча прызначылі лесатэхнікам. Адначасова завочна вучыўся ў Полацкім лясным тэхнікуме. Сотні, а мо і тысячы кіламетраў прайшоў ён запаведнымі сцежкамі. Пасля заканчэння тэхнікума працаваў ляснічым Вялікарэцкага, Пастрэжскага, Цярэшкінскага лясніцтва.

Толькі ў 1976 годзе Блажэвіч разам з сям'ёй асталяваўся ў Домжарыцах. Узначаліў доследна-вытворчаю гаспадарку. Яна ўключала ў сябе былыя землі калгасаў, што ўвайшлі ў склад запаведніка. Акрамя гэтага, у падпарадкаванні былі дрэваапрацоўчы цэх, прарабскі ўчастак. Кіраваў сельгасработамі, рамонтам тэхнікі, будаўніцтвам пасёлка Домжарыцы, вырабам з дрэва тавараў народнага ўжытку.

Тагачасны першы сакратар Лепельскага райкама партыі Міхаіл Петрачэнка прапанаваў узначаліць на выбар саўгас «Сушанскі», калгас «Пражэктар», ці імя Жданава. Аднак на той час Станіслаў Іванавіч ужо хварэў, таму адмовіўся.

Па стану здароўя ён пераходзіць, здавалася б, на больш спакойную пасаду — узначальвае прафсаюзны камітэт. Але лягчэй не стала. Даводзілася вырашаць бытавыя праблемы работнікаў запаведніка. Менавіта працуючы старшынёй прафкама Блажэвіч цесна сышоўся з людзьмі. Не пакідалі яго абыякавымі іх лёсы, стараўся вырашаць усе іх праблемы. Людзі плацілі яму спагадай. Пра многіх, з кім працаваў, пра ўдзельнікаў вайны, пісаў артыкулы на старонках раённай газеты «Лепельскі край».

Асабліва ганарыўся тым, што яшчэ ў 1984 годзе пераадолеў мноства бюракратычных перашкод, каб змяніць надпіс на помніку загінуўшым землякам, устаноўленым у Кветчы. На мемарыяльнай пліце было пазначана, што тут загінулі жыхары вёскі Кветча. Станіслаў Іванавіч дакладна ведаў, што на тым месцы ў пуні немцы спалілі 66 жыхароў Пастрэжжа. Ездзіў у Мінск, даказваў памылковасць, дапушчаную ў надпісе на помніку. Прыводзіў канкрэтныя прозвішчы і ўзрост загінуўшых аднавяскоўцаў. Вялікімі намаганнямі, але свайго дамогся. Памылка была выпраўлена.

Грамадская праца забірала многа фізічных і маральных сіл. Больш часу даводзілася праводзіць на працы, а не дома з сям'ёй. Увогуле, матэрыяльны дабрабыт сям'і быў на другім месцы. Для людзей ён мог зрабіць многае, звярнуць горы.

Сілы не бязмежныя. Пачало падводзіць здароўе. Пакрысе арганізм здаваў. Доўгі час Станіслаў Іванавіч змагаўся з цяжкай хваробай. Здавалася, перамог сваю немач дзякуючы ўласным методыкам. Але вердыкт урачоў быў адназначны — другая група інваліднасці.

Крыху акрыяўшы, адчуваючы ў сабе сілы працаваць, Станіслаў Іванавіч просіцца на працу. Кіраўніцтва запаведніка

было не супраць. Але перашкаджала медыцынскае заключэнне. Каб быць бліжэй да лесу, давялося адмовіцца ад інваліднасці. Пачаў працаваць помочнікам ляснічага Домжарыцкага лясніцтва, адначасова займаўся грамадскай дзейнасцю. Узначаліў створанае пры школе лясніцтва, у арганізацыі якога браў непасрэдны ўдзел. Склаў метадычны дапаможнік. Праграму для навучання ў лясной школе распрацавалі спецыялісты Полацкага ляснога тэхнікума.

Да заняткаў у школьным лясніцтве рыхтаваўся па начах. Узначальваў яго і выкладаў на грамадскіх пачатках.

У 1993 годзе надышоў час выходзіць на пенсію. Кіраўніцтва запаведніка прапаноўвала застацца на працы. Але захапіўся грамадскай справай. Не мог уявіць свайго існавання без лясной школы, у якую ўклаў душу. Атрыманыя падчас працы веды імкнуўся перадаць дзецям. Для яго галоўным было навучыць не толькі лясной справе, але прывіць любоў да выбранай прафесіі, да лесу. Навучэнцы школы часта ездзілі ў рэйды па выяўленню фактаў браканьерства на возеры Бярэшча, рацэ Беразіна. Праводзілі лесаўпарадкаванне на пэўнай тэрыторыі, стварылі майстэрскі ўчастак. Дзеці пісалі навуковыя работы, праводзілі доследы. Многія былыя вучні лясной школы пайшлі шляхам свайго настаўніка, за што вельмі яму ўдзячныя.

У 1998 годзе Станіслаў Іванавіч пайшоў на заслужаны адпачынак. Стала больш вольнага часу, каб прысвяціць сябе сям'і. Але ўсё жыццё займаючы актыўную грамадскую пазіцыю, ён не мог доўгі час заставацца без справы. Заняўся краязнаўствам. Пачаў збіраць звесткі з гісторыі вёсак, аб вядомых земляках. Каб людзі памяталі пра мінулае сваіх паселішчаў, адкуль яны разляцеліся па свеце, вырашыў арганізоўваць святы ўжо неіснуючых запаведных вёсак. Ва ўсе куткі Беларусі і краіны былога Савецкага Саюза паляцелі пісьмы і тэлефонныя званкі з просьбай адгукнуцца і ўзяць удзел у сустрэчы жыхароў вёсак Цярэшкі, Пастрэжжа, Стайск, Вострава, Саўскі Бор, Сівы Камень, 1-я і 2-я Сцюдзёнка, Уцеха.

Так у 2007 годзе аднымі з першых на просьбу Станіслава Іванавіча адгукнуліся жыхары Цярэшак. Здалёк і зблізку з'ехаліся амаль усе былыя цярэшанцы. Станіслаў Іванавіч быў вельмі задаволены. Гэта надало сілы. Прайшлі святы вёсак у Стайску, Забаенні, Пастрэжжы.

У ходзе правядзення свят узнікла ідэя ўвекавечыць існаванне колішніх вёсак. Паставіць ім своеасаблівы помнік. Сваімі думкамі падзяліўся з блізкімі, сябрамі і знаёмымі, кіраўніцтвам Бярэзінскага запаведніка. Хто скептычна, хто з інтузіязмам успрынялі ідэю краязнаўцы.

Станіслаў Іванавіч не на жарт загарэўся новай ідэяй. На вялікім аркушы ватману намаляваў чарцёж будучага памятнага знака. Сіметрычны ромб павінен сімвалізаваць прыгажосць прыроды, знак аб вышэйшай адукацыі, да якой павінна імкнуцца маладое пакаленне. Меншы ромб усярэдзіне вялікага азначае знак лясной аховы. Куты азначаюць дні летняга і зімовага сонцастаяння, вясновага і восеньскага раўнадзенства. Унутры знаходзіцца высаджаны глогам кут, што сімвалізуе сонца, якое нараджае жывое — цяпло, святло, ваду, расліны, жывёлу. Такія ромбы Станіслаў Іванавіч марыў закласці ў кожнай апусцелай запаведнай вёсцы. А яшчэ ля кожнай ацалелай, ці знесенай хаты, дзе жылі жанчыны, якія нарадзілі па пяць і болей дзяцей, марыў закласці пяцікутнікі, што будуць сімвалізаваць шматдзетнасць. Некаторыя з намечаных планаў краязнаўцы пачалі пакрысе здзяйсняцца.

Пазнаёміліся мы з дзядзькам Стасем, так я часта называў новага знаёмага, у 2007 годзе. Ён звярнуўся з просьбай дапамагчы сабраць гістарычны матэрыял пра вёску Цярэшкі, свята якой мусіла неўзабаве адбыцца. Так мы пачалі сябраваць. Сутракаліся не часта — больш тэлефанаваліся, але гэта нам нікольկі не перашкаджала разумець адзін аднога.

Нас аб'ядналі агульныя інтарэсы. У асобе Станіслава Іванавіча знайшоў надзейнага памочніка, старэйшага таварыша ў краязнаўчых пошуках. З цягам часу зразумеў, што

мінавіта такога чалавека, які знітаваў бы мяне з мінулым, не хапала доўгі час. У любы момант я мог звярнуцца з канкрэтным пытаннем, ці просьбай да дзядзькі Стася, ведаючы, што абавязкова атрымаю адказ.

Паступова нашы сустрэчы і размовы па тэлефоне сталі больш частымі. Я разумеў: чым больш пачую ад гэтага чалавека, тым больш нязведаных старонак мінулага змагу адкрыць для сябе і грамадскасці, а потым перадаць атрыманыя веды наступным пакаленням даследчыкаў мінуўшчыны. Так, дзякуючы свайму старэйшаму сябру, многа цікавага даведаўся пра населеныя пункты запаведніка — вёскі, хутары, засценкі, што пэўны час існавалі на яго тэрыторыі. Разам заняліся вывучэннем партызанскага руху, знаёміліся з лёсамі ўдзельнікаў вайны. Некаторыя вынікі нашых краязнаўчых даследаванняў былі змешчаны ў газеце «Лепельскі край».

Пераадольваючы нясцерпны боль ад даймаючых яго хвароб дзядька Стась да апошняга працягваў даследаваць, цікавіцца гісторыяй свайго краю, лёсамі людзей, з якімі поруч пражыў доўгія гады. Нават прыкаваны да ложка ў апошнія дні свайго жыцця, дбаў пра здзяйсненне задуманага. Дбаў не пра сябе, не пра задавальненне сваіх амбіцый, якіх у яго проста не было, а пра тое, каб багатая гісторыя краю не была забытая нашчадкамі.

Прыгожым вераснёўскім днём гэтага году на васьмідзясятым годзе жыцця Станіслаў Іванавіч адышоў у лепшы свет. Пасля сябе ён пакінуў шырока адкрытымі дзверы ў мінулае, якое непарыўна звязана з сучаснасцю.

***кастрычнік 2012 г.***

## Чырвонасцяжны ордэнаносец

14 лютага 1919 года адбылася першая ўзброеная сутычка палякаў з часткамі Чырвонай Арміі. Пачалася вайна паміж савецкай Расіяй і Польшчай. Чырвоная Армія адыходзіла на ўсход. З верасня 1919 па ліпень 1920 года за-

ходняя частка тагачаснага Лепельскага павета была акупавана палякамі. Баявыя дзеянні насілі пазіцыйны характар. Час ад часу паміж варагуючымі бакамі адбываліся жорсткія сутычкі мясцовага маштабу.

У адным з такіх баёў, у ноч з 19 на 20 студзеня 1920 года, на поўнач ад Лепеля ля вёскі Заазер'е, вызначыўся стралок пятай роты 150 стралковага палка 17-й дывізіі ўраджэнец вёскі Велеўшчына Цімафей Грыдзюшка. Разам са Сцяпанам Чарновым і Аляксеем Данілавым, праслізнуўшы праз зону агню белапалякаў, якія стралялі з кулямётаў і аўтаматычнай зброі, перабраліся праз раку. Грыдзюшка першым уварваўся на пазіцыі варожай батарэі, закідаў яе ручнымі гранатамі. Са сваімі таварышамі захапіў польскую гармату. Польскія жаўнеры былі ўзяты ў палон адважнымі чырвонаармейцамі. Так скупыя радкі архіўнага дакумента падаюць учынак, здзейснены Цімафеем Грыдзюшкам і яго саслужыўцамі.

Напэўна, падзея мела вялікі розгалас у наваколлях Лепельшчыны. Пра гэта ўскосна сведчыць той факт, што зусім нядаўна ў Валовай Гары былі занатаваны ўспаміны пра геройскі ўчынак здзейснены Грыдзюшкам больш за дзевяноста гадоў назад. Дзесяцігоддзямі з вуснаў у вусны людзі пераказвалі падрабязнасці тых падзей. Цяпер ужо складана вылучыць праўду ад выдумкі. Але народная версія тога баявога эпізоду часоў савецка-польскай вайны мае права на жыццё. Таму мэтазгодна агучыць і яе. Прынамсі, яна дзесьці дапоўніць радкі архіўнага дакумента.

Распавядаў тое Мікалай Міхайлавіч Жарнасек. Па яго словах, фронт паміж варагуючымі бакамі праходзіў па рэчцы Оканіца, якая выцякае з возера Окана і падзяляе аднайменную вёску на дзве часткі. Па ўсёй верагоднасці, польскія жаўнеры і чырвонаармейцы не вельмі праглі крыві, таму па вечарах ладзілі сумесныя вечарыны. Аднаго разу оканскую дзеўку Фрузыну аддавалі замуж. Палякі выдзелілі фурманку. Ва ўдзячнасць за тое мясцовыя жыхары наладзілі танцы і

накрылі святочны стол, на які запрасілі і чырвонаармейцаў. Пасля сытнай вячэры захмялеўшыя жаўнеры і чырвонаармейцы вярталіся кожны на свае пазіцыі. Кемлівы Грыдзюшка ўцёрся ў давер да палякаў і рушыў да іхняй казармы. Як толькі п'яная кампанія пераступіла парог будыніны, спакойна дастаў з кішэняў прыпасеныя ручныя гранаты, і загадаў колішнім сябрам раззбройвацца. Сабраў у рэчмяшок затворы ад вінтовак, пастроіў палякаў у калону і павёў у бок сваіх пазіцый. Не менш за палоненых палякаў, здзіўленым было камандаванне «чырвоных», калі ўбачыла ў сваім распалажэнні з вінтоўкамі за плячыма польскае падраздзяленне.

За той геройскі ўчынак камандаванне 16-ай арміі прадставіла Грыдзюшку Цімафея Восіпавіча да ўзнагароджання. Загадам № 82 Рэўваенсавета СССР ад 12 чэрвеня 1923 года ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга РСФСР за № 8121. Для ўручэння ўзнагарода была пераслана ў Барысаўскі павятовы ваенкамат, дзе і знайшла свайго гаспадара.

Паскітаўшыся па свеце, у 1930-х гадах Цімафей вярнуўся ў родныя мясціны з Украіны. Пабудаваў у Гадзіўлі хату. Уладкаваўся на працу аб'ездчыкам. Абзавёўся сям'ёй. З жонкай Сцепанеяй Лаўрэнцьеўнай нажылі чацвёра дзяцей.

Ва ўсёй акрузе, мабыць, не было больш паважанага чалавека. Ардэнаносцаў у той час было не так многа. Яны карысталіся пэўнымі правамі і прывілеямі. Не грэбаваў ільготамі і Цімафей. З гонарам насіў на лацкане пінжака ордэн.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Грыдзюшка падаўся ў партызаны. Але ў Нацыянальным архіве дакументаў, якія б падцвярджалі гэты факт, выяўлена не было. Па адной з версій, ён быў залічаны ў склад атрада «Баці», які дзейнічаў на Лепельшчыне з верасня 1941 года. Дакументы гэтага атрада захоўваюцца ў расійскіх архівах, і пакуль не даступны для даследавання. Тады становіцца зразумелым, чаму няма звестак пра Грыдзюшку ў нашым Нацыянальным архіве.

Як склаўся далейшы лёс Цімафея Грыдзюшкі, не зусім зразумела. Нібыта ён адначасова служыў і немцам і партызанам.

Ужо пасля вайны людзі ставілі пад сумненне той факт, што менавіта Цімафея Грыдзюшку ў свой час узнагародзілі ордэнам. Неяк не спалучаліся паводзіны гэтага чалавека з паводзінамі сапраўднага народнага героя. Таму і гаварылі, што ордэн Грыдзюшка атрымаў памылкова, замест нейкага аднафамільца са Свядзіцы. Але ж дакументы, што захоўваюцца ў Расійскім дзяржаўным ваенным архіве, ушчэнт разбіваюць людскія здагадкі. З архіўнай даведкі вынікае, што менавіта Грыдзюшка Цімафей Восіпавіч, 1893 года нараджэння, ураджэнец Велеўшчыны, быў удастоены высокай узнагароды. Гэта бясспрэчны факт.

З першых дзён вайны Грыдзюшка перайшоў на нелегальнае становішча. Пачаў дзейнічаць жорстка і напорыста ў адносінах да людзей. Даводзілася выжываць у складаных умовах акупацыі, калі паўсюль маглі быць варожыя шпіёны. Яму, як нікому, з боку немцаў пагражала вялікая небяспека. Вось і не стасаваліся ў свядомасці людзей такія паводзіны Грыдзюшкі, з паводзінамі чалавека, адданага савецкай уладзе. Але не будзем забываць, што ўсе мы людзі з пэўнымі слабасцямі і недахопамі. Ні што чалавечае не абыякава і тым, каго ўзвялі ў ранг нацыянальнага героя, зрабілі эталонам паводзінаў.

Ярлык нямецкага здрадніка, які быў навешаны на Цімафея Грыдзюшку, не стасуецца з фактамі. Калі гэта так, чаму тады ён быў арыштаваны немцамі? Абставіны яго арышту так і засталіся нявысветленымі. Жыццёвы шлях Грыдзюшкі абрываецца ў Лепельскай турме. Ягоная смерць парадзіла яшчэ больш плётак і здагадак у асяродку людзей знаёмых з гэтым чалавекам...

***кастрычнік 2012 г.***

# Бацькава навука


Аляксандр Логавін

Адным са старэйшых работнікаў не толькі Слабадскога лясніцтва, але і Лепельскага лягаса з'яўляецца Аляксандр Логавін. Трыццаць год ён аддана служыць у дзяржаўнай лясной ахове. А тады, у далёкім ужо 1982 годзе, нават не думаў, што лес стане яго прызваннем. Марыў пасля службы ў войску вывучыцца на шафёра, але набор у аўташколу быў завершаны. Аляксандр уладкаваўся на працу ў Слабадское лясніцтва. Думаў, што часова: дачакаецца наступнага набору ў аўташколу і звольніцца. Ды няма нічога больш пастаяннага, чым часовае.

У пачатку 1990-х гадоў з сям'ёй асталяваўся ў Велеўшчыне, уласнымі рукамі пабудаваў дыхтоўны дом. Жонка Таісія ўсё клікала жыць у горад. Але, не гарадскі Аляксандр чалавек. Нарадзіўся ў чашніцкай Адамаўцы, якую з усіх бакоў акаляюць вялікія лясныя гушчары. Змалку бацька прывучыў Сашку і яшчэ двух яго братоў да цягавітай сялянскай працы. З цягам часу самому карцела абзавесціся гаспадаркай. Таму па цяперашнім часе гаспадарка Логавінаў у вёсцы адна з самых вялікіх. Большасць аднавяскоўцаў адмовілася ад кароў, а Логавіны трымаюць. У хлеўчуку яшчэ свінні рохкаюць, а на двары куры кохкаюць. У прывесак да гэтага маюць добры надзел зямлі. На якім дапамагаюць упраўляцца бацькам, стаўшыя ўжо дарослымі сыны, Максім і Арцём.

У вольны ад працы час Аляксандр зноў спяшаецца ў лес. На працягу многіх гадоў не змяняе свайму захапленню. Яшчэ ў дзяцінстве была ў хлопца запаветная мара стаць паляўнічым. Не заўсёды вяртаецца з палявання з трафеямі. Аднак не здабыча галоўнае. Як і для кожнага чалавека, апантанага якімсьці захапленнем, яму цікавы сам працэс, калі можна сам-насам пабыць з прыродай, адчуць прыліў адрэналіну ў крыві, напаўшы на след звера, і, вядома, радасць ад упаляванай здабычы.

На працы Аляксандр з адказнасцю падыходзіць да даручанай яму справы. У свой час гэтаму вучыў яго бацька — ва ўсім і заўсёды быць патрабавальным да сябе, і да таго, што трэба зрабіць. За гэтыя якасці яго і цэніць кіраўніцтва лясніцтва, давяраючы выконваць самыя адказныя работы.

Прафесія лесавода адна з самых цяжкіх. Многія не вытрымліваюць напружанай фізічнай працы — звальняюцца. З пытаннем, ці не было жадання кінуць лес, з'ехаць у горад, знайсці лягчэйшую працу, звярнуўся да Аляксандра. Не задумваючыся ён адказаў, што за ўвесь час, што працуе ў лесе ніводнага разу такога жадання не ўзнікала. Пры гэтым прызнаецца, што працаваць, калі гэта робіш па сапраўднаму, ніколі не было лёгка. Няважна якую працу выконваеш — садзіш лес, выразаеш дзялянку, ці робіш адводы.

У апошнія гады ён адзначае, што дзякуючы тэхніцы, якая паступае ў лясніцтвы, значна аблягчаецца праца лесарубаў і ляснікоў. Успамінае, як першыя гады даводзілася выразаць вялікія аб'ёмы прадукцыі «Дружбамі» і «Ураламі». Адзінае па чым мае настальгію — старая ляснікоўская форма. Яна хоць і саступае па якасцям сучаснай, але больш па-душы. З гонарам успамінае старую фуражку, у якой нават перад дзеўкамі не грэх было пафарсіць.

Самаадданая праца вопытнага лесавода не застаецца незаўважанай. Неаднаразова Аляксандр Цімафеевіч узнагароджваўся ганаровымі граматамі Лепельскага райвыканкама, Віцебскага аблвыканкама. У 1995 годзе за высокія

паказчыкі ў выкананні вытворчых планаў адзначаны ганаровай граматай Міністэрства лясной гаспадаркі. У 2005 годзе занесены на раённую Дошку гонару.

У верасні бягучага года загадам Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр Логавін быў узнагароджаны нагрудным знакам адзнакі «30 год бездакорнай службы ў дзяржаўнай лясной ахове Рэспублікі Беларусь».

Аляксандр задаволены, што закладзеная калісьці бацькам дынастыя лесаводаў, на ім не перарвецца. Прадаўжальнікам дзедавай і бацькавай прафесіі стаў малодшы сын Арцём. Хлопец пасля заканчэння Полацкага лясного каледжа працуе памочніка ляснічага на Лёзненшчыне.

*лістапад 2012 г.*

# Працоўная ніва Віктара Багдановіча

За плячыма Віктара Багдановіча з Велеўшчыны трыццаць дзевяць гадоў працоўнага стажу. Гэта толькі тых, што зафіксаваны ў адпаведных дакументах, і за якія атрымлівае пенсію. Колькі сябе памятае, усё жыццё працуе, з самага малалецтва. Спачатку дапамагаў па гаспадарцы бацькам, а калі набраўся жыццёвай моцы, стаў наймацца на працу да больш заможных гаспадароў. Некалькі сезонаў запар пасвіў скаціну на хутары Мар'янова, недалёка ад Валовай Гары. За тое гаспадар, ляснік Іван Гардзіёнак, расплачваўся зернем і бульбай. Гэта было добрай дапамогай для вялікай сям'і Багдановічаў. Бацькі — Захар і Таццяна, гадавалі адзінаццаць дзяцей. Старэйшыя ўжо пайшлі на свой хлеб. А малодшыя, у тым ліку Віктар, які быў восьмым дзяцём у сям'і, павінны былі клапаціцца нароўні з дарослымі пра хлеб надзённы.

У школу Віктар пайшоў у шэсць гадоў, акурат увосень сорак чацвёртага. Але пра вучобу ўспамінаў толькі бліжэй да



*Віктар Багдановіч*

зімы. Больш даймалі гаспадарчыя клопаты. Сяк-так адолеў пяць класаў. Больш вучыцца не стаў, тое было вялікай раскошай для хлопца. Карцела хутчэй узбіцца на свой хлеб, каб не адчуваць больш нястачы, паўгалоднага існавання першых пасляваенных гадоў. З такімі думкамі ўладкаваўся ў мясцовы калгас прыцэпшчыкам. Мажа б і надалей, не маючы за плячыма ніякай спецыяльнасці, працаваў «куды пашлюць». Але як кажуць не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. У час сельгасработ Віктар атрымаў цяжкую траўму. Пяць месяцаў з паламанай нагой праваляўся па бальніцах. Пасля чаго, мабыць, адчуваючы за сабой віну за калецтва работніка, калгаснае кіраўніцтва накіравала вучыцца на трактарыста.

Трапіў у «цалінную» групу. Так называлі тых, каго пасля вучобы адпраўлялі механізатарамі на Цаліну. Вытворчую практыку «цаліннікі» праходзілі там, дзе ў будучым належала працаваць — на Цаліне. На працягу чатырох месяцаў Віктар удасканальваў тэарэтычныя веды ў якасці камбайнера.

Прайшоўшы курс навучання «цаліннікі» не атрымалі на рукі доўгачаканыя «корачкі» механізатараў. Яны былі вымушаны пэўны час адпрацаваць на цалінных землях Казахстана. Віктар Захаравіч успамінае, што ўмовы для пражывання былі невынос-

ныя нават для яго, вясковага хлопца. Узімку кватаравалі па хатах. Астатні перыяд жылі ў вагончыках. У якіх пад раніцу спаць было вельмі холадна. З-за недахопу дроў вагончыкі атапліваліся вугалем. Пасля чаго закладваць юшку ў печках-буржуйках было вельмі небяспечна — можна было ўчадзець. Таму хаваліся з галавой ад холаду пад коўдрай.

Цэлы год доўжылася «цалінная» эпапея Віктара Багдановіча. Ужо ўцягнуўся ў працу, звыкся з бытавымі нязручнасцямі. А вось арганізм так і не здолеў выпрацаваць імунітэт да сухога стэпавага клімату. Скулы запаланілі ўсё цела. Дзякуючы хваробе, хлопец здолеў вярнуцца на радзіму. 1962 год, калі гэта адбылося, запомніў на ўсё жыццё.

Родная Велеўшчына — адзінае месца, куды марыў вярнуцца, будучы за тысячы кіламетраў ад дому. У калгасе «Радзіма» прыязна сустрэлі маладога механізатара. Пасадзілі на гусянічны трактар. А праз тры месяцы далі новы

МТЗ-2. З тога часу больш за трыццаць год айчынны трактар «Беларус» стаў нязменным спадарожнікам Віктара Захаравіча. Не адзін з'ездзіў па калгасных палях з плугамі, баронамі, ды сеялкамі. У час жніва перасаджваўся на камбайн. І так да самай пенсіі. Сярод механізатараў у калгасе Багдановічу не было роўных. Нават у сталым узросце ён працягваў трымаць планку лідэра. Не кожны малады трактарыст мог вытрымаць такога напружанага тэмпу работы. Былі выпадкі, калі даводзілася працаваць на ворыве ўначы. Вынікі такой плённай працы не вымушалі сябе чакаць — першыя месцы ў сацыялістычных спаборніцтвах, заахвочванне ганаровымі граматамі і грашовымі прэміямі. У 1971 годзе перадавога механізатара ўзнагародзілі ордэнам «Знак Пашаны».

За свой працоўны стаж Віктар Захаравіч ніводнага разу нават у водпуску па-людску нябыў. Увесь час адклікалі на тэрміновыя сельгасработы. Дзіву даешся, калі ён толькі паспеў збудаваць хату, разам з жонкай Надзеяй выгадаваць траіх дзяцей, а яшчэ трымаць вялікую гаспадарку.

Апошнія некалькі год да пенсіі заслужанаму механізатару прадаставілі больш спакойную працу — на трактары абслугоўваць ферму. На ферме не трэба было, як у маладыя гады, у спёку і ў холад, трасціся не вылазячы з трактара з ранку да вечара. За дзесяцігоддзі бездакорнай і самаадданай працы ў сельскай гаспадарцы Віктар Захаравіч спаўна ўзараў сваю працоўную ніву.

***лістапад 2012 г.***

# Пасляслоўе

Цікавы і захапляльны працэс адкрыцця таямніц мясцовай гісторыі працягваецца надалей. Цягам часу адкрываюцца новыя факты мінуўшчыны. Але ўжо і сёння можна з вялікай упэўненасцю казаць пра тое, што наш рэгіён мае даволі багатую спадчыну, якая сваімі каранямі сягае ў сівую даўніну.

Жыццё бяжыць няўмольна. Адыходзяць у лепшы свет старажылы. Разам з імі сыходзіць у нябыт гісторыя іх малой радзімы.

Таму сёння так важна дайсці з роспытамі да сучаснікаў, што сваімі ўчынкамі робяць будучыню, бо ўжо заўтра гэта будзе гісторыяй...

# Змест

**Ад аўтара** ........ **3**

**Вандроўкі па родным краі** ........ **4**

Сцежкамі прашчураў ........ 4

Вандроўка ўздоўж возера Окана ........ 5

Складаем тапанімічны слоўнік краю ........ 8

Пра танк і іншыя знаходкі ........ 10

І Рабінавы камень за вёскай… ........ 11

Авеяны легендамі край ........ 14

У небе і на зямлі ........ 16

Невядомыя пахаванні ........ 18

Гарадзішча і Цар-дуб ........ 19

Аднавілі помнік гісторыі ........ 21

Свядзіцкія курганы ........ 22

Лыжны паход да партызанскай сасны ........ 24

**Дотык да сівой даўніны** ........ **25**

Знаходкі на валосавіцкай зямлі ........ 25

Даследаванне курганоў ........ 27

Няспраўджаныя надзеі археолагаў ........ 28

Разгадка Крукавай гары ........ 29

Каменныя помнікі ........ 31

«Французскія» і «рускія» магілы каля Замошша ........ 33

Старажытнае гарадзішча ........ 36

Курганы ля Велеўшчыны ........ 37

На берагах старажытнага возера ........ 39

Помнікі археалогіі каля Верабак ........ 41

Дотык да сівой даўніны ..... 44
Аднавілі старыя крыжы ..... 46
Вывучэнне Лепельшчыны ў 1930-я гады ..... 48
**Ад вёскі да вёскі ..... 51**
Сумнае вяселле ..... 51
Дзе пяюць салаўі, у кустоўях лазы ..... 53
Дзед Аляксей і яго вёска ..... 56
Была. Ёсць. Будзе… ..... 58
Аношкаўскае ці Оч? ..... 62
Паданне пра Гогалі ..... 63
Велеўшчына ..... 64
Пра Людчыцы і знікшую царкву ..... 66
Барсукі ..... 67
Пастрэжжа ..... 74
Вострава ..... 76
Пунты ..... 77
Ад Слабады да Аношак ..... 80
Зацякляссе ..... 83
**На жыццёвых перакрыжаваннях ..... 87**
Дваццаць вёснаў жыцця ..... 87
Песенніца ..... 89
Ліквідатар ..... 91
Пагранічнік-інтэрнацыяналіст ..... 92
БТР успыхнуў, нібы факел ..... 94
Адданасць прафесіі ..... 97
У шэрагу першых ..... 98

У гарачым небе
Афганістана і Чарнобыля ........ 99
...Не поле перайсці ........ 103
Шлях да Зоркі Героя ........ 105
Станіслаў Блажэвіч ........ 107
Чырвонасцяжны ордэнаносец ........ 112
Бацькава навука ........ 116
Працоўная ніва Віктара Багдановіча ........ 118
**Пасляслоўе ........ 122**

*Для нататкаў*

Літараурна-мастацкае выданне

**ТУХТА Валерый Уладзіміравіч**

**НАТАТКІ З КРАЯЗНАЎЧАГА СШЫТКА**

Аўтар вершаў *Таццяна Тухта*
Малюнак на вокладцы *Веранікі Маляўка*
Камп'ютарны дызайн, вёрстка *Кеўра Юлія*

Падпісана да друку 26.03.2013
Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. аркушаў 4,9. Ул.-выд. аркушаў 7,5.
Наклад 150 ас. Замова 2316.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
ЛВ № 02330/413 от 09.07.2009.
ЛП № 02330/0552782 от 01.10.2010.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, Мінск.ЛП № 02330/0552782 от 01.10.2010.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, Мінск.



Тухта Валерый Уладзіміравіч нарадзіўся ў г. Лепель (1976), краязнаўца.
Скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова (2003).
Настаўнік гісторыі і геаграфіі Велеўшчынскай базавай школы Лепельскага раёна (1996–2007), настаўнік гісторыі Слабадской сярэдняй школы Лепельскага раёна ( з 2007).
Кіраўнік краязнаўчага гуртка «Нашчадкі».
Даследуе помнікі археалогіі, падзеі Першай і Другой сусветных войнаў на тэрыторыі Лепельскага раёна.
Займаецца зборам легенд і паданняў роднага краю.
Правёў разведкі больш за 20 археалагічных помнікаў на тэрыторыі раёна, 8 з іх упершыню ўведзены ў навуковы зварот.
Мае больш за 100 артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў раённай газеце «Лепельскі край», абласных і рэспубліканскіх выданнях.
Пераможца рэспубліканскага конкурсу «Беларускі настаўнік года — 2008».

ISBN 978-985-6982-73-9

9 789856 982739